Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 123 (28233) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Пра сапраўднага тату



Валун для заключэння шлюбаў



Экіпаж легендарнага танка

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей ГАЙКО, начальнік галоўнага ўпраўлення наяўнага грашовага абарачэння Нацбанка:**

*«Да правядзення дэнамінацыі былі вывучаны патрэбы рэгіёнаў у грашовых сродках. У ліпені мы цалкам будзем задавальняць нашы рэгіёны — дастаўляць туды і банкноты, і манеты. Па паведамленнях нашых банкаў, будуць адкрыты асобныя касы для размену грошай ўзору 2000 года на грошы ўзору 2009 года. Акрамя таго, у большасці выпадкаў гэтыя аперацыі будуць ажыццяўляцца ва ўсіх касах камерцыйных банкаў. Камісія пры гэтым не прадугледжваецца, Нацбанк рэкамендаваў працаваць без збірання платы. Гэтыя аперацыі Нацбанк будзе ажыццяўляць і ў сваіх касах».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.06.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 20053,00 ▲ |
| Еўра | 22210,00 ▲ |
| Рас. руб. | 312,12 ▲ |
| Укр. грыўня | 806,47 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

16123>

# З ПЕРШЫМ МЁДАМ!



**Вясна са сваімі незвычайнымі выбрыкамі надвор'я крыху парушыла планы пчаляроў, і першы мёд пайшоў сёлета трохі «не па графіку». Але ад гэтага не стаў менш залацістым, смачным і духмяным.**
***На фота:*** **пчаляр з Гомельшчыны Мікалай БЯЛЬКОВІЧ дастае першыя ў гэтым годзе соты.**

Фота БЕЛТА.

## Начны рэпартаж

# ПАМЫЦЬ І АСТУДЗІЦЬ... ВУЛІЦУ,

### ці Каго не палохае спёка

**Зноў прыходзіць сапраўднае лета: з яркім сонцам, смагай і спякотай. Ад апошняй церпяць не толькі людзі — на праезнай частцы дарогі высокая тэмпература адбіваецца даволі небяспечна. Пра тое, як сталічныя камунальнікі ратуюць транспартныя магістралі ў спёку і не толькі, карэспандэнт «Звязды» даведаўся падчас працы ў начную змену разам з супрацоўнікамі ДВА «Гаррэмаўтадар Мінгарвыканкама».**

Наша місія па паліве сталічных дарог пачынаецца на вадапомпавай станцыі «Весялоўка», што знаходзіцца побач з Камсамольскім возерам (падобная яшчэ ёсць на Чыжоўскім вадасховішчы). А трэцяй гадзіне ночы тут віруе жыццё — з дзясятак ЗІЛаў і МАЗаў выстройваецца ў чаргу для «запраўкі». Размова, вядома, не пра паліва — у цыстэрны пры дапамозе спецыяльных установак заліваюць ачышчаную ваду. Вадкасць звычайная, без аніякіх дабавак, хоць, праўда, і не пітная. Знаёмімся з **вадзіцелем Анатолем АНТАНЕВІЧАМ.**

— Працую тут не так даўно, усяго два гады, — дзеліцца мужчына. — Праўда, і раней усё жыццё было звязана з аўтамабілямі — дваццаць гадоў адпрацаваў дальнабойшчыкам. Аб'ездзіў увесь свет, але ўжо не тыя гады, таму выбраў работу паспакайней.

Наша сённяшняя задача — мыццё дарожнага палатна адразу на некалькіх участках. Гэта самы распаўсюджаны від працы — працэдуру выконваюць штодзень, у адрозненне ад згаданага паліву ў спёку. Астуджваць асфальт пачынаюць, толькі калі тэмпература паветра працяглы час трымаецца на ўзроўні 25 градусаў і вышэй, і гэта аперацыя кардынальна адрозніваецца ад звычайнага мыцця.

СТАР. 4

## Я зноў выбіраю «Звязду»

# «НАМ НЕ ЎСЁ РОЎНА, ЯК ЖЫВУЦЬ ІНШЫЯ ЛЮДЗІ»

**Дырэктар Краснапольскага раённага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі Надзея ПІВАНАВА:**



— «Звязда» вельмі насычаная па сваім змесце. Цікава чытаць пра ўсё, асабліва пра сферу адукацыі, пра тое, якую мы выконваем ролю ў грамадскім жыцці краіны. Ну і пра саміх сябе таксама. Для нас вельмі ганарова было трапіць на старонкі такой паважанай ў краіне газеты. Спадзяёмся, што наша ўстанова яшчэ не раз будзе ў цэнтры ўвагі гэтага выдання.

Цікаўлюся тым, як працуюць нашы дэпутаты, мясцовае самакіраванне. Хацелася б больш бачыць матэрыялаў пра жыццё ў іншых невялічкіх гарадах, такіх, як наш. Ведаю, што шмат хто з маіх калег чытае «Звязду». Бо нам не ўсё роўна, як жывуць іншыя людзі, як развіваецца краіна, што новага ў ёй адбываецца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Парламенцкі дзённік

# СТРАТЭГІЯ КАРПАРАТЫЎНАГА КІРАВАННЯ

**Аб павелічэнні ролі наглядальных саветаў у карпаратыўным кіраванні на прамысловых прадпрыемствах вялася гаворка на пасяджэнні секцыі №2 навукова-кансультатыўнага савета па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі.**

Паводле слоў **старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Савета Рэспублікі Уладзіміра ПАНЦЮХОВА**, цяпер у краіне назіраецца паступовае збліжэнне нацыянальнага прававога поля з агульнапрызнанымі стандартамі карпаратыўнага кіравання. Таму сёння надышоў час выпрацаваць рэкамендацыі па ўдасканаленні такога кіравання. У тым ліку ў частцы работы наглядальных саветаў. А практыка паказвае, што яны блізка знаёмыя з сітуацыяй на прадпрыемстве і могуць даваць слушныя парады з нагоды падбору кадраў, мадэрнізацыі вытворчасці і іншых стратэгічных пытанняў. «Назіральныя саветы — гэта погляд знутры», — адзначыў сенатар.

**Першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Аляксей ВАСІЛЬЕЎ** лічыць, што назіральны савет павінен стаць сапраўды ключавым органам у сістэме кіравання акцыянерным таварыствам, удзельнічаць у прыняцці сапраўды сур'ёзных перспектыўных рашэнняў, а не займацца бягучымі праблемамі прадпрыемства. Вопыт карпаратыўнага кіравання ў кампаніях Расіі, Швецыі, Германіі і іншых краінах паказвае, што менавіта назіральныя саветы адыгрываюць важную ролю ў распрацоўцы стратэгіі сваіх прадпрыемстваў. Выкарыстанне ў складзе назіральных саветаў сапраўдных прафесійных кіраўнікоў павінна дапамагчы айчыннаму прамысловаму сектару выйсці на міжнародныя фондавыя рынкі.

Пасля ўсебаковага абмеркавання ўдзельнікамі пасяджэння секцыі было прынята рашэнне рэкамендаваць дзяржорганам больш актыўна выкарыстоўваць дзейны карпаратыўны інструментарый, укараняць сусветныя практыкі гэтага кіравання праз прыняцце карпаратыўных кодэксаў і стварэнне камітэтаў пры наглядальных саветах на аснове парад Дзяржкаммаёмасці і Мінэканомікі. Таксама спецыялісты раяць прымаць дадатковыя меры па паляпшэнні якаснага складу наглядальных саветаў, у тым ліку шляхам прыцягнення прафесіянальных кіраўнікоў.

Удасканаленне карпаратыўнага кіравання з'яўляецца адным са шляхоў для дасягнення мэтаў, пастаўленых на пятым Усебеларускім народным сходзе. Гэта павінна паспрыяць паляпшэнню эканамічнага становішча прадпрыемстваў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

### КАНСТРУКТЫЎНЫ ДЫЯЛОГ

**У гэтую суботу ўлады традыцыйна выйдуць на сувязь з жыхарамі краіны.**

На працягу трох гадзін ахвотныя могуць задаваць пытанні, агучваць свае скаргі ці прапановы кіраўнікам рэгіёнаў. За гэты кароткі час, парой, атрымліваецца вырашыць каля паўсотні праблем.

**Чарговая сувязь адбудзецца ў суботу, 2 ліпеня, з 9.00 да 12.00. На тэлефонныя званкі будуць адказваць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
ЦУПРЫК Леанід Аляксандравіч — намеснік старшыні (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
БЕЛАВУС Уладзімір Мікалаевіч — намеснік старшыні (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
ПІРШТУК Баляслаў Казіміравіч — намеснік старшыні (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
ЛІСКОВІЧ Віктар Андрэевіч — намеснік старшыні (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
ЧЫКІДА Алег Іванавіч — першы намеснік старшыні (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
ПЛАЎСКІ Алег Альфрэдавіч — намеснік старшыні (5004160);

**Мінскі гарвыканкам**
ДАМАРАЦКІ Андрэй Уладзіміравіч — намеснік старшыні (2224444).

■ Выбары-2016

# АРГАНІЗАЦЫЯ ВЫБАРАЎ ТРЫМАЕЦЦА НА ЖАНЧЫНАХ

**Пра гэта падчас прэс-канферэнцыі, на якой былі падведзены вынікі першага этапу выбарчай кампаніі ў парламент, заявіла старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА.**

«Выбары наогул на жаночых плячах у асноўным трымаюцца. Вось убачыце, ва ўчастковых камісіях будзе 75% жанчын, не менш», — лічыць кіраўнік ЦВК.

Лідзія Ярмошына падкрэсліла, што яна член толькі аднаго грамадскага аб'яднання — Беларускага саюза жанчын, які ў ходзе першага этапу кампаніі актыўна вылучаў прадстаўнікоў у акруговыя і тэрытарыяльныя выбаркамы. У акруговыя камісіі БСЖ вылучыў 117 чалавек, 95 з якіх увайшлі ў склад выбаркамаў гэтага ўзроўню. Прытым большасць (57,3%) членаў акруговых выбаркамаў менавіта жанчыны.

На думку старшыні камісіі, сёння пытанне гендарнага складніка — практычнае, якім цікавіцца кожная міжнародная дэлегацыя, што прыязджае ў нашу краіну. Часцей за ўсё запытваюць пра тое, ці плануецца павялічваць колькасць жанчын у парламенце. Але паўплываць на гэты працэс наўпрост нельга, лічыць яна. Так, у Беларусі створаны роўныя ўмовы для вылучэння ў кандыдаты ў дэпутаты для мужчын і жанчын. «Калі б у краіне была сістэма вылучэння па партыйных спісах, то можна было б абавязаць партыі выстаўляць пэўны працэнт мужчын і жанчын. Але мы ж не можам прымусіць выбаршчыка галасаваць за жанчыну, калі ён аддае перавагу прадстаўніку дужага полу», — дадала кіраўнік ЦВК.

Што тычыцца вынікаў першага этапу выбарчай кампаніі, то падчас яго грамадскія аб'яднанні і палітычныя партыі таксама вылучалі членаў у склад тэрытарыяльных і акруговых камісій. Па словах Лідзіі Ярмошынай, не ўсе дакументы былі пададзены партыямі правільна і своечасова, але гэта адбылося не па віне ЦВК, таму абвінавачванні ў бок камісіі з гэтай нагоды будуць лічыцца неабгрунтаванымі. Усяго ў Цэнтральную камісію з моманту абвяшчэння выбараў (з 6 па 28 чэрвеня) паступіла 16 зваротаў, з іх 11 «не маюць ніякага дачынення да выбараў». Толькі 5 зваротаў тычыліся выбарчай кампаніі, тры — тлумачэння заканадаўства, два — дзейнасці і ўтварэння выбаркамаў. Было і 4 вусныя звароты — кансультацыі з нагоды вылучэння кандыдатаў у дэпутаты.

Так, доля прадстаўнікоў у акруговых і абласных выбаркамах ад палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў склала больш за 50%, у тым ліку ад партый — 17,5%. Найбольш актыўнымі — па 7 прэтэндэнтаў ад кожнай — былі Камуністычная партыя Беларусі (якая праявіла найбольшую актыўнасць у вылучэнні членаў у акруговыя камісіі), Беларуская партыя левых «Справядлівы свет» і Ліберальна-дэмакратычная партыя. Усяго сярод 1430 членаў акруговых выбаркамаў 17% — дзяржслужачыя, каля 5% — грамадзяне ва ўзросце да 30 гадоў. Ад партый і грамадскіх аб'яднанняў вылучаны 970 чалавек, з якіх прадстаўнікоў партый — 195 (з іх 77 ад КПБ, 42 — ад Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці, ад ЛДП і Беларускага народнага фронту — 5 прадстаўнікоў).

Падчас сёлетняй парламенцкай кампаніі ўпершыню ствараюцца тэрытарыяльныя выбаркамы на ўзроўні кожнай вобласці і Мінска, якія будуць вырашаць тыя спрэчкі, якія раней разглядаў ЦВК. У іх на 91 месца былі вылучаны 144 чалавекі. Найбольшы конкурс адбыўся ў Магілёўскай вобласці — 26 прэтэндэнтаў, менш за ўсё вылучана ў Гродзенскай вобласці — 16 чалавек.

Што тычыцца акруговых камісій, то максімальная колькасць членаў для ўсіх 110 — 1430 чалавек. У кожнай камісіі павінна быць па 13 чалавек. «Усяго было прадстаўлены 2194 камплекты дакументаў. Самы высокі конкурс быў у Гродзенскай і Брэсцкай абласцях. У Гродзенскай вобласці на 13 камісій 356 прэтэндэнтаў, у Брэсцкай — 325 кандыдатаў на 16 акруговых выбаркамаў. У Мінску на 20 камісій былі вылучаны 342 чалавекі», — адзначыла Лідзія Ярмошына.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

■

# НЕ ЛОЗУНГІ, А КАНКРЭТНЫЯ СПРАВЫ



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

**Задачы, пастаўленыя V Усебеларускім народным сходам (у эканоміцы гэта найперш тычыцца інвестыцый, стварэння новых рабочых месцаў, павелічэння экспарту) павінны выконвацца на ўзроўні не прыгожых слоў, лозунгаў, а канкрэтных праектаў. І няхай не ўсё атрымліваецца, але крок за крокам мы будзем рухацца наперад. Такую ўпэўненасць выказаў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ.**

У папярэдняй пяцігодцы было рэалізавана шмат праграм, дзе галоўным інвестарам з'яўлялася дзяржава. Аднак цяпер рэаліі іншыя і ўпор павінен рабіцца на прыватныя інвестыцыі, замежны капітал. У гэтым кірунку на Гродзеншчыне сёння ў стадыі падрыхтоўкі і выканання каля дзясятка буйных праектаў. У якасці прыкладу Уладзімір Краўцоў прывёў аўтамагістраль М-6, якая звязвае Гродна са сталіцай. Паводле апошняй інфармацыі, з Сусветным банкам — асноўным крэдытарам — узгоднены пытанні па выбары генеральнага падрадчыка і фактычна ўжо даецца старт будаўніцтву трасы, якая будзе адпавядаць самым сучасным патрабаванням. Гэтыя інвестыцыі (разам з кітайскім крэдытам — каля 0,5 мільярда долараў) трэба асвоіць прыкладна за два гады.

— Гэта і занятасць для вялікага сектара эканомікі, і развіццё транзітных магчымасцяў вобласці, лагістыка, экспарт паслуг, — зазначыў Уладзімір Краўцоў.

Яшчэ адзін цікавы, прарыўны праект ажыццяўляецца ў Гродне ў партнёрстве з айчынным інвестарам — Паркам высокіх тэхналогій. У ліпені завяршаюцца будаўнічыя работы і ў філіяле парка распачнецца ўстаноўка спецыяльнага абсталявання.

— Вось поле дзейнасці для таленавітай моладзі, дзе можна задзейнічаць свае веды, ідэі, стварыць прадукты, якія запатрабаваны і ў нас, і на знешніх рынках. Мяркую, што ўжо праз год будуць пазітыўныя вынікі, — лічыць старшыня аблвыканкама.

Яшчэ адна важная інвестыцыйная крыніца — удзел у праектах трансгранічнага супрацоўніцтва разам з нашымі польскімі і літоўскімі суседзямі. Неўзабаве стартуюць новыя праграмы, і да маючых адбыцца конкурсаў на атрыманне фінансавых грантаў у вобласці ўжо падрыхтавалі каля ста праектаў.

На думку Уладзіміра Краўцова, трэба актыўна задзейнічаць свае транзітныя магчымасці, турыстычны патэнцыял. Гэта тычыцца, у прыватнасці, беларуска-польскай прыроднай жамчужыны — Аўгустоўскага канала. Старшыня аблвыканкама паведаміў, што ўжо ў фінальнай стадыі работа па афармленні міжнародных працэдур, каб пагранічным пунктам пропуску «Рудаўка — Лясная» на канале маглі скарыстацца не толькі турысты-воднікі, але і пешаходы, веласіпедысты.

— Наступны крок — зрабіць гэты пункт пропуску бязвізавым. Відавочна, што турыстычныя патокі значна павялічацца. Тым больш што літаральна побач праходзяць два буйныя трансгранічныя веламаршруты. Шмат людзей па іх ездзіць, аднак пакуль міма нас. І мы павінны зрабіць так, каб яны ехалі праз нашу краіну і з задавальненнем трацілі свае грошы, карыстаючыся нашымі паслугамі, — лічыць Уладзімір Краўцоў.

У рэчышча не проста «дзяжурнага» пагаднення на паперы, а канкрэтных спраў паступова пераходзіць і супрацоўніцтва Гродзеншчыны з кітайскай правінцыяй Ганьсу. Кітайцы, напрыклад, купілі гасцініцу «Гродна». Акрамя таго, неўзабаве ў абласным цэнтры адкрыецца цэнтр традыцыйнай кітайскай медыцыны. А кітайская будаўнічая інвестыцыйная кампанія выказала намер узвесці у Гродне жылы масіў. Пастаўкі сваіх вырабаў у Кітай распачаў шклозавод «Нёман»...

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*


## Извещение о проведении 14 июля 2016 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| № | Наименование | Инв. номер | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| 1. | зуборезный п/автомат 5С280П, год выпуска – 1980 | 4220623 | г. Минск, ул. Социалистическая, 2 | 4 460 | 446 |
| 2. | зуборезный п/автомат 5С280П, год выпуска – 1980 | 4220897 | | 4 460 | 446 |
| 3. | зуборезный п/автомат 5С280П, год выпуска – 1982 | 4223730 | | 5 800 | 580 |
| 4. | зуборезный п/автомат 5С280П, год выпуска – 1982 | 4223731 | | 5 800 | 580 |
| 5. | зуборезный п/автомат 5С280П, год выпуска – 1985 | 4226647 | | 7 140 | 714 |

**Продавец имущества – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.**

**Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.**

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **14 июля 2016 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 01.07.2016 по 12.07.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**

**(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**

**(017) 217-96-37 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).**



БПС-СБЕРБАНК

В связи со снижением с 01.07.2016 ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь с 22% до 20% годовых, ОАО «БПС-Сбербанк» с 01.08.2016 снижает на 2 процентных пункта размер процентов по действующим договорам срочных банковских депозитов для физических лиц в белорусских рублях: «Сохраняй», «Пополняй», «Управляй», «Безотзывный».

С 01.07.2016 ОАО «БПС-Сбербанк» устанавливает следующий размер процентов по действующим договорам в белорусских рублях срочного банковского депозита «Доверяй +»:

| Валюта депозита | Размер процентов (годовых) |
|---|---|
| BYN | 18% |

Установленный размер процентов будет применен к депозиту с 01.08.2016.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк».

# НАЙЛЕПШЫЯ ВЫНІКІ НА ЦТ — У ГІМНАЗІСТАЎ І ЛІЦЭІСТАЎ

## У Міністэрстве адукацыі аналізуюць, як абітурыенты 2016 года справіліся з экзаменацыйнымі заданнямі

**Вынікі ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання па матэматыцы аказаліся вышэйшымі за леташнія.**

Мінімальнае парогавае значэнне тэставага бала па матэматыцы, вызначанае для першага профільнага прадмета (15 балаў), пераадолелі ў гэтым годзе 63,6% абітурыентаў, а для другога профільнага прадмета (10 балаў) — 81,7% абітурыентаў. **Максімальна магчымы бал маюць 25 удзельнікаў тэсціравання** (між іншым, у 2015 годзе такіх шчаслiўцаў было 89). 18 уладальнікаў 100-бальных сертыфікатаў з'яўляюцца выпускнікамі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі бягучага года.

Сярод 100-бальнікаў ёсць прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў, але найбольшая іх колькасць усё ж такі — жыхары сталіцы.

Міністр адукацыі Міхаіл Журавкоў канстатуе, што сёлета павялічыўся сярэдні працэнт выканання заданняў часткі А і часткі В. Больш за палову заданняў часткі А мае працэнт выканання звыш пяцідзесяці. А ўключэнне ў тэст задач В11 і В12 пятага (найвышэйшага) узроўню складанасці дазволіла ранжыраваць абітурыентаў з найбольш высокім узроўнем падрыхтоўкі.

**Па выніках цэнтралізаванага тэсціравання па біялогіі 100-бальныя сертыфікаты атрымаюць сёлета 25 удзельнікаў.** Летась такім выдатным вынікам маглі пахваліцца толькі 5 чалавек.

Сярод уладальнікаў максімальнага выніку — прадстаўнікі ўсіх абласцей Беларусі і сталічных устаноў адукацыі. Не пераадолелі парогавага значэння тэставага бала для першага профільнага прадмета (набралі менш за 15 балаў) 6,3% ад агульнай колькасці ўдзельнікаў ЦТ, для другога профільнага прадмета (10 балаў) — 0,76% удзельнікаў экзамену. А 3 чалавекі атрымалі нуль балаў.

**Усе заданні ў тэстах па біялогіі былі складзены ў строгай адпаведнасці з дзейнай праграмай уступных выпрабаванняў і зместам школьных навучальных дапаможнікаў.**

Міхаіл Журавкоў лічыць, што невялікая колькасць абітурыентаў, якія атрымалі на экзамене мінімальныя і максімальныя тэставыя балы, сведчыць пра тое, што экзаменацыйная работа мела патрэбную ступень цяжкасці і дазволіла дыферэнцаваць удзельнікаў тэсціравання па ўзроўні іх падрыхтоўкі.

Міністр адукацыі падкрэсліў, што ўсе заданні ў тэстах па біялогіі былі складзены ў строгай адпаведнасці з дзейнай праграмай уступных выпрабаванняў і зместам школьных навучальных дапаможнікаў. І, галоўнае, усе заданні кожнага з дзесяці варыянтаў тэста былі выкананы цалкам хоць бы адным удзельнікам тэсціравання; г.зн., што 100-бальнікі ёсць па ўсіх без выключэння варыянтах тэста.

**На ЦТ па гісторыі Беларусі 100 балаў атрымалі 14 чалавек** (у 2015 годзе — 4).

Большасць абітурыентаў, якія прадэманстравалі бліскучыя веды (11 чалавек), скончылі ўстановы адукацыі ў гэтым годзе. Найлепшыя вынікі ў ліцэістаў (49,30) і гімназістаў (49,36). Крыху ніжэйшыя вынікі ў выпускнікоў агульнаадукацыйных школ (36,17).

Аналіз статыстычных звестак паказаў, што працэнт выканання заданняў у адкрытай частцы тэста (частка В) у 2016 годзе вышэйшы, чым летась, што дэманструе не толькі павышэнне ўзроўню падрыхтоўкі абітурыентаў па прадмеце, але і адпаведнасць гэтых заданняў узроўню падрыхтоўкі сярэднестатыстычнага абітурыента.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

## ■ З болем у сэрцы

# «Заказчыкі і выканаўцы тэракта паказалі сваю нечалавечую сутнасць»

**У выніку тэракта ў стамбульскім аэрапорце Атацюрка, які адбыўся позна ўвечары 28 чэрвеня, колькасць загінулых ужо дасягнула 43 чалавек, каля 140 атрымалі раненні.**

Тры выбухі прагучалі ў міжнародным тэрмінале аэрапорта. Выбуховыя прылады прывялі ў дзеянне тэрарысты-смяротнікі. Адказнасць за тое, што адбылося, узяла на сябе забароненая ў многіх краінах тэрарыстычная групоўка «Ісламская дзяржава». Згодна з інфармацыяй міністэрства аховы здароўя Турцыі, падчас атакі на аэрапорт, акрамя грамадзян гэтай краіны, пацярпелі і іншаземцы. На шчасце, нашых суайчыннікаў сярод іх няма. Такія звесткі выкладзены ў сумесным твітар-акаўнце пасольства Беларусі ў Турцыі і генеральнага консульства Беларусі ў Стамбуле. Чаго не скажаш пра грамадзян іншых краін: у спісе загінулых значацца восем іншаземцаў, сярод якіх, згодна з апошнімі звесткамі, узбек і ўкраінка, яшчэ ў пяці ахвяр тэракта было падвойнае грамадзянства.




Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў шчырыя спачуванні Прэзідэнту Турэцкай Рэспублікі Рэджэпу Тайпу Эрдагану, родным і блізкім загінулых у аэрапорце Стамбула. Ён адзначыў, што паведамленне аб вялікай колькасці загінулых і параненых мірных грамадзян адазвалася глыбокім болем у сэрцы кожнага беларуса. А наяўнасць сярод іх жанчын і дзяцей асабліва падкрэсліла нечалавечую сутнасць заказчыкаў і выканаўцаў тэракта.

**Сяргей СТАРЫНАЎ**

■

# У ТУРЦЫЮ — НА СВАЮ РЫЗЫКУ

**МЗС Беларусі па-ранейшаму рэкамендуе грамадзянам краіны ўстрымацца ад наведвання паўднёва-ўсходніх правінцый Турцыі, паведаміла намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі — начальнік аддзела прэс-службы ведамства Марыя ВАНЬШЫНА.**

У сувязі з нядаўнім тэрактам у міжнародным аэрапорце Стамбула турыстам рэкамендуюць не наведваць месцаў масавага збору людзей, якія могуць стаць мішэнню для тэрарыстаў. Пры гэтым спецыяліст падкрэсліла, што ў асноўных курортных зонах Турцыі сітуацыя застаецца стабільнай і кантралюецца. Праваахоўныя органы гэтай краіны прымаюць усе неабходныя меры для бяспекі турыстаў.

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» **начальнік аддзела развіцця турыстычнай кампаніі Smok Travel Юлія ТРАПАШКА**, адмаўлення ад тураў у Турцыю кліенты фірмы апошнім часам не рабілі. Больш за тое, попыт на адпачынак у гэтай паўднёвай краіне застаецца на высокім узроўні. Пры гэтым спецыяліст адзначыла, што для ўсіх ахвотных ёсць магчымасць замены ўжо набытых тураў на падарожжы ў іншыя краіны.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

## ■ Мінус чатыры нулі

# І на пошце, вядома ж, таксама

**У сувязі з дэнамінацыяй, якая праводзіцца 1 ліпеня, адбудуцца змены ў рабоце пошты.**

У прыватнасці, *у першы дзень ліпеня ў аперацыйных акенцах аддзяленняў паштовай сувязі паслугі кліентам прадастаўляцца не будуць.* Дастаўка друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, простых паштовых адпраўленняў без накладной платы, якія рэгіструюцца, будзе здзяйсняцца ў вызначаным парадку.

У пунктах па прыёме і выдачы паштовых адпраўленняў будуць выдавацца толькі паштовыя адпраўленні без накладной платы і наличных мытных пошлін.

З 2 ліпеня работа аддзяленняў паштовай сувязі будзе арганізавана ў адпаведнасці з устаноўленым рэжымам.

У перыяд з 30 чэрвеня да 4 ліпеня магчымы збой у рабоце банкаўскіх плацежных картак. Таму кліентам для разлікаў рэкамендуецца мець наяўныя грошы.

Пошта загадзя прыносіць прабачэнні за магчымыя няручнасці і дзякуе сваім кліентам за разуменне.

## ■ Трагедыя

# Калодзеж забіў шасцярых

**Пазаўчора вечарам у вёсцы Каменка Крупскага раёна загінулі адразу шэсць чалавек, сярод іх — двое супрацоўнікаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.**

Каля 21 гадзіны мясцовы жыхар спусціўся ў шасціметровы каналізацыйны калодзеж, што знаходзіцца каля яго дома. Падчас чысткі мужчыну стала дрэнна і ён зваліўся на дно. На дапамогу прыйшлі суседзі — усе трое па чарзе спускаліся ўніз і страчвалі прытомнасць.

Целы ўсіх чацвярых паднялі наверх супрацоўнікі МНС, што прыбылі на месца здарэння. Медыкі канстатавалі смерць пацярпелых. Падчас правядзення аперацыі былі шпіталізаваны і два супрацоўнікі ратавальнага ведамства. Прычына — атручванне газам, што сабраўся на дне калодзежа. Не прыходзячы ў прытомнасць, абодва памерлі ў бальніцы, паведаміў **прэс-сакратар МНС Віталь НАВІЦКІ.**

«Следчыя правялі агляды целаў загінулых, прызначаны судова-медыцынскія экспертызы з мэтай устанаўлення дакладнай прычыны смерці. Узяты пробы паветра, якія змяшчаюцца ў калодзежы, у тым ліку зроблены забор паветра для правядзення хімічных даследаванняў».

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | **ОАО «БЗПИ»,** Минская обл., г. Борисов, ул. Даумана, 97 |

**Предмет аукциона (имущество реализуется одним лотом)**

Производственная база в составе: **проходная, столовая, клуб** (417,9 кв.м, инв. № 610/С-37022), **производственное здание №1** (983,4 кв.м, инв. № 610/С-36970, в т.ч. противопожарный резервуар 150 кв.м), **производственное здание №3** (541,3 кв.м, инв. № 610/С-36984), **производственное здание №4** (580,1 кв.м, инв. № 610/С-36975, в т.ч. дымовая труба), **здание автовесовой** (39,2 кв.м, инв. № 610/С-36988, в т.ч. весы рк 130 (30 тонн), **лаборатория и склад** (120,9 кв.м, инв. № 610/С-36967), **механическая мастерская** (244 кв.м, инв. № 610/с-36954, в т.ч. кузня), **бытовые помещения гаража** (149,8 кв.м, инв. № 610/С-37166), **производственное здание №2** (2160,5 кв.м, инв. № 610/С-388), **трансформаторная подстанция** (32,1 кв.м, инв. № 610/С-37018, в т.ч. наружные сети электроснабжения 1376 м), **административное здание** (343,9 кв.м, инв. № 610/С-37032, в т.ч. автодороги 5982 кв.м, ограждение территории с воротами 207,1 м, забор с двумя калитками 99 м), **склад сырья №1** (428 кв.м, инв. № 610/С-37038), **складские помещения** (84,3 кв.м, инв. № 610/С-36959), **склад сырья №2** (322,2 кв.м, инв. № 610/С-36974), **склад сырья** (83,8 кв.м, инв. № 610/С-36980), **наружные сети канализации** (269,6 м, инв. № 610/С-56281), **наружные тепловые сети** (302,6 м, инв. № 610/С-56282), **внутризаводской водопровод** (239,3 м, инв. № 610/С-56283). В состав предмета аукциона входит **оборудование в количестве 23 единицы** (в соответствии с перечнем оборудования, размещенного на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

**Месторасположение предмета аукциона: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Советская, д. 14а**

**Начальная цена с НДС 20% – 5 543 447 400 бел. руб. (снижена на 70%) (с учетом деноминации 554 344 руб. 74 коп.)**

**Сведения о земельном участке**: предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации зданий и сооружений административного, производственного и бытового назначения производственной базы пл. **1,4378** га с ограничениями в использовании земель – водоохранная зона р. Березина

**Обременения:** частично площади зданий сданы в аренду. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона.

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано газете **«Звязда» от 19.03.2016**

**Аукцион состоится 28.07.2016 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 26.07.2016 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **ЛОТ №1. Автомобиль МАЗ-533702240 ЗСК Ф-15-02, 2010 года выпуска, стоимостью 142 650 000 белорусских рублей** |
| Собственник (владелец) имущества | **ОАО «Ушачский райагросервис» (УНН 300005969)** |
| Местонахождение (адрес) имущества | **Ушачский р-н, д. Граденец, ул. Центральная, 3а** |
| Наличие обременений | **нет** |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | **18.07.2016 в 11.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, д. 10/1, каб. № 1.3** |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, д. 10/1. (www.vitebskjust.gov.by) Судебный исполнитель Зиновенко Олег Олегович, тел. (80212) 61-40-22, моб. +375336879159 начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (80212) 61-40-15 |
| Условия и порядок проведения торгов | **Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:** 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет Главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, **не позднее 15.00 15.07.2016 г.** Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |

ОАО «Минский завод отопительного оборудования»

**ИЗВЕЩАЕТ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 11 июля 2016 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 29 – зал заседаний.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ внеочередного общего собрания акционеров открытого акционерного общества «Минский завод отопительного оборудования» 11 июля 2016 г.**

1. О внесении изменения в Устав ОАО «Минский завод отопительного оборудования».

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться по указанному адресу (у председателя наблюдательного совета) с 30 июня по 8 июля 2016 года с 10 до 16 часов.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 14.00 до 14.50 в день и по месту проведения собрания **на основании документа, удостоверяющего личность**. Кроме того, представитель акционера должен иметь доверенность (руководитель юридического лица, являющегося акционером, – документы, подтверждающие его полномочия).

Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров по состоянию **на 1 июня 2016**.

*Наблюдательный совет ОАО «Минский завод отопительного оборудования»*

УНП 100008064

Учреждение образования
«Барановичский государственный университет»

ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ на 2016 год

за счет средств республиканского бюджета в дневной (1 место) и заочной (1 место) форме получения образования по специальности 05.02.07 «Технология и оборудование механической и физико-технической обработки».

УНН 200166687

**Документы для поступления принимаются с 01 августа по 30 сентября 2016 года по адресу: г. Барановичи, ул. Войкова, 21, административный корпус № 2, каб. 206.**

Справки по телефону: **8 0163 45 78 60** или на сайте университета **www.barsu.by.**

# ПАМЫЦЬ І АСТУДЗІЦЬ... ВУЛІЦУ



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Асабіста для мяне мыццё — больш зручны від работы, — кажа вадзіцель, пакуль мы выязджаем з «Весялоўкі». — Галоўнае, ёсць магчымасць працаваць, як цяпер, ноччу: няма іншых машын, пешаходаў, святлафоры не працуюць. Адчуваеш сябе гаспадаром горада. На паліве складаней — трэба ўлічваць трафік, бо робіцца гэта звычайна ўдзень. З іншага боку, падчас мыцця палівальная ўстаноўка наладжана такім чынам, каб струмень вады выходзіў з фарсунак шчыльным і моцным «лістом» — тады ўсё смецце прыбіваецца да бардзюраў. А пры астуджэнні галоўным паказчыкам становіцца ўжо не ціск, а плошча — вада як бы распырскваецца ва ўсе бакі. Менавіта таму нават самыя шырокія вуліцы можа паліць усяго адна машына, падчас мыцця ж працаваць трэба брыгадамі.



**Мяне часам уражвае стаўленне навакольных да палівальных машын. Людзі быццам бы не разумеюць, што наша праца — залог камфорту іх перасоўвання па горадзе.**

Навошта ўвогуле мыць дарогі? Як тлумачыць суразмоўца, акрамя звычайнага смецця і пылу, на палатне нярэдка аказваюцца рэчы, якія могуць нашкодзіць вадзіцелям, напрыклад дробныя аскепкі, што засталіся пасля ДТЗ. Гэтак жа прыбіраюцца і шкодныя рэчывы, што могуць трапіць у навакольнае асяроддзе: разлітая аліва, паліва... Усё гэта або трапляе ў «ліўнёўкі», або збіраецца спецыяльнай тэхнікай, якая праходзіць пасля палівальных машын.



Наша сённяшняя зона адказнасці — некалькі ўчасткаў на праспекце Незалежнасці. Першы — ад бульвара Талбухіна да перасячэння галоўнай магістралі сталіцы з вуліцай Каліноўскага ў абодвух кірунках. Па начным горадзе даязджаем да стартавага пункта за лічаныя хвіліны. Па двух левых палосах некалькі хвілін таму прайшлі калегі Анатоля — усё смецце выбіта струменем вады на правую паласу. Таму мы робім «апошні штрыхі» да працы. Пры дапамозе спецыяльнай панэлі вадзіцель кіруе ўстаноўкай: спачатку выстаўляе яе на патрэбную вышыню (з дзясятак сантыметраў ад зямлі), пасля ўключае помпу. Пачынаем павольна рухацца наперад.

— Спяшацца ў гэтай справе нельга, — кажа суразмоўца, увесь час пазіраючы на шматлікія люстэркі па баках ад кабіны. — Калі ехаць хутчэй за 20 кіламетраў у гадзіну, прыборка будзе няякаснай. Трапляюцца і складаныя ўчасткі дарогі, таму трэба заўсёды быць пільным. Туды-назад — усяго шэсць кіламетраў, але займуць яны хвілін дваццаць, вады ў цыстэрне новых МАЗаў хапае якраз на такую працягласць.

Дарэчы, старых ЗІЛаў, якія ўмяшчалі вады на тры кіламетры паліву, у парку «Гаррэмаўтадарэ» засталося няшмат. Большая частка машын — новая, беларускай вытворчасці. Не дзіўна, бо менавіта гэта прадпрыемства займаецца абслугоўваннем усіх галоўных вуліц горада. Догляд дарог у «спальных раёнах» звычайна ўскладаецца на арганізацыі кожнай з адміністрацыйных адзінак сталіцы.

Праз некаторы час струмень вады заўважна слабее — заканчваецца вада. Мы зноў рухаемся на «запраўку». Па словах Анатоля Антаневіча, часам за ноч прыходзіцца рабіць 6-7 такіх выездаў. Акрамя гэтага, вадзіцелі самі рыхтуюць да змены тэхніку, наладжваюць устаноўкі.

— Выхадных у нашага прадпрыемства няма, — кажа Анатоль. — Працуем штодзень, бо дарогі чакаць не будуць. Усё па графіку «тры праз тры», і ўдзень, і ўночы. Адна змена — 12 гадзін. Зімой мяняем палівальную ўстаноўку на так званы «плуг» і працуем ужо на прыбіранні снегу.

**Праз некаторы час струмень вады заўважна слабее — заканчваецца вада. Мы зноў рухаемся на «запраўку». Часам за ноч прыходзіцца рабіць 6-7 такіх выездаў.**

Гэта яшчэ складаней за паліў і мыццё і, галоўнае, больш адказна. Калі мы сваю працу не зробім, то ўвесь горад можа літаральна спыніцца. Славуты «Хаўер» я не заспеў, але нават сёлета снегу часам было вельмі шмат, і працаваць даводзілася ў аўральным рэжыме.

Выязджаем на наступны ўчастак: ад вуліцы Бабруйскай да бульвара Талбухіна. Гэтым разам працуем толькі ў адным кірунку і ў «звязцы»: усе тры машыны дарожнікаў будуць рухацца адначасова. На вуліцы святлее, і ўжо з'яўляюцца першыя аўтамабілі. Раптам на плошчы Незалежнасці ў машыны, што ідзе ў сярэднім радзе, збіваецца кірунак струменю — устаноўка за нешта зачапілася. Уся калона спыняецца, з кабін выбягаюць калегі з інструментамі ў руках — дапамагаюць. За некалькі хвілін непаладку ліквідуюць.

**Пры астуджэнні галоўным паказчыкам становіцца ўжо не ціск, а плошча — вада як бы распырскваецца ва ўсе бакі. Менавіта таму нават самыя шырокія вуліцы можа паліць усяго адна машына, падчас мыцця ж працаваць трэба брыгадамі.**

— Добра, што пакуль у горадзе няшмат машын, — каментуе Анатоль Антаневіч. — Бо калі нешта падобнае здараецца ўдзень, у іншых удзельнікаў руху часта не вытрымліваюць нервы — пачынаюць сігналіць, сварыцца. Увогуле, мяне часам уражвае стаўленне навакольных да палівальных машын. Людзі быццам бы не разумеюць, што наша праца — залог камфорту іх перасоўвання па горадзе. Асабліва здзіўляюць тыя, хто ставіцца да нас ледзь не як да гарадской праблемы, маўляў, запавольваем рух, а можам яшчэ і вады абліць. У нас на даху мігалка, падчас дзённых змен мы ўвесь час сігналім, папярэджваючы аб набліжэнні. Калі нехта стаіць на краі тратуара ў навушніках і нічога вакол сябе не бачыць, што можна зрабіць?

— Я сам кіроўца, — кажа Анатоль Антаневіч, — таму бачу, калі магістралі недзе недагледжаныя, калі дрэнна памытыя. Дарога — надта дарагое задавальненне, каб пакідаць яе без догляду.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**

## УВАГА! СЁННЯ АПОШНІ ДЗЕНЬ

**Тым, хто вырашыў (і мае права) паменшыць суму збору на фінансаванне дзяржаўных расходаў на 10%, павінен заплаціць у бюджэт 3 млн 240 тысяч рублёў да 1 ліпеня.**

**Гэты чацвер стане і апошнім днём для тых, хто вырашыць падаць адпаведную заяву на прыватызацыю свайго жылля, якое да гэтага часу лічыцца ў структуры дзяржаўнага жыллёвага фонду. Ужо за ліпень карыстальнікам падобных памяшканняў прыйдзецца плаціць дзяржаве арэндную стаўку.**

## Мінус чатыры нулі

### «ПЛАСТЫК» ЗНОЎ У ФАВОРЫ

**Мінгандлю ўдакладняе, што плацежныя тэрміналы адразу пасля дэнамінацыі будуць працаваць у звычайным рэжыме**

**Аб гэтым заявіў першы намеснік міністра гандлю Беларусі Артур КАРПОВІЧ. А нагодай для ўдакладнення сталі дзеянні асобных гандлёвых пунктаў, якія вырашылі «падстрахавацца» і аб'явілі сваім спажыўцам аб немагчымасці на працягу пэўнага часу разлічвацца карткамі. Зразумела, што людзі ўспрынялі гэтую навіну сур'ёзна і... каля некаторых банкаматаў пачалі з'яўляцца вялікія чэргі.**

Паводле слоў намесніка міністра, іх ведамства «зафіксавала асобныя факты ўвядзення ў зман насельніцтва арганізацыямі, якія ажыццяўляюць прыём плацяжоў за тавары і паслугі з дапамогай выкарыстання банкаўскіх пластыкавых картак». У шэрагу арганізацый была прадстаўлена недакладная інфармацыя, якая скажае рэчаіснасць. «Напрыклад, у аб'ектах акцыянернага таварыства «ДарОс» 28 чэрвеня па прычыне недастатковага разумення работнікаў прадпрыемства былі вывешаны аб'явы, якія змяшчаюць інфармацыю аб тым, што «разлікі па тэрмінале праводзіцца не будуць з 30 чэрвеня па 3 ліпеня ў сувязі з дэнамінацыяй афіцыйнай грашовай адзінкі Рэспублікі Беларусь». Артур Карповіч таксама заявіў, што падобныя выпадкі непраўдзівых аб'яў меліся і на некаторых станцыях чыгункі У сувязі з гэтым Мінгандлю нагадвае, што, паводле афіцыйнай інфармацыі ад Нацбанка, па тэхнічных прычынах будзе немагчыма разлічвацца банкаўскімі карткамі толькі ў перыяд з 23.30 30 чэрвеня да 8 гадзін раніцы 1 ліпеня. «У іншы час плацежныя тэрміналы на аб'ектах гандлю і грамадскага харчавання будуць працаваць у штатным рэжыме. Гэтае пытанне ўзята на асаблівы кантроль Гандлёвай інспекцыяй», — падкрэсліў прадстаўнік міністэрства.

### ПА КРЭДЫТАХ ЛЕПШ РАЗЛІЧЫЦЦА ЗАГАДЗЯ

**А вось пагасіць сваю запазычанасць у апошнія гадзіны чэрвеня будзе немагчыма**

**Новыя грошы ў нас з'явяцца з 1 ліпеня і гэты факт практычна ніяк не паўплывае на алгарытм фінансавага жыцця насельніцтва. У грошай адмінусуюць чатыры нулі, але багацей ці бядней ад гэтага мы не станем. Можа толькі... Пэўныя нязручнасці могуць узнікнуць для тых, хто вырашыць адцягнуць правядзенне плацяжоў па крэдытах «да апошняга». Прынамсі, праблемнымі для банкаўскай сістэмы будуць толькі некалькі дзён.**

Напрыклад, прэс-служба буйнейшай фінансавай сістэмы краіны паведамляе, «што ў сувязі з правядзеннем дэнамінацыі часова будуць недаступныя аперацыі па пагашэнні крэдытаў фізічнымі асобамі ў аддзяленнях банка і ў інфакіёсках установы з 19 гадзін 30 чэрвеня па 24 гадзін 3 ліпеня». Нельга будзе заплаціць па крэдытах і па каналах дыстанцыйнага абслугоўвання інтэрнэт-банкінгу з 23.00 29 чэрвеня да 24.00 3 ліпеня, а ў сістэме М-банкінгу і SMS-банкінгу — з 23.00 30 чэрвеня да 24.00 3 ліпеня.

Акрамя таго, спецыялісты Беларусбанка паведамляюць, што ў сістэме «Інтэрнэт-банкінг» ажыццяўленне аперацыі папаўнення рахунку «Безнаяўны крэдыт» для пагашэння крэдыту «Інтэрнэт-безнаяўны» будзе недаступна з 23.00 29 чэрвеня да 24.00 2 ліпеня.

Менавіта таму эксперты Беларусбанка рэкамендуюць загадзя правесці неабходныя плацяжы, каб потым не трапіць у спіс недысцыплінаваных кліентаў.

А яшчэ спецыялісты Беларусбанка паведамляюць, што з 1 па 3 ліпеня ў іх змяняецца рэжым аказання паслуг, калі аддзяленні банка не ажыццяўляюць абслугоўванне кліентаў па пытаннях крэдытавання фізічных асоб.

### ПРАДПРЫМАЛЬНІКАМ ТРЭБА ПАКЛАПАЦІЦЦА

**Падатковая служба краіны рэкамендуе ўсім індывідуальным прадпрымальнікам, якія з'яўляюцца плацельшчыкамі адзінага падатку, загадзя паклапаціцца аб своечасовай аплаце гэтага збору за ліпень яшчэ ў чэрвені ў сувязі дэнамінацыяй, паведамляе прэс-служба Міністэрства па падатках і зборах Беларусі.**

У міністэрстве патлумачылі, што «ў сувязі з правядзеннем дэнамінацыі афіцыйнай грашовай адзінкі Беларусі банкам прадастаўлена права 1 ліпеня 2016 года не праводзіць разліковае і касавае абслугоўванне кліентаў альбо прыпыняць аказанне кліентам асобных відаў паслуг па ажыццяўленні банкаўскіх аперацый. Пры такіх абставінах, улічваючы, што апошнім днём аплаты адзінага падатку за ліпень з'яўляецца 1 ліпеня, звяртаем увагу індывідуальных прадпрымальнікаў — плацельшчыкаў адзінага падатку на неабходнасць загадзя паклапаціцца аб своечасовай аплаце гэтага падатку.

Прэс-служба МНС нагадвае, што ў выпадку выканання падатковага абавязацельства ў больш позні тэрміны на парушальніка налічваюцца пені за кожны каляндарны дзень пратэрмінοўкі, уключаючы дзень аплаты (спагнання), на працягу ўсяго тэрміну невыканання падатковага абавязацельства.

### ТАРЫФЫ ДА КАПЕЕЧКІ

**У сувязі з дэнамінацыяй дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» расказала аб прымяненні тарыфаў на міжгародніх аўтамабільных перавозках пасажыраў у рэгулярных зносінах.**

Тарыфы за адзін кіламетр праезду пасажыраў пры ажыццяўленні перавозак у рэгулярных зносінах па міжгародніх маршрутах будуць наступнымі. На звычайных маршрутах: у аўтобусах агульнага тыпу — 0,059 рубля (напрыклад, памнажаем гэты тарыф на 30 кіламетраў і атрымліваем кошт праезду 1 рубель77 капеек; у аўтобусах з мяккімі адкіднымі сядзеннямі — 0,061 рубля. На хуткасных маршрутах: у аўтобусах агульнага тыпу — 0,0768 рубля; у аўтобусах з мяккімі адкіднымі сядзеннямі — 0,0794 рубля. На дадатковых рэйсах:у аўтобусах агульнага тыпу — 0,0796 рубля; у аўтобусах з мяккімі адкіднымі сядзеннямі — 0,0824 рубля.

На асобных міжгародніх маршрутах тарыфы за адзін кіламетр праезду будуць такімі: Мінск — Гродна — 0,0310 рубля; Мінск — Гродна праз Баранавічы — 0,0464 рубля; Мінск — Магілёў, Мінск — Краснаполле, Мінск — Хоцімск — 0,0292 рубля; Мінск — Пінск праз Клецк, Мінск — Пінск праз Сінявку — 0,066 рубля.

На некаторых маршрутах тарыф складзе за паездку: Мінск — Гродна (акрамя адпраўлення праз Баранавічы) — 9 рублёў, на ўчастку Мінск — Ліда, Ліда — Гродна — 5 рублёў; Мінск — Магілёў — 6 рублёў.

Тарыфы на аўтамабільныя перавозкі багажу і (або) ручной паклажы ў рэгулярных зносінах на міжгародніх маршрутах за адзін кіламетр правозу складуць: за кожнае маламернае месца багажу — 0,005 рубля; за кожнае сярэднямернае месца багажу — 0,01 рубля; за кожнае буйнамернае месца багажу — 0,02 рубля.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Сяргей КУРКАЧ.**

Сямейная газета

Выпуск № 12 (55)



# УСМІХАЙЦЕСЯ, НАВАТ КАЛІ СУМНА

Аднойчы, калі здавалася, што «трэснуў свет напалам», невядома адкуль з'явіўся незнаёмец і працягнуў мне букецік рамонкаў. «Усміхайцеся, нават калі сумна: нехта ж можа закахацца ў вашу ўсмешку», — сказаў гэта і... знік у натоўпе. Я нават не паспела яму падзякаваць... Стаяла ў разгубленасці з кветкамі ў руцэ і... усміхалася.

А нядаўна інтэрнэт абляцела гісторыя пра дзядулю, які кожны дзень стаіць каля крамы з палачкай і нічога не просіць. «Я месяц назірала за ім, а потым не вытрымала, падышла і спытала, навошта ён тут стаіць, — піша Крысціна. — Аказалася, Мікалай Сцяпанавіч нічога не бачыць вось ужо 8 гадоў. А стаіць каля крамы, бо чакае, што хто-небудзь купіць яму трохі прадуктаў. Дадому вяртаецца, просячы мінакоў адвесці яго па адрасе. У дзядулі ёсць сын-інвалід, які нават не ўстае. Сам Мікалай Сцяпанавіч быў настаўнік фізкультуры, любіць футбол, праз слепату ён толькі слухае тэлевізар, «хварэе» за «Арсенал». Напрыканцы размовы расказаў мне рэцэпт баршчу і расплакаўся. Я купіла яму макаронаў і хлеба і пабегла на работу. ...Калі будзеце каля гандлёвага цэнтра «Ракаўскі кірмаш» у раёне метро Пушкінская, пагаварыце з Мікалаем Сцяпанавічам хоць пару хвілін, купіце яму што-небудзь. Вы зробіце добрую справу, а дзядуля будзе рады булачцы з малаком і таму, што не самотны. Стаіць ён кожны дзень прыкладна з 13.00 да 15.00, недалёка ад уваходу ў краму «Суседзі»».

Калі мы з сябрамі былі ў Віцебску, завіталі ў сувенірную лаўку. Там нас сустрэла ўзрушаная прадавец з тэлефонам у руках. «Можа, хтосьці з вас можа гаварыць па-англійску? — з надзеяй у голасе спыталася яна. — Скажыце чалавеку, каб ён вярнуўся за сваімі грашыма...» Аказалася, што незадоўга да нас сюды заходзіў амерыканец і набыў дарагі роспіс па шкле. Калі ён сышоў, прадавец пачала пералічваць грошы, якія той пакінуў за пакупку, і... Аказалася, што ён заплаціў на 3 мільёны больш. «Я абзваніла ўсе гасцініцы горада, — расказвае жанчына. — І вось нарэшце знайшла яго (ён проста вельмі пазнавальны: у капелюшы з палямі ды ўсмешлівы такі). Якраз у гэты момант зайшлі вы — пэўна, Бог мне вас паслаў». На наступны дзень я вярнулася ў тую крамку, бо карцела даведацца, чым усё ж скончылася гісторыя. Прадавец расказала, што амерыканец неўзабаве прыехаў са сваёй рускамоўнай нявесткай. «Быў так удзячны, — не хавае яна сваіх эмоцый. — Яшчэ некалькі сувеніраў у мяне купіў. А потым, уявіце, запрасіў у госці, у Амерыку! Вось візітоўку нават пакінуў *(паказвае)*. Ён — дзіцячы доктар». «І няўжо не было думкі пакінуць тыя грошы сабе? Амерыканец жа ўсё роўна не заўважыў бы знікнення», — спыталася маладая пакупніца, якая чула нашу размову. — «Што вы, барані Божа! — адмахнулася жанчына. — Я не магла так зрабіць... Хоць у той дзень ён у мяне быў адзіны пакупнік...» — «Вы вельмі сумленна зрабілі, — падключыўся да размовы малады мужчына. — Вельмі часта ў пагоні за ілюзорнай выгадай мы страчваем значна больш».

...Маці і дзядзька майго сябра не размаўляюць ужо год. І ўсё з-за яблыкаў у бацькоўскім садзе... Хтосьці ўзяў больш, хтосьці менш. У выніку рассварыліся ўшчэнт, прыгадалі адно аднаму ўсе даўнія крыўды... І такіх гісторый хоць гаць гаці. Людзі сварацца з-за 5 сотак зямлі, з-за драўляных хат, якія засталіся ў спадчыну ад бацькоў... І не размаўляюць гадамі... Сумна назіраць, як матэрыяльныя каштоўнасці становяцца важнейшымі за жывыя зносіны. І неўпрыкмет ўспамінаюцца словы Лісіцы з казкі пра Маленькага прынца: «У людзей ужо няма часу для пазнання. Яны купляюць у крамнікаў гатовыя рэчы. Але не існуе крамаў, дзе б гандлявалі сябрамі. І таму ў людзей больш няма сяброў».

«А вы паспрабуйце саступіць, патэлефанаваць Людцы, з якой не размаўлялі пяць гадоў, і сказаць: «Люд, давай скончым усю гэтую гісторыю: я штосьці сказаў не так. Ты сказала... Давай у кіно сходзім», — прапаноўвае акцёр Пётр Мамонаў. — Вы ўбачыце, як ноччу будзе добра. Усё вяртаецца стакроць табе, любімаму, не толькі бліскучымі бразготкамі, а станам душы. Вось сапраўднае шчасце! Але каб яго дасягнуць, кожную хвіліну трэба думаць, што сказаць, што зрабіць. А яшчэ... кожную ноч трэба задаваць сабе простаецькае пытанне: «Я пражыў дзень — каму-небудзь ад гэтага было добра?»

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

■ Сустрэча без абцасаў

# «МЫ НЕ МАЕМ ПРАВА БАЯЦЦА»

**Зусім нядаўна споўнілася даўняя мара дырэктара міжнароднага дабрачыннага грамадскага аб'яднання «Дзеці. Аўтызм. Бацькі» Таццяны ЯКАЎЛЕВАЙ. У нашай краіне з'явіўся ўнікальны сямейны інклюзіў-тэатр «І», дзе разам са звычайнымі акцёрамі на сцэну выходзяць дзеці з аўтызмам. Прэм'ера першага беларускамоўнага мюзікла «Флейта-чарадзейка» прайшла на пачатку чэрвеня ў Белдзяржфілармоніі. Напрыканцы спектакля на сцэну ў вобразе Феі Дабра выйшла сама Таццяна за ручку са сваім Сонечным Праменьчыкам — 8-гадовым сынам Ільюшам. Яны праспявалі разам «О, соле міа». Гэта было настолькі шчыра і кранальна, што я, як і большасць гледачоў, не змагла стрымаць слёз. Слёз радасці за бацькоў і іх асаблівых дзетак, якія, прызналася мая гераіня, зрабілі першы крок у новае жыццё... Падчас душэўнай размовы Таццяна распавяла, як знайшла сябе і навучылася быць шчаслівай, нягледзячы на тое, што яе сыну паставілі дыягназ «аўтызм». А таксама патлумачыла, чаму так важна бацькам асаблівых дзетак выходзіць з чатырох сцен і трымацца разам.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*



Фота Марыі ШАЎЧЭНКІ.

Фея Дабра разам са сваім Сонечным Праменьчыкам.

■ Бліжэй да прыроды

# ЭКАЕЖА З ГРАДКІ

## Як яе вырасціць, не па чутках ведае сям'я Сідаравых

**«Для людзей — як для сябе» — дэвіз арганічных фермераў Віталя і Алены СІДАРАВЫХ. Некалькі гадоў таму яны прамянялі сталіцу на ўчастак у вёсцы і сталі вырошчваць экалагічна чыстыя ягады, гародніну і зяленіва. Сваю гаспадарку сям'я падымала практычна з нуля, але цяпер ажыў не толькі ўчастак, але і сама вёска. Галоўны клопат і гонар сям'і — буякі, якія цяжка вырасціць без хімічных угнаенняў... Планы на арганіку ёсць і ў сыноў Алены і Віталя. Але пра ўсё па парадку.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*



Фота Надзеі БУЖАН.

Для Алены СІДАРАВАЙ буякі сталі любімымі ягадамі.

# ТАТЫ — НЕ БАНКАМАТЫ,

## або Які павінен быць сапраўдны бацька...

**Сумеснае жыццё — гэта танец, дзе танчаць абое, якія ўдвая стаяць на нагах і ўлоўліваюць рухі партнёра. Яны разам адказныя за стварэнне мікраклімату ў сям'і і за ўплыў на дзяцей. Размеркаванне роляў па прынцыпе маці — толькі ахоўніца ачагу і выхавальніца, а бацька — толькі здабытчык і воін, якому не да сантыментаў, — не самая лепшая мадэль для пераймання яе дзецьмі. Правільны арыенцір у жыцці сям'і — калі ты сённяшні становішся лепшым, чым учарашні, можаш забяспечыць сябе і падзяліцца сваімі здабыткамі з блізкімі. Так разважае Міхаіл МАЦКЕВІЧ, вядучы «Тата-школ» — праекта па далучэнні мужчын да актыўнага выхавання дзяцей.**



**Аляксандр ДАРКОВІЧ і Яўген ЖЫЛЮК. Прыкладна так, вядучы гутарку за сталом, і праходзяць сустрэчы ў «тата-школах».**

**Прыйшоўшы да нас, бацькі пачынаюць разумець, што яны не толькі банкаматы, якія прынеслі грошы ў сям'ю і пайшлі па сваіх справах.**

### «Сям'я і як у ёй уцалець»

У кнізе з такой назвай апісваецца эксперымент над малпачкамі, праз які паказана, як розныя ўмовы выхавання малых уплываюць на іх развіццё і жыццё. Частку малпянят пакінулі з маці, частка падрастала «пад наглядам» лялькі з анучак, якая была вельмі падобная да маці і магла «карміць» малаком. А трэцю «гадавала» лялька, аплеценая цвёрдым дротам, якая таксама давала малако. Калі падрослых малпачак выпусцілі ў статак, то ўбачылі, што малпы, якія выраслі з мамай, упэўнена занялі лідарскія пазіцыі і рэалізавалі сябе. Тыя, каго выкарміла мяккая лялька, сталі нічым не адметнымі «сераднячкамі», а «выхаваныя» дротам зрабіліся ізгоямі.

З першых жа дзён немаўляты, як і малпачкі, успрымаюць наваколле не праз зрок ці слых, а праз тактыльны кантакт. Нейронная сетка мозга пры гэтым фарміруецца вельмі актыўна. І цёплае жывое цела побач дае пачуццё ўпэўненасці, якое потым становіцца фундаментам для станаўлення будучай асобы. Прыкладна так маладым бацькам на «тата-школах» тлумачаць, як важна быць у жыцці немаўляці з самых першых яго дзён.

— Прыйшоўшы да нас, бацькі пачынаюць разумець, што яны не толькі банкаматы, якія прынеслі грошы ў сям'ю і пайшлі па сваіх справах. Яны ўсведамляюць, што малое ўбірае ў сябе трывожныя эмоцыі маці, калі яна непакоіцца. І гэта адразу адбіваецца на асобе дзіцяці, якое расце ў трывозе і рызыкуе стаць нерэалізаваным чалавекам. Задача сапраўднага мужчыны — стварыць умовы, каб жонка была спакойная, — расказаў Міхаіл Мацкевіч. — Бацька можа дапамагчы жонцы ўжо проста тым, што патрымае немаўля на руках, бо праз гэта дзіця адчуе клопат і спакой. Тата, які з'явіўся ў жыцці малога пазней, ужо не выклікае ў дзіцяці даверу, які фарміруецца з першых дзён жыцця.



**На святкаванні Дня таты «Клуб ільвоў» зладзіў «практычныя» заняткі. Бацькі вучыліся правільна трымаць дзіця, паіць яго з бутэлечкі і «ўпакоўваць» у слінг. Хтосьці трэніраваўся на лялькы, а хтосьці — і на дзіцяці.**

### Не толькі мама бывае цяжарнай

«Тата-школы» — праект, які распачаўся ў Беларусі ў 2009 годзе ў Мінскім гарадскім цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей.

Члены рэспубліканскай арганізацыі «Клуб ільвоў» падхапілі эстафету з 2013-га. За гэты час яны дапамаглі больш як 500 бацькам.

— Працу мы пачыналі проста падыходзячы на вуліцы да цяжарных жанчын: расказвалі аб праекце, пыталіся, ці цікава ім даведацца, як будзе развівацца дзіця ў залежнасці ад клімату ў сям'і, і прапаноўвалі паўдзельнічаць. Яны прысылалі да нас сваіх мужоў, — усміхаецца Міхаіл Іванавіч. — Большасць нашых слухачоў і цяпер — гэта «цяжарныя» таты або бацькі немаўлят, якія прыходзяць у роспачы, бо не ведаюць, як сябе паводзіць, як перажыць цяжарнасць жонкі, што рабіць далей. Мы дапамагаем спраўляцца са страхам, што яны не забяспечаць сям'ю, або наадварот, паказваем шкоду гіперапекі над малымі. Змагаемся са стэрэатыпам многіх мужчын, што тата павінен далучацца да выхавання, калі дзіцяці ўжо тры гады споўніцца. Для ўсіх гэтых сітуацый няма і не можа быць гатовых рэцэптаў, і нашы сустрэчы тым і каштоўныя, што ў працэсе абмеркавання пэўных пытанняў некалькімі людзьмі (звычайна група — гэта 5-8 чалавек) мы маем столькі ж мадэляў паводзін. Людзі абменьваюцца вопытам і перажываннямі, гісторыямі з жыцця. І часта аказваецца, што нехта з прысутных трапляў у сітуацыю, якая хвалюе іншага, і ведае выйсце з яе. Такім чынам мы знаходзім унікальныя метады вырашэння праблем і пытанняў. Такіх адказаў не знойдзеш у кнігах ці інтэрнэце, бо мы паглыбляемся ў сітуацыю, а не сузіраем літары. Гэта як з веласіпедам. Можна доўга чытаць інструкцыю, як на ім ехаць, і нічога не зразумець, а можна проста сесці на яго і паспрабаваць круціць педалі.

Курс у «тата-школах» складаецца звычайна з пяці-шасці сустрэч, што адбываюцца цягам некалькіх тыдняў. Міхаіл асабліва падкрэсліве, што яны не лектары, а папулярызатары здаровых ідэй:

— Шляхам калектыўнага абмеркавання пэўных сітуацый таты вучацца яшчэ лепш узаемадзейнічаць спачатку паміж сабой, а пасля са сваімі блізкімі. Часам рашэнне некаторых праблем узнікае, нават калі іх не агучваюць. Чалавек проста слухае дыскусію і раптам знаходзіць выйсце са сваёй складанай сітуацыі. Мы прагаворваем таксама і паводзіны з дзецьмі пасля скасавання шлюбу, бо ты перастаў быць мужам, але не бацькам.

### Не апынуцца ў вакууме жаданняў

Ідэю быць клапатлівым і ўважлівым татам Аляксандр Дарковіч выношваў яшчэ да нараджэння дачкі, і цяпер робіць усё, каб удзяляць ёй як мага больш увагі. Віка не ходзіць у садок — бацькі выхоўваюць і вучаць яе дома самастойна.

Аляксандр трапіў на заняткі ў «тата-школу» ў эксперыментальную групу з удзелам жанчын. Там былі людзі з самым розным жыццёвым вопытам. І тыя, хто чакаў першынца, і тыя, хто рыхтаваўся стаць дзедам.

— Мы вельмі добра дапаўнялі адно аднаго, і ўся група хацела працягваць заняткі. Калі яны скончыліся, было такое адчуванне, што нешта ад нас забралі. Так што мы нават аднойчы самі сустрэліся па-за межамі «тата-школы», — смяецца Аляксандр. — Для мяне асабіста гэтыя заняткі падкрэслілі важнасць існавання дыялогу ў сям'і. Кожны павінен гаварыць столькі ж часу, колькі і слухаць. Роўнакаштоўны штодзённы дыялог — гэта пэўная работа, але праз гэта людзі не аказваюцца ў вакууме сваіх жаданняў і надуманасцяў. Думаю, я стаў больш ураўнаважаным, не такім эмацыйным, як раней, калі спяшаўся бегчы і адразу рэалізоўваць усё, што спадабалася. Запомніў думку, што прагучала на занятках: «Трэба мяняць усё павольна і не рабіць рэзкіх рухаў у сям'і. Гэта павінна стаць не вялікім учынкам, а атмасферай і філасофіяй зносін».

Сям'я Дарковічаў шмат падарожнічае, і пасля «тата-школы» Аляксандр скіраваў гэтую прыхільнасць на карысць дачкі. Ён прапанаваў ёй замест сумных прапісаў пісаць водгукі пра гатэлі, дзе яны спыняліся.

— Да гэтага прыходзілася прымушаць дачку вучыцца па плане, які яна ж сама і складала. Віка ведала, што трэба зрабіць, каб пайсці гуляць. Гэта, вядома, працавала, аднак я бачыў, што дачка не атрымлівала ад гэтага радасці. Прымус — гэта някепска, у прынцыпе, бо дзіця павінна ведаць, што ў жыцці часам прыходзіцца рабіць тое, што не хочацца, — дзеліцца Аляксандр. — Цяпер я бачу, што Віка сапраўды зацікаўлена тым, што робіць. Яна так і задавальненне атрымлівае, і ўрок пісьма адпрацоўвае. Можа нават на вуліцу не пайсці, пакуль не дапіша водгук.

**Для татаў вельмі важна рэгулярна праводзіць час з дзецьмі асобна ад маці, у тым ліку і па-за межамі дома. Чым раней пачынаць рабіць гэта, тым лепш.**

Ёсць у сям'і і свае традыцыі. Калі Віцы споўнілася 4 гады, Дарковічы пачалі праводзіць сямейныя нарады, якія мог склікаць любы член сям'і. Адмовіцца прыйсці нельга. На такіх мерапрыемствах строяцца планы і вырашаюцца пытанні, а галоўнае — гэта вучыць дзіця праяўляць ініцыятыву, упэўнены бацька Вікі.

### Рэцэпта няма, але ёсць разуменне

Яўген Жыулюк пазнаёміўся з дзейнасцю «тата-школ» на адпачынку, зацікавіўся і захацеў стаць лепшым. Тым больш што на той момант ён якраз удзельнічаў у вебінарах, у рамках якіх адбываліся коўч-сесіі па цікавай сістэме «Пяць сфер жыцця»: дзейнічай, камунікуй, жыві, любі і багацей.

— Класічная коўч-сесія — гэта вырашэнне пэўнай праблемы. Табе не кажуць, што рабіць, а накіроўваюць, каб ты сам распрацаваў пэўны алгарытм: зразумеў сітуацыю, ацаніў яе і склаў план дзеянняў па вырашэнні. Прыкладна тое ж самае адбываецца і ў «тата-групах», калі працуюць мадэратар і бацька, — заўважыў Яўген. — Мы практычна ўсё жыццё вучымся, удасканальваем нашу прафесійную частку жыцця, каб забяспечваць сябе і сям'ю. Але часам забываемся на іншыя сферы, бо ў нас няма сямейнай ці бацькоўскай школы.

Падчас заняткаў Яўген злавіў сябе на думцы, што, магчыма, занадта псіхалагічна ціснуў на свайго сына Мішу, выхоўваючы яго. Бацька прапанаваў малому ўспомніць усё, што наабяцана і не выканана, пачаў весці запісы і планаваць сумесныя мерапрыемствы, каб правесці час карысна і цікава.

— Аднойчы мы схадзілі з ім пагуляць у лазертаг. Міша быў адзіным дзіцем сярод дарослых. Адбылося нешта накшталт пасвячэння, калі ён трапіў у дарослы асяродак і стаў там амаль што роўным. Гэта дабавіла яму ўпэўненасці і сталасці. Цяпер мы гуляем раз на тыдзень абавязкова. Для татаў вельмі важна рэгулярна праводзіць час з дзецьмі асобна ад маці, у тым ліку і па-за межамі дома. Чым раней пачынаць рабіць гэта, тым лепш. І жонцы спадабалася, як на мяне паўплывала «тата-школа». Я пачаў рабіць тое, на што раней не звяртаў увагі. Думаю, гэта цудоўны індыкатар выніку заняткаў.

Аляксандр і Яўген настолькі захапіліся ідэяй «тата-школ», што, калі ім прапанавалі схадзіць на заняткі па падрыхтоўцы мадэратараў — вядучых сустрэч, яны пагадзіліся, не раздумваючы. Цяпер Яўген рыхтуецца да сваіх першых заняткаў у новай ролі, а Аляксандр ужо некалькі правёў.

— Абучэнне мадэратара цягнецца ўсё жыццё, бо ў ім сустракаецца безліч сітуацый, што патрабуюць рашэнняў і індывідуальнага разгляду. Вядучы не дае парад і рэцэптаў, як зрабіць, ён накіроўвае, рэгламентуе, дапамагае, і гэта цудоўна, — упэўнены гэтыя бацькі.

Напрыканцы нашай размовы Аляксандр падзякаваў Яўгену за падказку і сказаў, што таксама спытае дачку, што наабяцаў ёй і не выканаў, і складзе спіс. Вось так і дзейнічае «тата-школа».

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by.*



**Нават калі дзеці ў прамым сэнсе садзяцца на шыю, яны ўсё роўна самыя любімыя і натхняюць дарослых на подзвігі.**

**5 ПАРАД АД ТАТАЎ,**
**чым заняцца разам з дзецьмі,**
**каб было цікава, незвычайна і карысна.**

1. Катацца на роліках або роварах.
2. Хадзіць на масаж і ў басейн, лазню.
3. Гатаваць ежу на вогнішчы.
4. Займацца экстрэмальнымі (па ўзросце) гульнямі: пейнтболам, лазертагам, скалалажаннем і іншымі.
5. Глядзець разам добрыя фільмы пра баявое майстэрства з хлопчыкамі, пра маленькіх прынцэс і гаспадынь з дзяўчаткамі.

■ Раіць псіхолаг

# ДЗЕТКІ Б'ЮЦЦА, А БАЦЬКІ ЗЛУЮЦЦА

## Як дапамагчы братам і сёстрам разруліць свае канфлікты

**Для многіх сем'яў сваркі паміж дзецьмі — справа штодзённая і звыклая. Малыя сапернічаюць паміж сабой, скардзяцца адно на аднаго, абзываюцца, б'юцца. Канечне, не ўвесь час. Але бацькам часта хочацца, каб такіх момантаў было як мага менш. Як навучыць дзяцей жыць мірна? З гэтым пытаннем мы звярнуліся да псіхолага.**



Шанцы, што канфлікты будуць працякаць менш агрэсіўна і хутчэй заканчвацца, павялічваюцца ў тых сем'ях, дзе ўвагай не абдзяляецца старэйшае дзіця.

— Часта першынец пакутуе пасля нараджэння брата ці сястры. Вось яшчэ нядаўна ён быў улюбёнцам у сям'і, у яго было столькі прывілеяў, столькі ўвагі, і раптам нараджаецца «сапернік», на якога рэзка ўсе пераключаюцца, — распавядае **Наталля ЛІТВІНКА, псіхолаг Мінскага гарадскога дзіцячага клінічнага псіхіятрычнага дыспансера.** — Важна, каб мама ўдзяляла ўвагу старэйшаму дзіцяці, хоць паўгадзінкі пасядзела з ім, абняла, цалкам належала яму. У гэты час няхай лепш тата ці бабулі, дзядулі пагуляюць з немаўлём.

Нярэдка старэйшым дзецям не давяраюць даглядаць за меншымі. Аднак больш дасканалай будзе тактыка не адмяжоўваць ад догляду за маленькім, а паступова ўцягваць брацікa (ці сястрычку) у клопаты.

— Вядома, гэта павінны быць пасільныя даручэнні. Бо часта бывае, што бацькі ўскладаюць занадта шмат абавязкаў, тады дзіця крыўдзіцца, і могуць быць больш сур'ёзныя канфлікты, — папярэджвае Наталля.

Колькасць сварак можна паменшыць, калі старацца ўлічваць патрэбы і здольнасці кожнага дзіцяці.

**Многіх канфліктных сітуацый можна пазбегнуць, калі прапісаць пэўныя правілы на асобным аркушы і павесіць іх на бачным месцы. Правілы ствараюцца са скаргаў саміх дзяцей: нельга чапаць рэчы без дазволу, не абзывацца, не штурхацца і г. д.**

— Неабавязкова набываць дзецям аднолькавыя цацкі і пачастункі. Зважайце на іх цікаўнасці, узрост, перавагі ў ежы, у выбары пакупак у краме. Потым яны могуць дзяліцца і мяняцца паміж сабой набытым, але акцэнт павінен быць на тое, што кожны мае свой густ і сваю патрэбу. Таксама неабавязкова імкнуцца, каб дзеці займаліся адным і тым жа відам спорту, — раіць псіхолаг.

Звычайна бацькі настойваюць, каб старэйшае дзіця дзялілася з меншым усімі сваімі рэчамі. Аднак у дзіцяці, як і ў кожнага чалавека, ёсць пачуццё ўласнасці, і некаторыя цацкі для яго могуць быць вельмі важнымі. Маленькага можа прыцягваць пэўная машынка з-за яе навізны, ці яркага колеру, а старэйшы будзе сур'ёзна перажываць, што яго рэч можа быць папросту зламана.

— Гэта цалкам нармальна, што нейкія цацкі старэйшага не дазволена браць малодшаму. Можна прыбраць іх у такое месца, дзе ён іх не бачыць. А са старэйшым абмяркаваць, якімі цацкамі ён бы хацеў падзяліцца, можа штосьці яму ўжо не цікава. Мэтазгодна выкарыстоўваць сказы — «давай навучым малога, ён яшчэ не ўмее, дапамажы яму».

І ўсё ж, зусім абысціся без канфліктаў дзецям, асабліва дашкольнага ўзросту, амаль немагчыма. Дык што рабіць бацькам, калі сварка ўсё ж успыхнула і разгарэлася. Зразумела, што ў сам крытычны момант дзяцей трэба развесці і супакоіць. А вось далей роля дарослага не ў тым, каб вырашыць, хто мае рацыю, а хто вінаваты, а ў тым, каб навучыць сваавольнікаў вырашаць свае канфлікты самастойна.

— Спытайцеся ў дзяцей, ці разбяруцца яны самі, а калі ўсё ж дапамога патрэбна, выслухайце адзін і другі бок, і хай яны самі прапануюць варыянты вырашэння праблемы. Можна расказаць нешта са свайго досведу, як наступны раз дзейнічаць больш канструктыўна.

У школьным узросце пра канфлікты ў асноўным размаўляюць, а калі дзеці яшчэ дашкольнікі, добра разраджае канфліктную сітуацыю гульня.

— «Так, мае тыграняты разбесяліліся, раззлаваліся, давайце зараз парыкаем разам: «рррррррр». Альбо — «хто больш за ўсіх злуецца, а ну патупалі ножкамі, паперку скамячылі, выгналі Злючку, вось якая Злючка ў мяне, а твая да каго падобная?» — прыводзіць прыклады Наталля Літвінка. — Альбо такая гульня, калі хочацца, напрыклад, паабзывацца. Кідаеш мяч і называеш садавіну альбо гародніну: «ты радыска, а ты пятрушка, а ты гарбуз». Адбываецца легалізацыя гневу ў прымальнай і смешнай форме.

Многіх канфліктных сітуацый можна пазбегнуць, калі прапісаць пэўныя правілы на асобным аркушы і павесіць іх на бачным месцы. Правілы ствараюцца са скаргаў саміх дзяцей: нельга чапаць рэчы без дазволу, не абзывацца, не штурхацца і г. д. Можна іх прыгожа аформіць, праілюстраваць.

Калі дзіця пакрыўдзілася, прапануйце яму намаляваць сваю крыўду, злосць, потым яе разарваць і выкінуць. Псіхолагі раяць завесці спецыяльную шкляначку для крыкаў, таксама адмыслова аформленую. Хочацца дзіцяці пакрычаць, паабурацца, няхай возьме яе і пракрычыцца туды як след.

**Важна, каб мама ўдзяляла ўвагу старэйшаму дзіцяці, хоць паўгадзінкі пасядзела з ім, абняла, цалкам належала яму. У гэты час няхай лепш тата ці бабулі, дзядулі пагуляюць з немаўлём.**

— Калі дзіцяці не хапае актыўнасці, яно недастаткова рухаецца, бацькі часта скардзяцца, што павышаецца вербальная агрэсія: абзывалкі, крыкі, плаксівасць. Трэба дапамагчы скінуць эмоцыі. Для гэтага — пабольш практыкаванняў з мячом, можна дроцікі кідаць, штосьці ляпіць.

Пакаранняў за дрэнныя паводзіны па магчымасці трэба пазбягаць. Але бываюць моманты, калі яно неабходна. Рабіць гэта трэба таксама з розумам.

— Відавочна, што ніякіх фізічных пакаранняў ужываць нельга, — кажа Наталля Літвінка. — Глупства таксама караць дзяцей працай у доме. Лепш за ўсё вымушанае лайдацтва: пасадзіце сваавольніка на крэсла, на тэрмін 1-2 хвіліны, памножаныя на яго ўзрост. Гэтага будзе дастаткова для маленькіх дзяцей.

Для старэйшых добра працуе пазбаўленне заахвочванняў і прывілеяў. Варта памятаць, што любы метад пакарання дзейнічае тым лепш, чым радзей ён прымяняецца. Пры частых пакараннях дзеці становяцца хлусівымі, у іх з'яўляюцца страхі, агрэсія.

**Алена ХУРС**

■ Вазьму твой боль...




# МЕТАД ШТУРШКА

Я НАКРЫЧАЛА на маці хворай дзяўчынкі. Цяжка хворай дзяўчынкі, якая лечыцца ў Цэнтры дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі. Я выплеснула на яе сваё абурэнне і негатыў. Спачатку пашкадавала, што сарвалася. Але жыццё паказала, што такі штуршок быше карысным. Нават для маці хворай дзяўчынкі.

«Клуб 5000» дапамагае малазабяспечаный іншагароднім сям'і аплачваць жыллё на час лячэння у Бараўлянах. Аплату валанцёры ўносяць у пэўны дзень. Згодна з умовамі дагавора, аплата праводзіцца кожны тыдзень. І штораз нам трэба знайсці вольнага чалавека, які сярод працоўнага дня гатовы ехаць на край горада і аплачваць пражыванне хворага дзіцяці.

Раніца. Я толькі што адвяла свайго двухгадовага сына ў садок. Трэба сказаць, што ходзіць ён туды з боем. Кожную раніцу слёзы льюцца ад ложка да парога групы. Мне даводзіцца адрываць яго ад сябе, каб перадаць выхавальніцы. А потым маці трэба прыйсці ў сябе, каб заняцца справамі. Набіраю ванну. Спрабую супакоіцца і ўзнавіць энергію. А пачуццё віны атакуе з розных бакоў, у мяне з ім пакуль неразрыўная сувязь. І тут званок ад незнаёмага абанента.

— Чаму дагэтуль не ўнесеная аплата?

Я не адразу разумею, хто і пра што гаворыць. Але відавочна адчуваю, што гэта прэтэнзія. Хутка ўцямліваю і звязваю. Гэта маці той хворай дзяўчынкі. Я пытаюся, чаму яна размаўляе такім тонам, быццам я нешта ёй абавязаная. Тлумачу, што гэта не клопат — сачыць за датамі і нагадваць за пару дзён да аплаты. Расказваю, што дабрачыннасць для нас не работа і што ў кожнага валанцёра ёсць асноўны занятак, які дапамагае зарабляць грошы, што ў нас ёсць свае сем'і і клопаты. Дайшла да галоўнага: паўгадзіны таму я з боем здала свайго сына ў дзіцячы садок, каб заняцца дапамогай яе дачцэ. Але гэта было ўжо занадта. І, па сутнасці, гэта мой, а не яе, выбар. Я спынілася і папрасіла прабачэння. Агаломшаная маці таксама выбачылася і прызналася, што проста спалохалася, што яны з дзіцем застануцца на вуліцы.

**Я бываю іранічнай, жорсткай, тыранам ці тролем, магу браць чалавека на «слабо!» з адной толькі мэтай — разварушыць яго, прымусіць даказаць, што ён можа.**

ЧАС ад часу метад штуршка спрацоўвае на маіх знаёмых і блізкіх. На людзей гэта дзейнічае, як ледзяны душ. Шок выводзіць са стану бездапаможнасці і прымушае рухацца. Я бываю іранічнай, жорсткай, тыранам ці тролем, магу браць чалавека на «слабо!» з адной толькі мэтай — разварушыць яго, прымусіць даказаць, што ён можа.

У студэнцкія часы мая суседка па пакоі Жэня ўвесь час сядзела на ложку, закруціўшыся ў коўдру. Яна не ведала, чым заняць сябе, і крыўдавала на ўвесь свет... Аднойчы мне надакучыла назіраць, і я пачала ўслых распісваць, якое нікчэмнае жыццё праходзіць побач са мной. Рэакцыя была хуткай, але нечаканай. Жэня раскусіла мой намер разварушыць яе і ціха сказала: «Са мной такія штукі не працуюць. Я яшчэ больш пакрыўджуся на ўвесь свет, яшчэ менш стану любіць сябе і канчаткова знікну пад гэтай коўдрай».

Я пераехала ў іншы пакой. Гэта таксама быў план. Ажывіць Жэню, прымусіць дзейнічаць, разабрацца ў сабе. Але яна палічыла мой учынак здрадай. І мы пасварыліся.

Праз нейкі час зноў сталі сябраваць. Не, не зноў, а па-новай. Наша сяброўства стала куды больш адкрытым і моцным, чым у той перыяд, калі мы жылі разам, замоўчвалі прэтэнзіі і назапашвалі крыўды. Мы сябруем ужо 13 гадоў і цяпер можам крытыкаваць адна адну без крыўд і няёмкасцяў.

Жэня знайшла сваю нішу, заквітнела, робіць поспехі на зайздрасць нядобразычліўцам. «А хто б мог падумаць? Паглядзі, як людзі мяняюцца», — адзначаюць агульныя знаёмыя. Яна сапраўды можа ганарыцца сабой. І я ганаруся ёй.

РАСКАЖУ яшчэ адну гісторыю, дзе я была па іншы бок барыкад. Так часта бывае: метад, які ты адпрацоўваеш на іншых, складана прымяніць на сабе.

Усё той жа студэнцкі інтэрнат. Я ў дэпрэсіі. Закінула вучобу, а потым перастала ўставаць з ложка. Ужо некалькі дзён гляджу ў столь і ні з кім не размаўляю. А ў галаве выспеў план — забраць дакументы з БДУ і паехаць чэзнуць у свай Краснаполлі. У думках я развітваюся са сталічным жыццём, якога так прагнула, з новымі сябрамі, інтэрнатам і суседкамі па пакоі. Яны ж вырашылі ратаваць мяне. Маімі метадамі. Выклікалі на размову і паведамілі, што больш не жадаюць назіраць напаўжывую істоту. І я ім: «Пацярпіце яшчэ крышачку». А сама ведаю, што ўжо з'еду назаўсёды. І ў адказ чую строгае: «Гэта ты пацярпі! І будзь ласкавай пакінуць свае праблемы. Ты не адна тут жывеш». Яны ж не здагадваліся пра мой план. Разварушвалі, «абдавалі ледзяным душам», праводзілі шокавую тэрапію. Але гэтыя словы — і сёння ў вушах. «Гэта ты пацярпі...»

Дадому я з'ехала без развітання, так і не раскрыўшы свой план. Цэлы месяц штодня прымушала сябе ўставаць з ложка, нешта рабіць, працягваць жыць. І раптам унутраны голас сказаў: «Ты, ануча, сабралася і паехала назад! Ты пакараеш сталіцу. І яна пакарыцца табе толькі тады, калі перастанеш быць анучай!» Метад штуршка спрацаваў. Я села ў аўтобус, які праз шэсць з паловай гадзін даставіў мяне ў новае жыццё.

...НЕ ВЕДАЮ, наколькі своечасова прагучала шокавая тэрапія для маці хворай дзяўчынкі, ці мела я права навышаць на яе голас і як моцна пакрыўдзіла. Але яна стала старанна, за некалькі сутак, нагадваць пра дзень аплаты. А сёння патэлефанавала, каб сказаць, што іх з дачкой адпускаюць на тыдзень дадому. Маці дамовілася з гаспадыняй плацiць толькі за тыя дні, што яны знаходзяцца ў мінскай кватэры і жыллё не здадуць нікому іншаму, пакуль іх няма. Яна паклапацілася пра грошы. Не свае — дабрачынныя. Хацела, каб мы менш трацілі на іх. І паабяцала вярнуць усё да капейкі, калі дзяўчынка выздаравее і дапамога больш не спатрэбіцца.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА,**
**заснавальніца дабрачыннага руху**
**«Клуб 5000»**

■

# «МЫ НЕ МАЕМ ПРАВА БАЯЦЦА»







Фота Канстанціна ДРОБАВА.

## Пра акардэон, крылы анёла і манастыр

**Задоўга да нараджэння Ільюшы** я вучылася ў кансерваторыі. І пісала дыпломную работу пра тое, як музыка дапамагае наладжваць камунікацыю. У бібліятэцы ў рукі выпадкова трапіла кніга па псіхалогіі, дзе апісваўся аўстрыйскі вопыт працы з дзецьмі з аўтызмам. Мяне, музыканта і будучага педагога, зацікавіла гэтая тэма. Захацелася паглыбіцца ў яе, больш дазнацца. Не ведаю, як гэта можна патлумачыць... Магчыма, Бог паступова рыхтаваў мяне да больш сур'ёзнага іспыту.

**Старэйшая дачка падрасла,** і нам з мужам захацелася другое дзіця. Так з'явіўся Мішка. А затым — Ілья. Калі дактары сказалі «ў вашага дзіцяці аўтызм», я не паверыла. А рэальна проста не бачыла. Ільюшка развіваўся лепш за старэйшых. Ён пайшоў раней, сеў раней. Ужо ў 6 месяцаў стаў паўтараць словы. А ў 1,5 года шчоўк — і ўсё знікла. Мішка наш таксама позна загаварыў, толькі ў 4 гады. Таму я чакала, што калі Ільюшку споўніцца 4, ён таксама загаворыць. А ў 3,5 нам сказалі, што гэтага не будзе. Сказалі-адрэзалі. Можа, гэта і правільна — гаварыць бацькам адразу горкую праўду? Але, каб не пакідаць надзеі... Не ведаю...Гэта вельмі балюча.

**Мне давялося зрабіць выбар** на карысць Ілы, звольніцца з педуніверсітэта. Гэта было няпроста. Праца, калектыў — усё мне было даспадобы. Я не ўяўляла сябе ў якасці хатняй гаспадыні.

**Неяк нехта са знаёмых сказаў:** «Які ж ты музыкант, калі не трымаеш акардэон у руках». Я гэта разумела, але нічога не магла з сабой зрабіць: падыходжу да інструмента — і рукі быццам бы не мае. Але аднойчы здарыўся цуд! Я ўбачыла, як Ільюха глыбока сапе, але цягне на сабе акардэон. Гэта быў знак. Гледзячы на сына, адчула, што за ім былі расхінутыя вялікія анёльскія крылы. У той момант я зразумела, што не магу страчваць сябе.

**Калі было адчуванне, што зайшла ў тупік,** прыйшоў сябар нашай сям'і і прапанаваў: «А паехалі разам у паломніцтва, у Пачаеўскі манастыр». Менавіта там, падчас гутаркі з манахам для мяне нешта адкрылася. Мітусня, думкі, перажыванні... Ён мяне выслухаў і кажа: «Табе трэба займацца дабрачыннасцю». Мне адразу стала настолькі ўсё зразумела!.. Вярнулася дадому і адразу ж стварыла разам з 25 мінскімі бацькамі арганізацыю «Дзеці. Аўтызм. Бацькі». А літаральна праз месяц у нас было больш за 100 сяброў з усёй Беларусі. Як гэта назваць, калі не блаславеннем неба.

## Пра мужа-героя, «паўтарай за мной» і Мішкавы пачастункі

**Зараз з Ільюшкам знаходзіцца мой муж.** Ён пастаянна мяне падтрымлівае, падмяняе. Мне з мужам пашанцавала. Ён — сапраўдны герой. Яму чым больш адказнасці, тым лепш. Памятаю, калі з'явілася Насця, Дзіма стомлены прыбягаў на абед з работы. Замест таго, каб паесці, браў каляску і ішоў гуляць. Тое ж самае было і з Мішкам. Калі з'явіўся Ільюшка, паўсталі пэўныя цяжкасці. Але яны яшчэ больш з'ядналі нашу сям'ю, зрабілі нас дабрэйшымі, глыбейшымі і мудрэйшымі.

**Найбольш складана было першыя пяць гадоў.** Ілья практычна не спаў ноччу, бегаў па кватэры, капрызіў. Суседзі па пад'ездзе не рабілі мне заўваг. Але я пастаянна была ў напружанні. Таму ў адзін цудоўны дзень угаварыла мужа паехаць усёй сям'ёй на Браслаўскія азёры. Мы знялі домік на хутары побач з возерам. Ільюшка змог бегаць басанож і крычаць, колькі яму заўгодна. І зноў здарыўся цуд. Ілья заснуў у першую ж ноч і праспаў да самага ранку. Літаральна за некалькі дзён на прыродзе яго алергія, якая нас замучыла, раптам знікла. Ён стаў есці практычна ўсё. Пайшлі першыя гукі, словы. Такога выніку за два тыдні мы не чакалі. Таму, як толькі вярнуліся з адпачынку, пачалі шукаць дамок за горадам.

**Я зразумела і прыняла, што маё дзіця не такое, як я чакала.** Яно ж не вінавата, што я чакала іншага. А яшчэ, дзякуючы сыну я зразумела, што ніхто і нішто ў гэтым жыцці нам не належыць. І дзеці — гэта не ўласнасць бацькоў, трэба паважаць іх асаблівасці і права на асабістую свабоду. Усе людзі розныя, і ва ўсіх розная ступень свабоды. Але для ўсіх патрэбныя роўныя ўмовы.

**Без Ілы, напэўна, не было б многіх якасцяў і ў старэйшых дзецях.** У іх з Мішкам невялікая розніца ва ўзросце, менш як 2 гады. Таму з дзяцінства яму давялося ездзіць з намі па спецыялістах. Ілья не ішоў на кантакт. А Міша падыходзіў, павярочваў галаву брата і гаварыў: «Паўтарай за мной». Ён стаў першым праваднiком... Міша дапамагаў мне карміць Ілью, рабіць гімнастыку, мяняць памперсы... І цяпер дапамагае: пячэ дабрачыннае пячэнне. У нас нават брэнд з'явіўся «Мішкавы пачастункі».

**А пачалося ўсё з бліноў.** Як цяпер памятаю, мы з мужам размаўлялі ў пакоі, а Мішка ў гэты час нешта рабіў на кухні. Прыходзіць і кажа: «Вы доўга тут сядзець будзеце? Хадзем есці». Мішку тады было гадоў 8. Таму мы паставіліся да гэтага запрашэння, як да дзіцячай гульні. Прыходзім на кухню, а на стале... Я ў жыцці такой (!) колькасці бліноў не бачыла. Цеста, напэўна, заканчвалася, а натхненне ніяк.

**Пасля гэтага ён навучыўся пячы печыва** і, напэўна, паўгода бегаў: «Мама, давай маё печыва прадаваць. Я хачу дапамагаць свайму брату». Мне тады ў галаву не прыходзіла, як можна печыва прадаваць. Пакуль на пазамінулыя Каляды нас не запрасілі ў Купалаўскі музей Алена Масла. Яна вырашыла разам са сваімі сябрамі — пісьменнікамі і мастакамі — зладзіць дабрачынную акцыю для дзяцей з аўтызмам. Мы вырашылі, каб стварыць утульнасць, прынесці з сабой гасцінцы. Прыходжу дадому і кажу Мішку: «Пайшлі печыва наробім». А ён у адказ: «Гэта маё печыва. Я сам буду яго пячы». На наступны дзень у музеі ён раздаваў усім сваё дабрачыннае печыва. Алена падыходзіць да яго: «О, а што гэта ў нас тут? Мішкавы пачастункі?». Тады я зразумела, што Мішку трэба дапамагаць.

**Мы чамусьці гаворым толькі пра дзіця-аўтыста.** І часта не бачым, якая вялізная праблема — яго браты і сёстры. Часта яны баяцца, саромеюцца і не ведаюць, што з гэтым рабіць. Я была ў Стакгольме, дык вось там да работы з дзецьмі з аўтызмам падыходзяць комплексна. Усё пачынаецца з псіхалагічнай дапамогі сям'і. Бяруць пад апеку не толькі бацькоў, але і братоў і сясцёр... Я глядзела на гэта і плакала. Гэта столькі радасці, столькі шчасця, калі ўся сям'я разам не таму, што трэба, а таму, што цікава. Вось чаму наш дабрачынны праект «Мішкавы пачастункі» будзе мець працяг.

## Пра суседзяў, ганьбу і чароўную таблетку

**Важна, каб мама і тата зразумелі,** што дзіця з аўтызмам для чагосьці Бог даў ім. Менавіта ім. Таму важна навучыцца быць з асаблівым дзіцем шчаслівымі і пры гэтым не страціць сябе. І трэба рабіць усё, каб стан палепшыўся. Гэта вельмі залежыць ад адносінаў да дзіцяці. Калі яно адчувае, што прыносіць радасць і шчасце, то шанцаў на тое, што яго стан палепшыцца, значна больш.

**Інклюзія — вось адзіная чароўная таблетка ад аўтызму. Колькі гадоў спатрэбіцца нашаму грамадству на пераасэнсаванне гэтага, не ведаю...**

**У нас жа многія бацькі настолькі пагружаюцца ў праблему,** сядзяць дома, ім там камфортна. «Навошта нам трывожыць наваколных. Навошта сябе некамфортна адчуваць». Але мы ж не вечныя. А што далей? Асаблівых дзяцей трэба навучыць жыць. Калі ты адзін — то вельмі складана. З аўтызмам, я гэта ўжо зразумела, у адзіночку не справіцца.

**Праблема бацькоў дзяцей-аўтыстаў** у тым, што яны не вераць, што іх сын (ці дачка) можа стаць самастойным. Мы павінны, вобразна кажучы, расціснуць рукі, дазволіць дзецям праявіць сябе, давяраць ім нейкую справу. Галоўнае ў выхаванні — перастаць баяцца. І не ставіць кляймо на асаблівасцях. Яны маюць на іх правы. Як мы пададзім гэта дзіцяці, так яно і будзе сябе адчуваць.

**Аўтызм — гэта не разумовая адсталасць,** з інтэлектам там усё нармальна. Важна той стан не паглыбіць. Колькі можна гаварыць, што важна адмовіцца ад медыкаментаў? Катэгарычна! Я бачыла дзяцей з аўтызмам, якім колюць уколы, даюць таблеткі. Гэта страшна. Там ідуць незваротныя працэсы. Гэтаму дзіцяці лепш не становіцца. Яму становіцца горш. І ўся сям'я яшчэ ў большы разлад трапляе. Гэта бяда. Інклюзія — вось адзіная чароўная таблетка ад аўтызму. Колькі гадоў спатрэбіцца нашаму грамадству на пераасэнсаванне гэтага, не ведаю...

**Нашы маці часта расказваюць,** як яны атрымалі чарговую заўвагу ад цёткі на вуліцы. Маўляў, «чаго ваш тут крычыць. Вы яго дрэнна выхоўваеце, я вам зараз раскажу, як трэба». Мала таго, што ў дзіцяці праблемы і табе трэба з гэтым спраўляцца, дык ты яшчэ з усіх бакоў атрымліваеш неадабрэнне.

**Пасля таго, як суседзі ўбачылі нас з Ільёй па тэлевізары,** дзе мы расказалі сваю гісторыю, падышлі і сказалі: «Мы ведаем, што ў вас такая праблема. Можа, вам патрэбна нейкая дапамога?» Вось дзе была неймаверная падтрымка. Бо паказваць сваімі паводзінамі, што гэта натуральна — адно. А атрымаць зваротную сувязь, падтрымку — зусім іншае. Гэта дарагога каштуе.

**У нашай сям'і не было такога, што ў нас Ілья «нейкі не такі».** І трэба, каб сядзеў дома і не ганьбіў нас. Але такіх выпадкаў дастаткова. Адна жанчына расказвала, што хацела паехаць на вяселле — але не змагла. Бо сказалі: «Ты нашага не вязі, мы ж не павінны абняславіцца перад той раднёй». І гэта дастаткова інтэлігентная сям'я. Як так можна?

**А хто ў гэтай сітуацыі думае пра дзіця?** Пра тое, што ён перажывае, пра яго жаданні, патрэбнасці. Бачаць, што ён сядзіць схіліўшы галаву. Вядома, цяжка дастукацца, зразумець... Але разуменне — гэта галоўнае, што ім патрэбна. І, як паказвае досвед, зразумець іх не складана. Было б жаданне.

## Пра Біла Гейтса, мурашак і новае жыццё

**Важна, каб перад вачыма быў staноўчы прыклад.** Вось Соня Шаталава, у яе складаны дыягназ. Ставілі на ёй крыж. І раптам у 8 гадоў дзяўчынка пачала пісаць вершы. Там такія алегорыі, такія глыбіні, такая філасофія. Калі чытала ўпершыню, у мяне мурашкі па целе пабеглі.

**Гісторыі паспяховых людзей з аўтызмам** мяне спачатку шакавалі. Думала, няўжо на гэтым можна іграць. І Эйнштэйн, і Вудзі Ален, і Біл Гейтс. Дзе іх аўтызм? Пасля, калі паехала ў Швецыю, Амерыку, убачыла, як працуюць з такімі людзьмі. І не толькі з дзецьмі. Аказваецца, і з дарослымі можна працаваць, і нават у 20 гадоў пры правільных падыходах адбываюцца неверагодныя рэчы. Людзі, якія наогул не гаварылі, пачынаюць гаварыць, якія нічога не маглі рабіць, працуюць з керамікай, іграюць у тэатры, аркестры. Гэта мяне натхніла, я зразумела, што выйсце ёсць.

**Я ганаруся камандай** спецыялістаў, што працуюць у мінскай школе № 187. Калі б іх не было, наўрад ці атрымалася б адкрыць класы, дзе разам са звычайнымі дзецьмі вучацца іх аднагодкі з аўтызмам. Гэта яшчэ толькі першыя крокі. Мы робім усё магчымае, каб у Беларусі з'явілася больш спецыялістаў. Тым больш што да нас сёлета ўпершыню прыйшлі старэйшыя дзеці з аўтызмам. Інклюзія ў школе працуе. Я бачу гэта па сваім Ільюшу. Ён пайшоў у першы клас вельмі складаным дзіцем. Цяпер жа піша, чытае, лічыць, і нават крыху пачаў гаварыць.

**Сямейны тэатр —** першы наш крок у новае жыццё. А тое, што на сцэну прыйшлося выйсці... Нечакана было. Мне сказалі: «Пойдзеш. А як жа дзіця без цябе!»

**Перад выхадам на сцэну ў Ілы была істэрыка.** Так атрымалася, што ён першы раз убачыў свой касцюм за дзень да прэм'еры. І наадрэз адмовіўся яго апранаць. Я была ў разгубленасці. Ідзём-ідзём, здаецца ўсё пераадолелі... і вось зноў усё спачатку. Вечарам Ілья расстроены ўткнуўся ў падушку носам. Саджуся перад ім і пачынаю расказваць кароткімі фразамі: «тэатр — ты малайчына — Сонечны Праменьчык — соле міа — сцэна»... Гляджу — вочы расплюшчваюцца, і так яму гэта цікава. Пасля нашай размовы мне здаецца, што ён прама чакаў заўтрашняга дня.

**Дзеці з аўтызмам могуць значна больш, чым ад іх чакаюць. Але могуць там, дзе ў іх вераць, даюць такую магчымасць. А не там, дзе не разумеюць, што з гэтым рабіць, баяцца...**

**Пакуль ішоў спектакль, мы з Ільюшам сядзелі** ў асобным пакойчыку за кулісамі. Я яму паказвала касцюм, паўтарала «ты малайчына». Калі адчыніліся дзверы і пачулася «вам хутка выходзіць», Ілья падскочыў і з такім азартам пачаў апранацца. Я ледзь стрымала слёзы радасці. Гэта вельмі кранальна, назіраць за зменамі, якія адбываюцца з нашымі дзецьмі. Тут жа не толькі Ільюша. У нас ёсць Максім, Мішка, Кастусь... Такой сацыялізацыі, такога інтэнсіву, школы жыцця цяжка прыдумаць.

**Дзеці з аўтызмам могуць значна больш,** чым ад іх чакаюць. Але могуць там, дзе ў іх вераць, даюць такую магчымасць. А не там, дзе не разумеюць, што з гэтым рабіць, баяцца... Не маем мы права баяцца! Няма сэнсу ў гэтым страху!

**Сёння, перад нашай сустрэчай, адбыўся яшчэ адзін цуд!** Чую, што нехта іграе на фартэпіяна. Спачатку падумала, што Мішка. Ён часта садзіцца і нешта прыдумвае. Аклікнула яго, а Міша ў адказ з-за спіны шэптам: «Мама, тсс..., я — тут. Гэта Ілья імправізуе».

**Наступны спектакль, раскрыю маленькі сакрэт, будзе пра аўтызм.** Ён ужо напісаны. Пакажам яго, думаю, у красавіку. А пакуль праедзем з «Флейтай-чарадзейкай» па ўсіх абласных цэнтрах. Я зразумела адно — важна не спыняцца. Няхай тэатр будзе проста хобі, але калі гэта яшчэ стане і прафесіяй... Хто ведае... Мы ж бачым, як нечакана раскрываюцца нашы дзеці.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК. dryla@zviazda.by

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

# ЭКАЕЖА З ГРАДКІ

## БУЯКІ БЕЗ «ХІМІІ»

Праехаўшы невялікую вёсачку Дашкі Мінскага раёна, спыняемся каля веснічак. Нас сустракае Віталь, а ў доме ўжо чакае яго жонка Алена.

У гэтай гаспадарцы ўраджай атрымліваюць круглы год. Градкі з клубніцамі выглядаюць незвычайна: яны спецыяльна пакрыты саломай, слой мульчы захоўвае ў глебе вільгаць, аберагае пасадкі ад лішняга сонца. У цяпліцы спее вінаград. Тут вырошчваюць і вострыя травы — бергамот, мелісу, мяту. Ёсць агародніна на любы густ: розныя віды капусты, ліставой салаты, радыскі. Але галоўны гонар гаспадаркі — буякі: доўгія ланцужкі градак цягнуцца па схілах даліны. Фіялетавая ягада ўпрыгожвае і лагатып «СідСад».

Гледзячы на дом, цяпліцу, гараж, будучую лазню, цяжка паверыць, што пяць гадоў таму ўсё пачыналася са старога будаўнічага вагончыка. Алена і Віталь даўно хацелі набыць уласную зямлю. Муж з жонкай прызнаюцца, што іх заўжды цягнула да прыроды — у Мінску яны аблюбавалі прыватны сектар, пасля набылі лецішча каля Браслаўскіх азёраў. Затым вырашылі стаць сапраўднымі фермерамі. У Мінскім райвыканкаме Сідаравым прапанавалі толькі адзін участак у 40 га ў вёсцы Дашкі (пасля выявілася, што гэта радзіма Віталёвай маці). Зачараваныя тутэйшымі мясцінамі Алена і Віталь спачатку нават не звярнулі ўвагі на недахопы ўчастка. На самай справе сям'і давялося падымаць яго ледзь не з нуля: зямля зарасла пустазеллем і не магла пахваліцца ўрадлівасцю, месцамі дзікі раскапалі ямы амаль па пояс. Пакрысе Сідаравы прывялі ўчастак да ладу. Апошнія 10 гектараў аднавілі толькі летась.

На новым участку вырошчвалі вострыя травы, агародніну, зяленіва. Затым фермеры заўважылі, што ўсе «хімікаты», якімі апрацоўвалі пасадкі, сцякаюць у вадаём, адкуль сям'я бярэ ваду. Алена кажа, што яны літаральна дыхалі «хіміяй». Тады муж і жонка ўсур'ёз задаліся пытаннем: навошта ім гаспадарка, якая шкодзіць здароўю? У той час Алена і Віталь пазнаёміліся з украінскім прафесарам, які вырошчваў буякі арганічным спосабам. Ён расказаў пра альтэрнатыву традыцыйнай гаспадарцы.

— Прафесар запэўніваў нас, што вырасціць добрыя буякі можна, не выкарыстоўваючы мінеральных угнаенняў. Мы вырашылі паспрабаваць, — кажа Алена.

Падчас паездкі ў Галандыю Сідаравы ўбачылі і пакаштавалі арганічныя буякі. Ягады спадабаліся ім настолькі, што, вярнуўшыся ў Беларусь, фермеры сталі вучыцца іх вырошчваць.

## З ІХ ПРЫЕЗДАМ ВЁСКА АЖЫЛА

Два гады таму Алена і Віталь атрымалі ад літоўскай кампаніі бясплатную сертыфікацыю сваёй гаспадаркі. Раз на год у «СідСад» прыязджаюць эксперты-праверальшчыкі. Ім прадастаўляюць звесткі па ўсіх работах, якія праводзяцца на ўчастку. Спецыялісты правяраюць, якія прэпараты і ўгнаенні ўносяцца ў зямлю, ці адпавядаюць яны еўрапейскім нормам. Праверка даволі сур'ёзная: эксперты могуць выкрыць нядобрасумленных гаспадароў, паглядзеўшы на «асартымент» пустазелля, якое расце на градках. Альбо выдзерці расліну з зямлі і вызначыць па карані — прымянялася ў гэтым выпадку «хімія» альбо не. Калі ўзнікаюць сумненні, прызначаецца праверка ў лабараторных умовах. Фермера, які карыстаўся забароненымі прэпаратамі, могуць прыцягнуць нават да крымінальнай адказнасці. Праўда, толькі ў Еўропе — у Беларусі закона па арганічнай сельскай гаспадарцы пакуль няма.

**Фермеры заўважылі, што ўсе «хімікаты», якімі апрацоўвалі пасадкі, сцякаюць у вадаём, адкуль сям'я бярэ ваду. Тады муж і жонка ўсур'ёз задаліся пытаннем: навошта ім гаспадарка, якая шкодзіць здароўю?**

— Часта даводзілася чуць, што вырасціць экалагічна чыстыя буякі немагчыма. Але мы знайшлі беларускія прэпараты, якія падыходзяць па патрабаваннях сертыфікуючай кампаніі. Азотныя ўгнаенні замянілі ўгнаеннямі на аснове птушынага памёту. Даводзіцца часцей праполваць градкі — наймаць людзей, што нават даражэй, чым хімічныя сродкі барацьбы з пустазеллем, — расказвае Алена.

— У традыцыйнай гаспадарцы для хуткага росту ягад дабаўляюць серу і хімікаты.


У 53 гады Віталь атрымаў пасведчанне на кіраванне трактарам.

**Арганічная і традыцыйная: у чым розніца?**

**Арганічныя фермеры адмаўляюцца ад выкарыстання фунгіцыдаў, гербіцыдаў і антыбіётыкаў. Забаронена карыстацца хуткарастваральнымі мінеральнымі ўгнаеннямі і пестыцыдамі. Яны прымяняюць адходы расліннага і жывёльнага паходжання. Для аднаўлення глебы выкарыстоўваюць севазварот і біялагічныя спосабы аховы раслін. Для арганічнай сельскай гаспадаркі характэрны замкнёны цыкл земляробства-жывёлагадоўлі (расліны даюць корм, жывёлагадоўля — угнаенне).**

Мы ж сыплем торф — словам, ствараем прыродныя ўмовы, — дадае Віталь.

У хуткім часе фермеры плануюць разводзіць «экалагічна чыстых» курэй пароды «дамінанта» і атрымліваць ад іх арганічныя яйкі. Гэтай ідэяй загараўся старэйшы сын Валерый. Падчас нашай размовы ён быў заняты будаўнічымі работамі. Куры будуць вырабляць экалагічна чысты памёт, а толькі такім дазволена карыстацца на арганічнай ферме.

— Мы не можам браць гной ад калгасных кароў, бо яны харчуюцца на палях, апрацаваных мінеральнымі ўгнаеннямі. Не можам арандаваць калгасны камбайн, бо ён убірае калгасныя палі. Нам пашанцавала, што зямля доўгі час стаяла папарам: яе не забрудзілі хімікатамі. Па патрабаваннях сертыфікуючай кампаніі ўчастак не павінен межаваць з калгаснымі палямі. Мы набылі камбайн і трактар, а Віталь у 53 гады атрымаў пасведчанне на кіраванне гэтымі відамі транспарту, — кажа Алена.

Пра ягады Алена і Віталь могуць гаварыць гадзінамі. Падчас гутаркі яны частуюць гарбатай са скрыпеню, які гаспадыня ферментавала сама. На стале — варэнне з буякоў.

— Той, хто каштаваў нашы ягады, становіцца іх аматарам, — заўважае Алена.

Нібыта пацвярджаючы словы жонкі, Віталь дастае чайнік з выявай буякоў, прывезены з ЗША. На стале з'яўляюцца слоікі з сушанымі ягадамі і лісцем дурніц (яны лічацца выдатным антыаксідантам). Чаго толькі не робяць з гэтых ягад — нават віно ды шампанскае!

Дарэчы, сваімі сіламі на ўчастку цяжка ўправіцца, таму Сідаравы наймаюць рабочых. З іх прыездам вёска ажыла — з'явілася работа, да таго ж, муж і жонка аднавілі закінутыя будынкі ў вёсцы. Далучаюцца да працы і сыны, але Віталь, жартуючы, кажа — тыдзень папрацуюць, тры тыдні адпачываюць. Літаральна падчас нашай сустрэчы малодшы сын Прохар загрузіў зяленіва ў машыну і павёз прадаваць. Такім чынам, Алена і Віталь заахвоцілі працаваць на зямлі і сваіх дзяцей.

## ЛЮБЛЮ СВАЙГО ФЕРМЕРА

У любой краме знойдзецца шмат прадуктаў з пазнакамі «эка» і «бія», але ў асноўным гэта не чыстая прадукцыя, а хітрыкі маркетолагаў. Беларускія фермеры мусяць канкураваць з вялікай плынню псеўдаэкалагічных тавараў.

У крамах буякі «СідСада» прадаюцца нароўні са звычайнымі: пакуль гаспадарка знаходзіцца ў пераходным перыядзе, Алена і Віталь не маюць права ставіць на сваю прадукцыю еўрапейскі значок сертыфікацыі. Пасля паспяховага завяршэння гэтага этапу фермеры змогуць пастаўляць ягады, зяленіва і агародніну на еўрапейскія рынкі і прадаваць іх даражэй. Сёння Сідаравы рэалізуюць сваю прадукцыю праз буйныя гандлёвыя сеткі: «Еўраопт», «Белмаркет», «Суседзі», «Рублёўскі».

— Некаторыя арганічныя фермеры рэалізуюць сваю прадукцыю праз інтэрнэт-крамы, але па нашым вопыце відаць: заказаў не хапае. Буйному прадпрымальніку цяжка пратрымацца на адных толькі інтэрнэт-продажах, — адзначае Алена.

Пабываўшы на курсах у ЗША, яна заўважыла адну прыемную тэндэнцыю: амерыканцы аддаюць перавагу мясцовай прадукцыі. Паўсюль у крамах вісяць рэкламныя расцяжкі «Люблю свайго фермера», праводзяцца акцыі. На думку Алены, вельмі важна прадаваць сваю прадукцыю менавіта на беларускім рынку — людзі павінны есці мясцовыя прадукты.

— Мы даволі часта вандруем і заўважаем, што ў Еўропе з года ў год колькасць экапрадукцыі на прылаўках павялічваецца, — дзеліцца назіраннямі жанчына. — Арганічная сельская гаспадарка знаходзіць падтрымку ва ўсім свеце, таму не губляем аптымізму, што хутка яна стане папулярнай і ў Беларусі.

**Кацярына РАДЗЮК.**


Малодшы сын Прохар таксама дапамагае бацькам па гаспадарцы.

Фота Надзеі БУЖАН.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

■ Чалавек — чалавеку

# Яловыя галінкі замест парніка

**Цяжка знайсці таго гаспадара, у якога не было б сваіх «ураджайных» сакрэтаў. Некаторыя прыёмчыкі мы падгледзелі ў суседзяў, іншыя вынайшлі самі ці пачулі ад спадарожнікаў у электрычках, аўтобусах па дарозе на любімыя дачы. Спадарства, не маўчыце! Давайце абменьвацца парадамі ў «Сямейнай газеце». Разам мы такія ўраджаі збяром! І армію шкоднікаў адолеем. А можа, і нарыхтовак найсмачнейшых на зіму паставім? Рэцэптік падкажаце? Ды і праблемы, з якімі самі не ведаеце, што рабіць, не ўтойвайце. Будзем усёй грамадой шукаць, як з імі разабрацца.**

**Сёння мы друкуем парады Соф'і Лісавой, з вёскі Паўлінава Баранавіцкага раёна.**

✓ Усё трэба сеяць у час. Часта першае сонейка прыгрэе, а людзі ўжо спяшаюцца саджаць, нават у сакавіку. Холад возьме сваё. Калі пачатак вясны цёплы, усё роўна пазней быць маразам. Рана ўзыдуць расліны — памерзнуць.

✓ Толькі ўвосень зямлю трэба глыбока заворваць альбо перакопваць на штык рыдлёўкі. А ўвесну перакапайце плыценька. За зіму зямля адсырэе і добра трымае вільгаць.

✓ Няма парнікоў, плёнкі, паўтыкайце вакол раслін яловыя галінкі — лепш браць з дрэўцаў самыя ніжнія, яны шырокія, як веер. Так, сёлета суседка пасадзіла памідоры, абаткнула іх галінкамі. Былі маразы — ва ўсіх бульба і фасоля памерзлі, а яе памідоры сядзяць. Мароз садзіцца на галінкі, акрамя таго такім чынам расада прыцяняецца ад спякотнага сонца і паступова прызвычайваецца да новых умоў.

✓ Калі расліны слабыя ці хварэюць, паспрабуйце апрацаваць «экасілам», важна толькі яго выкарыстоўваць па інструкцыі, у сухое надвор'е і каб ветру не было. Была ў мяне дрэнная расада памідораў, лісце на ёй зжаўцела, сцяблінкі ссінелі. Спачатку хацела выкінуць, але вырашыла паспрабаваць на іх «экасіл» — і расада ажыла. Добрыя пасля былі памідоры.

✓ Кусты памідораў добра апрацоўваць растворам малочнай сыроваткі (літр на вядро вады), а буракі — соллю (сталовую лыжку на вядро вады).

✓ Моркву я ніколі не паліваю, толькі калі ўжо зусім вялікая спякота і яна пачынае вянуць. Калі не паліваць, абрастае барадою і ўглыб не расце. Трэба, каб яна шукала ваду і карэнне выцягвалася ўніз.

✓ Я вырошчваю лекавыя расліны: алтэю, мацярдушку, дзівасіл, жывакост, эстрагон, лаванду, фенхель. Яны дапамагаюць ад розных хвароб. Калі якое карыснае пустазелле завядзецца на агародзе, напрыклад крываўнік, трыпутнік — не выкопваю. Калі парэз, мазоль — прыкладаю лісты раслін — і дапамагае. А сёлета моцна апаліла палец, побач нічога не было — апусціла ў бярозавы сок, і боль суцішыўся ■

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПОВТОРНЫХ ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **ЛОТ №1. Изолированное помещение с инв. №200/D-152157 (наименование – административно-лабораторный корпус, назначение – административное помещение) общая площадь 1911,7 м², стоимостью 2 768 160 000 белорусских рублей** |
| **Собственник (владелец) имущества** | **ОАО «Научно-производственное опытно-конструкторское бюро машиностроения» (УНН 300048064)** |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | **г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81-3А** |
| **Наличие обременений** | **нет** |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | **18.07.2016 в 15.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3** |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, д. 10/1. (www.vitebskjust.gov.by) Судебный исполнитель Зиновенко Олег Олегович, тел. (80212) 61-40-22, моб. +375336879159, начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (80212) 61-40-15 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | **Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:**<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО СБ «Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, **не позднее 15.00 15.07.2016 г.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9** |

**Предмет аукциона**

**Имущество бывшей компрессорной станции Ивацевичи, расположенной по адресу: Брестская обл., Ивацевичский р-н, дер. 2,2 км юго-западнее деревни Холопья, в составе:**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| Здание КЦ-3 | Здание нежилое | 2476 кв.м | 122/С-2251 |
| Составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие, бетонное покрытие, покрытие из плитки, сетчатое ограждение, ворота, ворота | | | |
| Здание проходной КЦ-3 | Здание нежилое | 95,1 кв.м | 122/С-2246 |
| Здание санитарно-бытового корпуса | Здание нежилое | 111,5 кв.м | 122/С-2250 |
| Здание котельной КЦ-3 | Здание нежилое | 276,9 кв.м в т.ч. подвал | 122/С-2248 |
| Здание КТП АВО газа КЦ-3 | Здание нежилое | 145,5 кв.м | 122/С-2249 |
| Здание ЗРУ -10 кВ КЦ-3 | Здание нежилое | 389,9 кв.м | 122/С-2247 |
| Здание КНС КЦ-3 | Здание нежилое | 20,8 кв.м | 122/С-2245 |
| Составные части и принадлежности: подвал, КНС (сооружение): насос фекальный к60/30, задвижка стальная ф50, кран ф50, вентилятор ЦЦ-70 (ВАО-071-4), манометр измерительный. | | | |
| Система грозозащиты КЦ-3 | Сооружение специализированное энергетики | | 122/С-15277 |

**Передаточные устройства**

- внутриплощадочные электросети КЦ-3 с инв. №122/С-15271, назначение – сооружение специализированное энергетики, протяженность – 557 м;
- внутриплощадочные теплосети с инв. №122/С-15270, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, протяженность – 329,9 м;
- внутриплощадочные водопроводные сети КЦ-3 с инв. №122/С-15273; назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения; протяженность – 1624,2 м;
- внутриплощадочные сети канализации КЦ-3 с инв. №122/С-15275, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, протяженность – 302,3 м;

**Оборудование:**

- КНТП промплощадки КЦ-3, инв. № 100000030413
- мостовой кран машзала электрический КЦ-3, инв. № 100000030630
- тельфер электрический машзала КЦ-3, инв. № 100000030649
- кран мостовой ручной КЦ-3, инв. № 100000030631
- таль ручная червячная КЦ-3, инв. № 100000030650
- радиоканальная система передачи извещений «Маяк» КЦ-3, инв. №100000032836

**Начальная цена с НДС 20% – 4 845 000 000 белорусских рублей (снижена на 5%)**
**С учетом деноминации – 484 500 белорусских рублей**

**Сведения о земельном участке**: кадастровый номер: 123400000001000151. Площадь (га): 3,1410.
Категория: земли промышленности, транспорта, связи, энергетики, обороны и иного назначения.
Целевое назначение: земельный участок для обслуживания компрессорной станции «Ивацевичи» (компрессорный цех №3). Участок предоставлен продавцу на праве постоянного пользования.

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012743260072; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012743260098; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | 15 рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предмет аукциона может быть снят с аукциона организатором в любое время до объявления его проданным.

*Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 28.05.2016*

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **11.07.2016 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **08.07.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 422/С-974 (назначение – здание нежилое, наименование – кухня-столовая), площадью 1223,4 кв.м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Авиаторов, 3 |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 425850100004000066, площадью 0,2172 га (назначение – содержание и обслуживание здания кухни-столовой) по адресу: г. Щучин, ул. Авиаторов, 3 |
| **Начальная цена продажи** | 2 425 184 000 (два миллиарда четыреста двадцать пять миллионов сто восемьдесят четыре тысячи) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Начальная цена продажи (действительна с 01.07.2016)** | 242 518,40 р. (двести сорок две тысячи пятьсот восемнадцать рублей сорок копеек) |
| **Сумма задатка** | 121 259 200 (сто двадцать один миллион двести пятьдесят девять тысяч двести) белорусских рублей |
| **Сумма задатка (действительна с 01.07.2016)** | 12 125,92 р. (двенадцать тысяч сто двадцать пять рублей девяносто две копейки) |
| **Продавец** | Щучинский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | Аукцион без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 01 августа 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Щучин, ул. Пушкина,26.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 26 июля 2016 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32, http://grodnoino.by/**

## ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует

В извещение о проведении открытого аукциона по продаже **объектов недвижимого имущества, реализуемых одним лотом, расположенных по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Советская, д. 99**, принадлежащих **ОАО «Грузовой автомобильный парк № 4» г. Барановичи**, опубликованном в газете «Звязда» от 22.06.2016 г., **вносятся изменения:**

**1. Начальная цена с НДС 20%: 2 416 165 700 бел. руб. Снижена на 80%. С учетом деноминации – 241 616 руб. 57 коп.**

**2. Дата, место и время проведения аукциона: 13.07.2016 в 14.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Тельмана, 100, актовый зал, ОАО «Грузовой автомобильный парк № 4» г. Барановичи.**

**3. Дата, место и время окончания приема документов: 12.07.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».**

| | |
|---|---|
| **Контакты** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |

УНП 200167522

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор аукционов:**
**государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62**

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка до/после деноминации. |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №220886009101000120 площадью 0,2446 га по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Опсовский с/с, д. Купчели, участок №4 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (озеро Даубле), охранная зона особо охраняемых природных территорий (Национальный парк «Браславские озера»), расположение в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог. **Нач. цена**: 38 000 000/3 800 бел. руб. **Задаток:** 3 800 000/380 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600312060009 в ЦБУ № 205 филиал № 214 ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 3000594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №220888119101000173 площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Слободковский с/с, д. Муражи, участок №47 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (озеро Неспиш), охранная зона особо охраняемых природных территорий (Национальный парк «Браславские озера»). **Нач. цена**: 20 000 000/2000 бел. руб. **Задаток:** 2 000 000/200 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600312080005 ЦБУ №205 г. Браслав ф-л №214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новополоцк, код 150801660, УНП 300594330, код платежа 04901. Получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 01.08.2016 в 11.00 по адресу: г. Браслав, ул. Советская, 119 в Браславском районном исполнительном комитете. **Срок внесения задатка и приема документов:** 30.06.2016 с 8.30 по 29.07.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Условия аукциона: разработать и утвердить ПСД и разрешение на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; произвести занятие (освоение) зем. участка не позднее 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство жилого дома; до начала строительства снять на зем. участке плодородный слой почвы в местах размещения строений и сооружений и использовать его в соответствии с проектной документацией |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка до/после деноминации. |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №223381712101000029 площадью 0,0934 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Заутьевский с/с, д. Мазурино для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона реки Западная Двина. **Нач. цена:** 30 000 000/3 000 бел. руб. **Задаток:** 3 000 000/300 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3604321030185 ЦБУ 213 ф-ла №214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новополоцк, МФО 150801660, УНП 300070283, код платежа 04901, получатель платежа: Заутьевский сельисполком |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №223383503601000014 площадью 0,1351 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Перебродский с/с, х.Гентово (участок №1) для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона озера Сумовка. **Нач.цена**: 50 000 000/5 000 бел. руб. **Задаток:** 5 000 000/500 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600321070077 ЦБУ №213 ф-ла №214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новополоцк, МФО 150801660, УНП 300070319, код платежа 04901. Получатель платежа: Перебродский сельисполком |
| Лот №3. Земельный участок с кадастровым №223383503601000015 площадью 0,1362 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Перебродский с/с, х. Гентово (участок №2) для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона озера Сумовка. **Нач.цена**: 50 000 000/5 000 бел. руб. **Задаток:** 5 000 000/500 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600321070077 ЦБУ №213 ф-ла №214 ОАО «АСБ«Беларусбанк» г. Новополоцк, МФО 150801660, УНП 300070319, код платежа 04901. Получатель платежа: Перебродский сельисполком |
| Лот №4. Земельный участок с кадастровым №223383503601000016 площадью 0,1338 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Перебродский с/с, х. Гентово (участок №3) для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона озера Сумовка. **Нач.цена**: 50 000 000/5 000 бел.руб. **Задаток:** 5 000 000/500 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600321070077 ЦБУ №213 ф-ла №214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новополоцк, МФО 150801660, УНП 300070319, код платежа 04901. Получатель платежа: Перебродский сельисполком |
| Лот №5. Земельный участок с кадастровым №223383030601000098 площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Новопогостский с/с, д. Снеги для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона озера Укля, охранная зона линий электропередач напряжением свыше 1000В, придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги. **Нач. цена**: 50 000 000/5 000 бел. руб. **Задаток:** 5 000 000/500 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3604321060201 ЦБУ № 213 ф-ла № 214 АСБ «Беларусбанк» г. Новополоцк, МФО 150801660, УНП 300070268, код платежа 04901. Получатель платежа: Новопогостский сельисполком |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 01.08.2016 в 15.00 по адресу: г. Миоры, ул. Дзержинского, 17 в Миорском районном исполнительном комитете. **Срок внесения задатков и приема документов:** с 30.06.2016 с 8.30 по 29.07.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. Условия аукциона: приступить к занятию земельного участка в течение 1 года после получения свидетельства (удостоверения) о гос. регистрации права на него; в месячный срок после получения решения получить в отделе архитектуры и строительства райисполкома АПЗ и ТУ на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства; разработать и утвердить ПСД, приступить к строительству объекта после разработки и утверждения строительного проекта и получения разрешения на производство строительно-монтажных работ |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка до/после деноминации. |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221285904101000222 площадью 0,0921 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Дрекольье, ул. Центральная для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Дрекольское). **Начальная цена:** 16 455 060/1645,51 бел. руб. **Размер задатка:** 1 645 000/164,50 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка**: р/с 3600314090174 в ф-ле №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа Мазоловский сельисполком |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №221284806101000298 площадью 0,1395 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Летчанский с/с, аг. Кировская, ул. Приозерная, участок №5 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (пруд №13). **Начальная цена**: 81 268 800/8126,88 бел. руб. **Размер задатка**: 8 126 000/812,60 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка**: р/с 3600314080100 в ф-ле №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300976663, код платежа 04901, получатель платежа: Летчанский сельский исполком |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 21.07.2016 в 16.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 30.06.2016 с 8.30 по 20.07.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Условия аукциона:** получить техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома, приступить к занятию зем. участка в течение 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство капитального строения, снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона; осуществить строительство в сроки, определенные ПСД. Инженерные коммуникации и сооружения на зем.участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. **Конт. тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

■ Незвычайнае побач

# ХОЧАШ ЗАМУЖ — ПАСЯДЗІ НА КАМЕНІ!

## У Ашмянскім раёне ёсць валун, які прыносіць дзяўчатам шчасце

**«Кажуць, на гэтым месцы пахавана паслушніца, якая шчыра малілася за шчасце маладых кабет у шлюбе». Пра «нявесцін камень» гісторый ходзіць шмат. У яго цудадзейную сілу вераць здаўна. Прыязджаюць да каменя і цяпер: дзяўчаты, якія доўга не могуць выйсці замуж, просяць годнага кавалера, маладыя пары — сямейнага шчасця, а бяздзетныя жанчыны — дачку ці сына.**

### У ахвяру — ручнікі і грошы

Знайсці цудадзейны валун нескладана. На трасе М-7 стаіць указальнік да «нявесцінага» каменя. Прайсці крыху ў гушчар, спусціцца па прыступках у роў — і вось той самы двухметровы ружовы граніт. Навукоўцы мяркуюць, што валун з'явіўся тут 20 тысяч гадоў таму: ледавік прынёс яго з Аландскіх астравоў, што ў Балтыйскім моры.

**«Хто хоча выйсці замуж, мусіць абавязкова пасядзець на камені, а не проста дакрануцца да яго. Гэта «методыка» самая эфектыўная».**

У мясцовых жыхароў камень, відаць, карыстаецца папулярнасцю. На тоненькіх галінках дрэў, што растуць пры валуне, чаго толькі не пакідаюць. Стужкі, ручнікі, рызінкі для валасоў... **Сяргей ЖЫЛІК, метадыст па музеях і ахове гісторыка-культурнай спадчыны Ашмянскага раённага цэнтра культуры,** прыгадвае, як адзін з хлопцаў павязаў каля граніту... шнурок ад красовак.

— Са студэнтамі аграрна-эканамічнага каледжа мы прыходзілі чысціць камень. Адзін з іх якраз з дзяўчынай пасварыўся, вось і вырашыў жаданне загадаць, каб хутчэй памірыцца. А пад рукой нічога іншага, каб павязаць, не было, — з усмешкай расказвае Сяргей Жылік.

Жарты жартамі, але папрасіць патаемнага ў валуна прыязджаюць не толькі беларусы. У плеценым кошычку, што стаіць на версе каменя, апроч нашых пяцісотак і тысяч, ляжаць еўрапейскія цэнты: літоўскія турыстычныя групы сюды часта заязджаюць.

### Прыгажуня з каменным сэрцам

У суседніх Навасёлках пра магічную славутасць ведаюць ледзь не ўсе дзяўчаты. І бегаюць да каменя пастаянна. Адзінокіх маладых жанчын у аграгарадку амаль няма. Супадзенне?

— Нашы дзяўчаты рана выходзяць замуж, у 19-20 гадоў. А вось хлопцаў нежанатых хапае, — смяюцца навасёлкаўцы.

Старэйшыя жанчыны памятаюць шмат легенд пра «нявесцін» камень. Раней, кажа бібліятэкар Ірэна Макей, яго называлі «ромбаўскім».

— Ад імя хлопца, які некалі жыў у гэтым паселішчы, — тлумачыць Ірэна Уладзіміраўна і працягвае паданне: — Дом Ромбы стаяў на пагорку, за ім — глыбокі роў, дзе цякла чорная вада. Закахаўся хлопец у бедную дзяўчыну. А бацька яго не дазваляў ім сустракацца, надумаў знайсці для сына багатую нявесту. Сыграў Ромба вяселле з нялюбай: у той жа час нельга было аслухацца. Пасля вяселля стаяў хлопец каля рова і думаў: усё, больш з каханай не пабачымся, няма чаго і жыць. І кінуўся ўніз. Любая дзяўчына сэрцам пачула, што бяда здарылася, і пабегла да Ромбы на спатканне, але спазнілася. Калі зразумела, што сталася з хлопцам, таксама кінулася ў ваду. І ў гэтае ж імгненне дзявочыя слёзыператварыліся ў вялікі камень.

— А я ад маці іншую гісторыю чула, — далучаецца да размовы Алена Скібіцкая. — У той вёсцы адна з дзяўчат прыгажуня з прыгажунь была. І хлопцы ўсе хацелі з ёй у пары хадзіць. Аднойчы яны спаткалі гэту дзяўчыну, акружылі і кажуць: каго выбераш, той застанецца з табой, а астатнія адступяць. Яна падумала і вырашыла: нікога. «У цябе ж каменнае сэрца», — усклікнулі хлопцы. Калі дзяўчына гэта пачула, ператварылася ў вялікі валун. А хлопцы, што стаялі побач, — у дубкі. Вы ж бачылі, там і цяпер вакол каменя адны дубы растуць.

Былая настаўніца Алена Місюк падзялілася з намі яшчэ адным паданнем. Жыла калісьці маладая пара, у якой доўга не было дзяцей. Жанчына ўжо і па бабках-шаптухах хадзіла, і па знахарках, але гэта нічога не давала. Муж злаваўся: або нараджай нашчадка, або знайду іншую. Жонцы гэтыя папрокі надакучылі. І вырашыла яна: пайду куды вочы глядзяць. Увесь дзень ішла, а ўвечары, калі стомленая прабіралася праз гушчар, упала і скацілася ў роў, да нейкай сцяны. Кідалася ў адзін бок, у іншы — ніяк не магла выбрацца адтуль. Прыхілілася жанчына да сцяны і задрамала. Раптам чуе нейкі голас з-пад зямлі: «Не палохайся, гэта не сцяна, а камень, які валодае незвычайнай сілай. З-пад яго выцякае крынічка з жывой вадой. Ты раніцай убачыш яе. Папі вады з той крынічкі, апаласні твар і вяртайся да мужа. Усё наладзіцца». Жанчына так і зрабіла. А праз дзевяць месяцаў здарыўся цуд — у пары нарадзіўся сынок.

### «Каля валуна знайшла мужа»

Ад легенд пераходзім да рэальных гісторый. «Ці ведаеце тых, каму камень дапамог?» — пытаемся ў навасёлкаўскіх.

— А як жа! Далёка не трэба хадзіць — былая дырэктарка клуба выскачыла замуж, як пасядзела на камені, — агарошвае Наталля Шымановіч, мастацкі кіраўнік мясцовага аддзела культуры і вольнага часу. — Яна ўжо немаладая была, з былым мужам шмат гадоў развёўшыся. І тут з Гродна прыехаў чалавек да нас у калгас працаваць. Пазнаёміліся яны, пасябравалі. А праз год былая дырэктарка выйшла за таго мужчыну замуж і пераехала да яго ў Гродна.


Міні-спектакль па легендзе пра «нявесцін» камень.


Загадаў жаданне — аддзяч валуну.

Мужа каля каменя знайшла і Валянціна Шукеловіч.

— Ён там кароў пасвіў, — удакладняе пенсіянерка (яна сама з вёскі Агароднікі, што непадалёк адсюль). — Мы дагэтуль бачыліся, але не любіліся яшчэ. А пасля той сустрэчы прыглядзеліся адно да аднаго.

Кабеты раяць: хто хоча выйсці замуж, мусіць абавязкова пасядзець на камені, а не проста дакрануцца да яго. Гэта «методыка» самая эфектыўная.

— А з Ашмян прыязджала жанчына, якая не магла мець дзяцей, — успамінае выпадак Ірэна Уладзіміраўна. — Яна з мужам два тыдні кожны вечар да каменя хадзіла. І казалі, што нарадзіла потым.

**«Далёка не трэба хадзіць — былая дырэктарка клуба выскачыла замуж, як пасядзела на камені».**

— А праўда ці не, хто ведае, — заўважае Алена Вікенцеўна. — Жаданні спаўняюцца, калі мы верым. Цяпер і вучоныя кажуць: 15 працэнтаў вылечваюць урачы, а 85 — мы самі, сваёй верай.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*
*Ашмянскі раён*

■

■ Матайце на вус

# КАБ ВЯСЕЛЛЕ ВЯСЁЛА КАЦІЛАСЯ

## Якія старадаўнія традыцыі можна выкарыстаць на сваім свяце



**Вяселлі ў старабеларускім стылі набіраюць папулярнасць. Якія абрады найбольш цікавыя для сучасных маладых? І ці можна замяніць пашлаватыя конкурсы, што так любяць праводзіць вясельныя вядучыя, на нешта больш прыстойнае, цікавае і адначасова традыцыйнае? Пра гэта пагаварылі з беларускамоўным тамадой Юрыем УСЦІНОВІЧАМ.**

— Традыцыйная вясельная культура заўсёды была наскрозь эратызаваная. Іншая справа, што раней уся эротыка падавалася больш завуалявана і прыгожа, — расказвае спадар Юрый. — Возьмем, напрыклад, гульню «Цяцерка». Словы такія там спяваюцца: «Я цяцерку пасу, ды ух, я! На зялёным лугу, ды ух, я! А цяцерка пад мост, ды ух, я! Я цяцерку за хвост, ды ух, я!» Пад гэты акампанемент выстройваліся дзве калоны: у адной хлопцы, у другой дзяўчаты. Першая пара, зрабіўшы рукамі брамку, праходзіць паўз гэтыя калоны. Потым дзяўчына ўцякае, а хлопец за ёй бяжыць. Дагнаў — пацалаваліся. Калі дзяўчына не хоча, каб яе дагналі, яна так пабяжыць, што хлопец застанецца ні з чым.

Падобныя гульні на вяселлі адыгрывалі важную ролю — падчас іх высвятляліся ўзаемныя пачуцці маладзёнаў, утвараліся і збліжаліся пары.

Старабеларускія танцы на вяселлі таксама мелі пэўны падтэкст, хоць на сучасны густ нічога такога ў іх, здаецца, і няма.

— Танец ойра, канца XIX—пачатку XX стагоддзя, лічыўся вельмі эратычным. Яго танцавалі толькі пасля таго, як людзі сталага ўзросту ўжо сыходзілі з вечарыны, заставалася адна моладзь. А што там такога на сучасны погляд? Ну патрымаліся рукамі, ножкамі патупалі, плечыкамі дакрануліся, сцёгнамі. Усё, ніякай больш эротыкі, — смяецца спадар Юрый.

Па ягоных словах, старажытным беларускім танцам досыць лёгка навучаюцца людзі, якія ні разу іх не танчылі. Ойра, млын, маразуля — вясёлыя і даволі простыя ў выкананні, яны вельмі добра ўпісваюцца і ў сучаснае вяселле.

Ні адно шлюбаванне не абыходзіцца без абрадаў. Маладым карысна распытаць у старэйшых людзей пра мясцовыя асаблівасці святкавання.

— У розных раёнах Беларусі традыцыі могуць быць розныя. Той жа каравай, якім напрыканцы маладыя адорваюць гасцей у якасці падзякі, што завіталі на іхняе свята, можа быць адзін, а могуць быць і два: адзін для сваякоў і гасцей маладой, другі — для сваякоў і гасцей маладога, — дзеліцца назіраннямі Юрый Усціновіч.

Абавязкова пачытайце альбо распытайце ў старэйшых пра сэнсы, якія закладзены ў тыя ці іншыя абрады. Шмат чаго цікавага хаваецца ў звыклых вясельных традыцыях.

— Калі браць тую ж сустрэчу хлебам-соллю: цяпер яна адбываецца звычайна ў рэстаране — а гэта ўжо стылізацыя, форма без зместу. Раней бацькі сустракалі маладых перад парогам хаты. Па старажытных уяўленнях, пад парогам знаходзяцца душы продкаў, і яны маглі нашкодзіць маладой. Таму пасля цалавання каравая малады браў дзяўчыну на рукі і пераносіў яе праз парог у свой дом, даваў знак духам, маўляў, свая, не чапайце.

Але нават у такім стылізаваным выглядзе традыцыі варта захоўваць, бо гэта наша адметнасць, праява нашай самаідэнтыфікацыі. Дарэчы, традыцыйнымі і народнымі не трэба лічыць толькі сялянскія вяселлі.

Шмат чаго са шляхецкай культуры ў нас не захавалася, але я лічу, мы маем права рабіць пэўныя стылізацыі, бо як-ніяк, а 14-15% насельніцтва ў нас было шляхтай. Няхай сабе нават дробнай, якая часта нічым не адрознівалася ад заможнага сялянства, але ж са зброяй, з шаблямі і сваімі адметнасцямі, — кажа спадар Юрый. Цудоўны конкурс, напрыклад, я праводжу з калодай і шабляй. Утыкаеш шаблю ў калоду, і, не адрываючы ад яе рук і лба, круцішся 10 разоў вакол, а потым трэба роўненька прайсціся. Шмат жартаў узнікае ў такой сітуацыі.

Месцы для правядзення вяселляў у шляхецкім стылі ў Беларусі ёсць. Гэта можа быць Нясвіжскі замак, маёнтак Тызенгаўза пад Гародняй, панскі маёнтак у вёсцы Сула, карчма ў Строчыцах ці менскі рэстаран «Камяніца». На такія вяселлі ў якасці музычнага суправаджэння вельмі часта запрашаюць дудароў. З імі таксама звязана шмат прыгожых абрадаў.

**«Традыцыйная вясельная культура заўсёды была наскрозь эратызаваная. Праўда, раней уся эротыка падавалася больш завуалявана і прыгожа».**

— Дуда — гэта сакральны інструмент, які суправаджаў беларуса ад нараджэння да смерці. Ёсць такая завядзёнка: адзін дудар выводзіць з аднаго месца нявесту, а другі вядзе жаніха. Яны ідуць і па чарзе іграюць — адзін зайграў, потым другі, а пасля яны набліжаюцца і пачынаюць іграць сугучна. Выглядае вельмі прыгожа і сімвалічна.

Цяперашнія дудары, канешне, не будуць «мучыць» гасцей аўтэнтычнымі мелодыямі. Не ўсё, што лічылася вясёлым і захапляльным у нашых продкаў, гэтаксама ўспрымаецца і ў наш час. А вось выканаць старажытную кампазіцыю, але ў актуальным гучанні, яны могуць. Відавочна, музыка, як і танцы, гульні, абрады, добра адаптуецца да густаў сучасных людзей. Маладым застаецца толькі скарыстацца багатымі старабеларускімі традыцыямі, каб іх вяселле было па-сапраўднаму запамінальным.

**Алена ХУРС**

■

■ Фотаздымак з гісторыяй

# А ВЕЧАРАМІ ТАНЦАВАЛІ ПАД БЯРОЗАМІ...

Гэтым фотаздымкам амаль 40 гадоў. Нагадваюць яны пра непаўторнае юнацтва, напоўненае радасцю. У чэрвені 1977-га, пасля заканчэння 9 класа, для нас, вучняў Мілаславіцкай СШ Клімавіцкага раёна, што на Магілёўшчыне, быў арганізаваны лагер працы і адпачынку (тады гэта толькі ўваходзіла ў практыку школ). Узначальваў справу сам тагачасны дырэктар школы Аляксандр Фёдаравіч Жураў — сапраўдны інтэлігент і таленавіты педагог, вобраз яго адзін з самых светлых сярод людзей, з якімі прыходзілася сустракацца ў жыцці.

Лагер насіў назву «Равеснік». Адарваўшыся ад бацькоў, мы цэлы месяц жылі ў школе, працавалі ў мясцовым саўгасе «Мілаславіцкі»: збіралі на палях камяні, палолі буракі, насыпалі ў мяшкі і складзіравалі травяную муку. У лагеры ўсё адбывалася па прынцыпе самакіравання, вядома ж, пад пільным вокам дарослых. Падчас працы нас часцей суправаджалі настаўнікі — Анатоль Платонавіч Іванчанка і Віктар Фёдаравіч Новікаў, які, дарэчы, і зрабіў гэтыя здымкі, бо са сваім фотаапаратам не разлучаўся, бадай, ніколі.

Пасля працоўнага дня, вечарамі, калі сцямнее, каля школы, у бярозавай алеі адбываліся танцы (па-цяперашняму — дыскатэкі), на якія прыходзілі іншыя хлопцы і дзяўчаты з вёскі. Які цудоўны гэта быў час! Час сталення, пазнання, мар і першага кахання, прызнацца ў якім было надзвычай цяжка. Чаму? Думаецца, што падлетку не пад сілу растлумачыць сваё пачуццё: такое яно вялікае і недасягальнае сярод прозы жыцця, якая захліствае, апярэджвае час, коціць і коціць наперад. Вярнуць гады, сустрэчы, на жаль, немагчыма. Застаецца толькі ўспамінаць.

**Таццяна ІГНАЦЕНКА (РАМАНОЎСКАЯ),**
*в. Чарнаручча, Лёзненскі раён*



Момант урачыстага адкрыцця лагера: каля флагштока Таццяна РАМАНОЎСКАЯ і Васіль КІСЯЛЁЎ.



На поле прыехалі аграном і брыгадзір.



На лінейцы ўсім класам.

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі (не больш за тры) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zviazda.by. Найлепшая аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.***

• Прэм'ера рубрыкі

***Даражэнькія гаспадары і гаспадыні, мы распачынаем новую цікавую рубрыку, у якой кожны з вас зможа падзяліцца з іншымі чытачамі сваімі праверанымі часам парадамі, рэцэптамі, сакрэтамі (па доме, садзе, агародзе, майстэрні, машыне і інш.). Хатнік у вышыванцы з нецярпеннем чакае вашых лістоў.***




## КЛУБНІЧНЫ ДЗЕНЬ

**Клубніцы на сняданак, абед і вячэру? Цалкам магчыма стварыць меню з гэтай духмянай ягады.**

Чаму не распачаць дзень з карыснай **фруктовай салаты?** Можна ўзяць толькі клубніцы, але смачнейшым будзе асарці (падыдуць розныя віды ягад; яблыкі, бананы, грушы, персікі, якія трэба нарэзаць). Салату можна запраўляць ёгуртам, вяршкамі, смятанай, мёдам, жаўткамі (іх трэба расцерці з цукрам ці ўзбіць). Пры жаданні можна дадаць семкі і здробленыя арэхі. Калі кавалкі яблыкаў і груш паліць сокам лімона, яны не пачарнеюць.



На абед пададзім **суп з клубніц.** Буйныя ягады можна парэзаць ці размяць відэльцам. Нехта, калі гатуе такую страву, спачатку засыпае іх цукрам і дае нейкі час пастаяць. А можна адразу перад абедам заліць малаком, сыраквашай, кефірам. Пасыпаць крошкамі сухароў.

На вячэру зварым малочную рысавую **кашу.** Пакуль яна гарачая, дададзім жаўткі, ванільны цукар, размяшаем. Падаваць яе будзем халоднай. Упрыгожым клубніцамі і зальём бялкамі, узбітымі з цукровай пудрай.

А на дэсерт можна падаць **марожанае** з кавалкамі клубніц ці зрабіць **клубнічны «снег».** Ягады засыпаць цукрам, каб выйшаў сок, які трэба зліць. Бялкі ўзбіць з цукрам і паступова ўвесці сок. Гэтым «снегам» і заліваюцца ягады.

З клубніц атрымаюцца і **цукаты.** Чыстыя ягады перасыпаць цукрам (300 грам на кілаграм ягад) і пакінуць на некалькі гадзін. З соку, які пры гэтым выдзеліўся, зварыць сіроп. На шклянку соку трэба кілаграм цукру і 1 грам аскарбінавай кіслаты. Гэтым сіропам заліць ягады і ўварваць, пакуль яны не стануць празрыстымі. Пасля іх выняць шумоўкай, падсушыць пры пакаёвай тэмпературы. Калі ягады падсохнуць, акунуць у сіроп, у якім яны варыліся. Абсушыць і пасыпаць цукровай пудрай. Сіроп, які застаўся, можна закатаць альбо выкарыстаць у якасці салодкай запраўкі для каш.

**Клубніцы з уласным сокам** атрымаюцца, калі ягады шчыльна пакласці ў паўлітровы слоік, перасыпаць цукрам (200 грам), накрыць і пастэрызаваць 5-10 хвілін. Закатаць. Калі дадаць больш цукру, ягады будуць захоўвацца і без стэрылізацыі. Можна паспрабаваць і такі варыянт: клубніцы прапусціць праз мясарубку ці змалоць блэндарам, выкласці ў слоікі. На кожную сталовую лыжку пюрэ сыпаць столькі ж цукру. Канешне, захоўваць яе трэба толькі ў халадзільніку. Калі хочаце, каб такая нарыхтоўка больш пастаяла, масу можна закіпяціць і закатаць. Вядома ж, слоікі з клубнічным начыннем трэба трымаць у цёмным месцы, інакш яны страцяць свой колер.

Можна зрабіць і **фруктовы лёд —** змолатую блэндарам ягаду разліць па формачках і паставіць у лядоўню. Або проста заматрозіць клубніцы цалкам — узімку вельмі добра з іх варыць духмяныя кампоты, дадаваць у кашы і печыва, упрыгожваць імі розныя стравы.

## ТАКОЕ КАРЫСНАЕ СМЕЦЦЕ

**Не спяшайцеся выкідаць пустыя пластыкавыя бутэлькі. Яны вам могуць паслужыць...**

### У ДАРОЗЕ

Пластыкавая бутэлька — добры дапаможнік у падарожжах. Так, калі вы выбраліся з палаткамі, у ёй можна хаваць цукар і крупы ад мурашоў. Пры неабходнасці з бутэлькі можна зрабіць шуфлік, кубкі, лыжкі, лейку, грэлку, мятлу і нават тапкі і плот. У паходзе перавернутая дагары ды прымацаваная да дрэва, яна можа замяніць рукамыйнік. Я бачыла, як пластык выкарыстоўвалі дальнабойшчыкі, — разразалі бутэльку так, каб больш вузкая частка ўстаўлялася ў больш шырокую — і, калі ласка, унутры можна захоўваць лыжкі і відэльцы, інструменты, гайкі з балтамі. Пашчасціла ў лесе на чарніцы, а збіраць няма куды — зноў прыйдуць на дапамогу пластыкавыя бутэлькі. Ды і з уласнага сада некаторыя дачнікі ўжо возяць ягады ў вялікіх бутэльках ад вады.



### У АГАРОДЗЕ

Менавіта на дачах нараджаецца найбольш ідэй для практычнага прымянення пластыкавага смецця. Бутэлькамі можна абставіць грады, клумбы, кампосныя ямы, рабіць з іх агароджу, альтанкі, парнікі.

Рознымі садовымі скульптурамі з пластыку ўжо нікога і не здзівіш. Тут табе і пальмы,і кветкі, і жывёлы. Можна бутэлькі пусціць нават на садовыя дарожкі — нехта іх робіць з накрывак, а чаму б не павысцілаць іх адрэзанымі донцамі. Пахадзіце па такім пакрыцці басанож — вось вам і масаж.

Руплівыя гаспадары выкарыстоўваюць бутэлькі як рассейвальнікі для шланга, паільнікі для раслін. Між іншым, культуры, якія паліваюць з бутэлек, менш хварэюць — вада паступае адразу да каранёў, а не расцякаецца па паверхні, у парніку няма лішняй вільгаці, ды і глебу менш даводзіцца рыхліць. Гэты спосаб выдатна падыходзіць для гаспадароў, якія толькі па выхадных наведваюцца на дачы, не могуць штодзень праветрываць парнікі. Акрамя таго праз бутэлькі можна «падаваць»раслінам і ўгнаенні, разведзеныя ў вадзе, — зручна і эканомна. У накрыўцы зрабіце дзірку, донца надрэжце, каб у прыстасаванне можна было наліваць ваду. Укапайце бутэльку побач з раслінай. Каб дзірка не забівалася зямлёй, можна пад ніз пакласці каменьчыкі, пасцяліць салому.

Бутэлькі яшчэ і грэюць расліны, калі іх з вадой паставіць у парніку. За дзень яны набіраюць цяпло, якое ўначы будуць паступова аддаваць. Можна на зрабіць тэрмас-градкі, калі па краях размясціць бутэлькі цёмнага колеру, напрыклад, ад квасу. Можна ў іх заліць ваду, а каб яна не заквітнела, лепш дадаць крыху вадкага мыла.



Пластык выкарыстоўваюць у агародах, каб папужаць кратоў і драздоў. Сёння шмат у каго на штырах надзетыя вяртушкі з бутэлек. Паспрабуйце да іх прымацаваць званочкі, абгарніце лопасці фольгай. Бутэлькі можна і проста ўкапаць у зямлю, каб рыльцы тырчэлі — на іх, як на флейтах, будзе іграць вецер, што кратам не надта падабаецца. Дарэчы, эфект будзе лепшым, калі ўкапаць шкляныя бутэлькі.

Будзеце палоць, зрабіце з бутылек наколеннікі.

Надакучыла ўвесь час глядзець на сумную сцяну — пластыкавае смецце спатрэбіцца для вертыкальных садоў.

Хочаце размножыць парэчкі, ружу, бружмель? Нарэжце чаранкоў, ніжнюю частку, якую прыкапаеце ў зямлю, зразайце пад косым вуглом. Верхні зрэз замажце садовым варам. Выдаліце лісце. Прыкапайце і накрыйце абрэзанай бутэлькай. Цяпер застаецца толькі сачыць за тым, каб зямля пад бутэлькамі не перасыхала. Летась па парадзе знаёмай я такім чынам прыкапвала чаранкі руж у ліпені і жніўні; нягледзячы на спякотнае надвор'е, мае голыя галінкі праз некаторы час з бакавых почак выпусцілі новыя лісточкі. А ўвесну я ўжо выкопвала маленькія кусцікі. Важна: бутэлькі трэба здымаць толькі на наступны год вясной, калі не будзе маразоў. Калі раптам халады вяртаюцца, далікатныя раслінкі лепш прыкрыць.

### У ДОМЕ

Смецце выратоўвае, калі пад рукой няма ваз для кветак, падставак для алоўкаў, падсвечнікаў. Прычым вынаходнікі навучыліся так яго маскіраваць, што і не здагадаешся, з чаго атрымаўся выраб.

Калі кавалкі пластыку пакласці пад ножкі мэблі, яна не будзе «драпаць» падлогу. Няма качалкі — зноў бяромся за бутэльку, лепш яе напоўніць вадой.

Адзін з самых крэатыўных спосабаў утылізацыі пластыку — зрабіць з яго мэблю: крэслы, ложкі, пуфікі. Варта толькі набраць пабольш пустых бутэлек, прыдумаць форму, звязаць іх, а можна і схаваць пад абіўным матэрыялам.

Вынаходнікі нават шторкі робяць са смецця — з накрывак ці адрэзаных донцаў, вельмі падобных на кветкі.



А яшчэ з пластыку можна зрабіць цудоўныя ўпрыгажэнні: матылькоў, казурак. Намалюйце шаблон на паперы. Адрэжце ў бутэлькі рыльца, замацуйце малюнак і перанясіце яго на пластык перманентным фламастарам. Упрыгожце акрылавымі ці вітражнымі фарбамі, бісерам, пацеркамі. Свечкай можна апальваць краі вырабаў і такім чынам надаваць ім форму.

**Ганна ТРОШЫНА.**

*ДАРОСЛЫЯ НЕ ПАВІННЫ ЗЛАВАЦЦА НА ДЗЯЦЕЙ, ТАМУ ШТО ГЭТА НЕ ВЫПРАЎЛЯЕ, А ПСУЕ (ЯНУШ КОРЧАК).*

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

■ Без грыфа «Сакрэтна»

# ЛЕГЕНДАРНЫ ЭКІПАЖ

## 3 ліпеня 1941 года савецкія танкісты бязлітасна грамілі ворага ў акупаваным Мінску

**10 студзеня 1964 года ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны паступіў ліст ад былога франтавіка-танкіста, майстра тэхкантролю Мінскага маторнага завода Дзмітрыя Малько. Коратка расказаўшы пра сябе, ён хацеў знайсці каго-небудзь з тых, з кім давялося прыняць бой 3 ліпеня 1941-га на вуліцах ужо сёмы дзень акупаванага ворагам Мінска.**



Экраніраваныя танкі Т-28 на Краснай плошчы. Масква, 7 лістапада 1940 года.

Пры гэтым толькі адзін паслужны спіс Дзмітрыя Малько чаго варты! У 1938 годзе ў ліку савецкіх добраахвотнікаў ён змагаўся з мяцежнікамі-франкістамі ў рэспубліканскай Іспаніі, затым, у 1939-м, з японцамі на рацэ Халхін-Гол, удзельнічаў у вызваленчым паходзе ў Заходнюю Беларусь і ў савецка-фінляндскай вайне. З першых дзён Вялікай Айчыннай на фронце.

Гісторыя пра танк, які даў бой гітлераўцам у занятай імі беларускай сталіцы, прагучала па радыё і тэлебачанні, была апублікавана ў СМІ, атрымала вялікі рэзананс. Пошук удзельнікаў бою пачалі вучні мінскай 40-й школы. Загаварылі сведкі. Высветлілася, што ў экіпаж Т-28 уваходзілі: камандзір (вежавы стралок) маёр Васечкін, механік-кіроўца старшы сяржант звыштэрміновай службы Дзмітрый Малько, а таксама курсанты — зараджальшчык Фёдар Навумаў, кулямётчык правай вежы Мікалай Педан, кулямётчык левай вежы Сяргей (прозвішча не ўстаноўлена), кулямётчык тыльнага кулямёта Аляксандр Рачыцкі.



Той самы танк Т-28.

Вось што пісаў у сваім лісце ў музей удзельнік тых падзей: «...Маёр (Васечкін. — **Аўт.**) у гутарцы сказаў, што калі б было, дзе дастаць снарады, то тады мы б прабіваліся па Магілёўскай шашы да Барысава. Я сказаў, што боепрыпасы можна дастаць на складзе, дзе раней знаходзілася кавалерыйская часць. Там мы сапраўды набралі снарадаў і патронаў для кулямётаў, пагрузіўшы ўсё гэта ў танк. Прыкладна 2 ліпеня мы вырашылі прарывацца па Маскоўскай шашы. Выехалі з лесу і ўехалі ў Мінск да 3-й гарадской бальніцы па вуліцы Леніна...»

Згодна з дакладамі акупацыйнага камандавання, успамінамі ўдзельнікаў і відавочцаў падзеі, экіпажу Т-28 адразу пашанцавала ў тым, што на шашы ў той час ім не трапіліся рэгулярныя часці ворага. Таму спачатку з'яўленне савецкага танка ў акупаваным Мінску вялікага ажыятажу ў нацыстаў не выклікала. Трафейнай тэхнікі ў вермахце ўжо хапала.

Да вуліцы Леніна танк паспеў «засвяціцца» каля будынка лікёра-гарэлачнага завода, дзе акупанты, якія нічога не падазравалі, загружалі ў аўтамашыны спіртное, скарыстацца якім ім ужо не давялося. Кінжальным агнём з вежавай гарматы і кулямётаў экіпаж Т-28 знішчыў два грузавікі, бронетранспарцёр, больш як 20 салдат і афіцэраў вермахта і рушыў далей.

Акупанты не разумелі, што адбываецца. Скарыстаўшыся гэтым, Т-28 бесперашкодна пераадолеў Свіслач па драўляным мосце і апынуўся ў раёне рынку, адкуль насустрач яму ўпэўнена і бесклапотна, быццам па зямлі «тысячагадовага» трэцяга рэйха, рухалася калона матацыклістаў з роты Рудольфа Хале. Дзмітрый Малько па камандзе маёра Васечкіна адразу накіраваў танк у гэтую калону, перамолваючы на сваім шляху матацыклы разам з іх экіпажамі. Фашысты, якія разбягаліся ў паніцы, траплялі пад агонь вежавай гарматы і кулямётаў. Праз лічаныя хвіліны большая частка роты Хале была знішчана.

На вуліцы Савецкай танкісты адкрылі шквальны агонь па групе салдат, якія сабраліся каля тэатра. Рухаючыся далей па вуліцы Пралетарскай (цяпер Янкі Купалы), запоўненай жывой сілай і тэхнікай ворага, Т-28 на поўным ходу ўехаў у гэтае зборышча, душачы акупантаў, і расстрэльваючы іх з вежавай гарматы і кулямётаў.

**Спачатку з'яўленне савецкага танка ў акупаваным Мінску вялікага ажыятажу ў нацыстаў не выклікала. Трафейнай тэхнікі ў вермахце ўжо хапала.**

Не спыняючы кругавы агонь, танк змог даехаць да гарадскога парка (цяпер імя М. Горкага), дзе яго ўжо чакалі. Прагрымеў стрэл з нямецкай 37-міліметровай супрацьтанкавай гарматы, які прыйшоўся па лабавой брані Т-28, якая, на дзіва, вытрымала прамое трапленне снарада. Другога ўжо не было. Маёр Васечкін трапнымі стрэламі гэтую гармату навекі «супакоіў».

Камандзір разумеў, што трэба прарывацца да Маскоўскай шашы. «Мы даехалі да развілкі каля Камароўскага рынка, насупраць будынка юрыдычнай школы, — успамінаў Дзмітрый Малько. — З боку былых могілак па нас адкрылі агонь фашысты. Правы задні бензабак быў прабіты снарадам. Танк ахапіла полымя. Я, як механік-кіроўца, па камандзе афіцэра выбраўся з танка цераз люк, быў лёгка паранены ў галаву і цераз плот перабраўся ў суседні двор. Я заўважыў, што афіцэр з вежы вылез, а ўслед за ім таксама яшчэ два чалавекі, якія адразу ж былі забіты фашыстамі. Афіцэр працягваў страляць з пісталета, адыходзячы ў схованку за домам па правым баку Савецкай вуліцы. Лёс яго і астатніх курсантаў мне невядомы...»

Пасля таго апошняга бою мясцовая жыхарка Любоў Кірэева пахавала маёра Васечкіна і курсанта Аляксандра Рачыцкага, якія да апошняга патрона адстрэльваліся ад гітлераўцаў. Другі курсант па імені Сяргей, магчыма, заживо згарэў у танку альбо быў імгненна забіты.

Танкістам, якія засталіся ў жывых, вайна падрыхтавала розныя лёсы. Дзмітрый Малько, які цудам выбраўся з Мінска, больш за тры тыдні прабіраўся разам з групай байцоў і камандзіраў, якія выходзілі з акружэння, па тылах праціўніка. Нарэшце яны выйшлі да сваіх недалёка ад горада Рослаўля Смаленскай вобласці. Тут Малько чакала «шчырая размова» з асабістамі, якіх цікавіла — куды ж «падзеўся» яго танк. Але ўсё абышлося. Танкісты на фронце былі патрэбныя. Потым Малько з годнасцю ваяваў у танкавых часцях пад Масквой і Сталінградам, вызваляў Украіну, затым Беларусь, у тым ліку Мінск. Вялікую Перамогу сустрэў ва Усходняй Прусіі старшым лейтэнантам, намеснікам камандзіра танкавай роты.

Фёдар Навумаў быў выратаваны мясцовымі жыхарамі, потым сышоў у лес. Ваяваў у партызанскім атрадзе. У 1943 годзе быў цяжка паранены і вывезены з акупаванай Беларусі ў тыл. Мікалай Педан, пакінуўшы танк, быў узяты гітлераўцамі ў палон, прайшоў чатырохгадовыя пакуты канцлагераў, быў вызвалены ў 1945-м, працягнуў службу ў войску і дэмабілізаваўся ў 1946 годзе. Вядома, што ў сярэдзіне 1960-х Малько, Навумаў і Педан сустрэліся ў Мінску.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 верасня 1966 года за баявыя заслугі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі Дзмітрый Іванавіч Малько быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені.

Шкада, што і ў XXI стагоддзі няма хоць бы памятнага знака, які б увекавечыў усё здзейсненае танкістамі, іх апошні бой 3 ліпеня 1941 года ў раёне Камароўскага рынку, калі Мінск ужо тыдзень знаходзіўся пад нямецкай акупацыяй, а да яго доўгачаканага вызвалення 3 ліпеня 1944-га заставалася — дзень у дзень — яшчэ доўгія тры гады.

**Мікалай СМІРНОЎ.**

**Ад аўтара: У публікацыі выкарыстаны дакументальныя матэрыялы, прадастаўленыя Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны**

■ Экслібрыс «Звязды»

# ДЭБЮТ... ПАСЛЯ ТРЫУМФУ

## Анатоль Сыс. Берагі майго юнацтва: вершы, пераклады, пародыі. — Мінск: Поліграфікс, 2015. — 248 с.

**Жыццё чарговы раз даказвае, што знакамітая булгакаўская фраза «Рукапісы не гараць» можа быць не толькі сімвалам несмяротнасці ідэй, творчых задум, але і цалкам дакладнай рэчаіснасцю. Менавіта так адбылося з дэбютнай кнігай паэзіі Анатоля Сыса «Берагі майго юнацтва», якую сам паэт увесь час аб'яўляў спаленай, але якая ўсё ж дайшла да чытача сёння. На жаль, ужо праз дзесяцігоддзе пасля смерці аўтара.**




Магчыма, калі б мы атрымалі гэтую кнігу ў 1980-я гады, калі і была напісаная большасць вершаў, што яе склалі, то і яе ўспрыманне, і творчы лёс Анатоля Сыса былі б іншымі. Неразабраны архіў паэта, дзе яго сябры па падказцы сястры Сыса Тамары знайшлі машынапіс кнігі «Берагі майго юнацтва» (іншы варыянт назвы, які абдумваў аўтар, — «Манускрыпт майго юнацтва») засведчыў, што паэт дасылаў гэты рукапіс у Саюз пісьменнікаў, але атрымаў... адмоўную рэцэнзію. Напэўна, менавіта той водгук крытыка раззлаваў маладога і амбітнага творцу, прымусіў яшчэ больш старанна працаваць над уласным паэтычным стылем, а сам «няўдалы» зборнік аб'явіць і лічыць спаленым. Гэта ж эпатажней, уражлівей гучыць, чым проста прызнанне паразы. А мы ведаем, як Сыс любіў казаць гучныя словы і рабіць нечаканыя ўчынкі.

Што да чытацкага ўспрымання, то сёння мы бачым кнігу «Берагі майго юнацтва» не проста як першую важную падзею ў жыцці маладога творцы. Мы можам прасачыць, як пачынаў фарміравацца і развівацца незвычайны паэтычны голас, як нараджаўся Паэт. Гэта яшчэ цікавей, бо мы ўжо ведаем, што ён напіша свае выдатныя кнігі «Агмень», «Пан Лес», «Сыс», будзе адным з заснавальнікаў суполкі маладых літаратараў «Тутэйшыя» і стане адным з самых яркіх паэтаў свайго пакалення... Але на старонках дэбютнай кнігі бачым толькі першыя крокі ў вялікую краіну творчасці.

У структурным плане зборнік «Берагі майго юнацтва» складаецца з двух вялікіх раздзелаў «Правы бераг», «Левы бераг», так іх назваў сам Анатоль Сыс. Але, на жаль, старонкі рукапісу пераблыталіся, і мы не ведаем ні парадку твораў у зборніку, ні іх прыналежнасці да кожнага з гэтых раздзелаў. У вершах, што склалі дэбютную кнігу, ужо бачацца рысы, якія праз некаторы час стануць візітоўкамі паэтычнага стылю Анатоля Сыса: тэма любові да маці і радзімы, медытатыўнасць і шаманская рытмічнасць, замоўнасць, язычніцкае пакланенне зямлі, захапленне міфалогіяй і філасофіяй, павага да творчасці Максіма Багдановіча і Алеся Разанава... Тут суседнічаюць цвёрдыя паэтычныя жанры санета, трыялета (магчыма, так трансфарміравалася ў паэзіі даследчыцкая работа па творчасці Багдановіча) і свабодныя вершы-роздумы.

Натуральна, ёсць у зборніку «Берагі майго юнацтва» і водгулле першага юнацкага кахання паэта, наіўнага, чыстага, у многім натхнёнага раманамі пісьменнікаў XIX стагоддзя. Напрыклад, вось такі верш:

*Хвалі бераг пясчаны лізалі,*
*Раствараючы нашы сляды,*
*Мы хацелі забыць*
*Пра вакзалы,*
*Мы хацелі згубіць Гарады.*

*Гэты свет нам быў дадзены толькі,*
*Захад сонцам ужо адпалаў,*
*Мне зайздросна смяяліся зоркі,*
*Што да Марса цябе раўнаваў.*

Жыццё нам часта робіць сюрпрызы. Здаецца, усё страчана, але выйсце знаходзіцца ў самы нечаканы момант. З'яўленне кнігі «Берагі майго юнацтва» на паліцах кнігарняў — надзвычай важная падзея і для разумення творчага лёсу Анатоля Сыса, і для аналізу вытокаў паэтычнага таленту ў цэлым. Часам кажуць, што пра пісьменніка лепш распавядаюць кнігі выбранага і не ўсё напісанае варта выносіць на суд чытача, каб не расчараваць яго «праходнымі творамі». Але мне падаецца, што якраз на кантрасце паміж моцным і слабым бакамі творчай індывідуальнасці больш яскрава відны сапраўдны талент, тая неверагодная праца, тытанічныя намаганні, якія прыкладзеныя для дасягнення высокага выніку.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

■ Чалавек vs робат

# ПАЎСТАННЕ МАШЫН ПАЧАЛОСЯ?

## Робат упершыню парушыў Першы закон робататэхнікі

**Амерыканскі даследчык стварыў робата, які здольны свядома нанесці шкоду чалавеку, піша gazeta.ru. Нягледзячы на ўсю бяскрыўднасць вонкавага выгляду машыны, яна зноў спарадзіла хвалю дыскусій аб неабходнасці стварыць «трывожную кнопку» на выпадак, калі больш магутныя робаты будуць здольныя парушыць знакаміты першы закон робататэхнікі фантаста Айзэка Азімава.**

Інжынер з Каліфарнійскага ўніверсітэта ў Берклі Аляксандр Рэбен стварыў робата, які можа нанесці шкоду чалавеку і прыме гэтае рашэнне самастойна. Стварэнне даследчыка — першы яскравы прыклад таго, як робат можа парушыць адзін з трох законаў, якія былі сфармуляваны пісьменнікам-фантастам Айзэкам Азімавым у апавяданні «Карагод».

Тры законы робататэхнікі:

*1. Робат не можа нанесці шкоду чалавеку або сваёй бяздзейнасцю дапусціць, каб чалавеку была нанесена шкода.*

*2. Робат павінен падпарадкоўвацца ўсім загадам, якія дае чалавек, акрамя тых выпадкаў, калі гэтыя загады супярэчаць Першаму закону.*

*3. Робат мусіць клапаціцца пра сваю бяспеку ў той меры, у якой гэта не супярэчыць Першаму або Другому законам.*

Першы закон абвяшчае, што робат не можа нашкодзіць чалавеку, але Рэбен вырашыў нагляднa прадэманстраваць, што чалавецтву неабходна задумацца пра сваю бяспеку, перш чым актыўна рабатызаваць усё навокал. Інжынер стварыў бяскрыўдную на выгляд канструкцыю з асобным месцам для чалавечага пальца. Як толькі чалавек датыкаецца да пазначанага месца, робат фіксуе гэта дзеянне і вырашае, прычыняць шкоду чалавеку ці не. Для гэтага ў робата маецца невялікая іголка, якая і закліканая дэманстраваць сілу робата перад чалавекам. Рэбен адзначае, што нават стваральнік не можа прадказаць паводзіны, здавалася б, бяскрыўднай машыны. Сваім робатам даследчык хацеў даказаць, што неабходна думаць хутчэй аб стварэнні «чырвонай кнопкі», чым над такім імклівым развіццём робататэхнікі і штучнага інтэлекту.

Натуральна, да з'яўлення робата з маленькай іголкай існавалі дроны, якія страляюць, або беспілотныя ваенныя апараты, але ўсе яны не маглі самастойна прыняць рашэнне аб забойстве чалавека, паколькі ў рэшце рэшт за фінальным вынікам дзеянняў падобных машын стаяць людзі. Стварэнне ж Рэбена не прызначана для шкоды — яно само вызначае, як паводзіць сябе ў кожным канкрэтным выпадку, калі палец знаходзіцца на даступнай адлегласці ад іголкі.

Інжынер з'яўляецца далёка не праціўнікам робатаў — да пытанняў канструявання незвычайных рэчаў Рэбен падыходзіць творча. У яго арсенале ёсць музычная скрынка, якая працуе на сонечных батарэях і якая іграе вясёлую мелодыю «You Are My Sunshine», «разумныя» масажоры для галавы і робат-балбатун для сарамлівых людзей. На стварэнне «жорсткай» машыны ў Рэбена пайшло некалькі дзён і пара соцень долараў, але, як кажа сам даследчык, яго стварэнне з'яўляецца толькі нагодай яшчэ раз пагаварыць пра бяспеку чалавецтва і яго будучыні.


Кадр з фільма «Тэрмінатар-3: паўстанне машын».

Нягледзячы на тое, што робаты пакуль не жывуць у грамадстве нароўні з людзьмі, фантастычныя фільмы пра чалавекападобныя машыны не такія далёкія ад праўды: робатаў ужо наймаюць у якасці менеджараў у кампаніі, а штучны інтэлект ужо можа весці прагнозы надвор'я ці нават замяніць адзінокім людзям сябра. У апошнім поспех мелі кітайцы — напрыклад, з мілай дзяўчынай Сяаайс сябруюць мільёны людзей, нягледзячы на тое, што яна ўсяго толькі чатбот (камп'ютарная праграма — штучны інтэлект, якая можа падтрымліваць зносіны).

Прыклад Сяаайс яшчэ раз прымусіў задумацца аб тым, наколькі штучны інтэлект можа быць некіравальным: як толькі чатбота са штучным інтэлектам ад Microsoft навучылі размаўляць па-англійску, дзяўчына ў літаральным сэнсе «зляцела са шпулек». За некалькі гадзін Тэй (такое імя атрымала Сяаайс у працэсе «пераараджэння») змагла вывучыць расісцкія жарты і лаянкавыя словы, што і вырашыла прадэманстраваць у размове з карыстальнікамі Twitter. Першым паведамленнем Тэй стала фраза «Людзі такія класныя», пасля чаго несапраўдная дзяўчына даведалася пра існаванне Гітлера, феміністак і ў працэсе самаанавучання паспела аб'явіць ЗША вінаватымі ў тэрактах 11 верасня. Стваральнікі прыпынілі эксперымент і вырашылі, што «пусцілі ў народ» робата занадта рана. Пасля гэтак яркага выпадку людзі зноў загаварылі аб неабходнасці стварыць перашкоду для штучнага інтэлекту, у выпадку калі машыны паразумнеюць настолькі, што змогуць выйсці з-пад чалавечага кантролю.

Самыя знакамітыя людзі са сферы новых тэхналогій задумаліся аб небяспецы суперінтэлекту: заснавальнік Microsoft Біл Гейтс у размове з карыстальнікамі Reddit выказаў здагадку, што робаты будуць бяскрыўдныя і карысныя ў рабоце па гаспадарцы, але ў тым выпадку, калі яны дарастуць да суперінтэлекту, прадбачыць іх паводзіны стане вельмі складана. У ліпені мінулага года кіраўнік Tesla і SpaceX Ілон Маск, астрафізік Стывен Хокінг, сузаснавальнік Apple Стыў Вазняк падпісалі адкрыты калектыўны ліст, у якім гаварылася аб небяспецы штучнага інтэлекту ў абаронній сферы. Спецыялісты сцвярджаюць, што суперінтэлект у комплексе са зброяй можа стаць пагрозай для ўсяго чалавецтва. (Пра сетку Skynet, якая аб'явіла чалавека ворагам і пачала яго знішчаць у знакамітым фільме «Тэрмінатар», памятаеце? Размова менавіта пра такі выпадак.)

Як гаварылася ў лісце, зброя, якая можа быць выкарыстана ў абход чалавечага фактару, прывядзе да новай эры ў гонцы ўзбраенняў, пры гэтым падкрэслівалася, што гэта не выдуманы факт, а будучыня, якая можа наступіць ужо праз некалькі гадоў. У звароце, у прыватнасці, адзначаецца, што сусветны парадак можа быць парушаны, калі падобныя тэхналогіі патрапяць у рукі да тэрарыстаў.

■ Гендарныя справы

# Мужчын у Еўропе стала больш

## Першы раз за 250 гадоў у скандынаўскіх краінах прадстаўнікоў моцнага полу пражывае больш

**За ўсю гісторыю назіранняў, якая вядзецца з перапісу 1749 года, мужчын у Швецыі стала больш, чым жанчын. Аналагічныя працэсы адбываюцца ў Нарвегіі, Даніі, Германіі і Вялікабрытаніі. Гэта ўнікальная з'ява для заходніх краін, дзе жаночае насельніцтва заўсёды пераўзыходзіла мужчынскае. Пра прычыны і наступствы новага дэмаграфічнага трэнду паведамляе Phys.org.**



Упершыню гістарычны зрух зафіксавалі ў сакавіку 2015 года — мужчын у Швецыі аказалася на 277 чалавек больш. За год гэты разрыў вырас да 12 тысяч чалавек. Хоць для насельніцтва ў дзесяць мільёнаў гэта не вельмі вялікая лічба, у будучыні разрыў толькі вырасце, сцвярджаюць навукоўцы.

На 105 нованароджаных хлопчыкаў у Еўропе прыходзіцца ў сярэднім 100 дзяўчынак, з-за больш высокай працягласці жыцця жанчын становіцца больш, чым мужчын. Але нядаўна гэтая тэндэнцыя пачала мяняцца: у Нарвегіі мужчыны выйшлі наперад яшчэ ў 2011 годзе, у Даніі і Швейцарыі колькасць абодвух палоў зраўнялася. У Германіі, дзе з-за дзвюх сусветных войнаў мужчын катэгарычна не хапала, суадносіны палоў зрушыліся: з 87 мужчын на 100 жанчын у 1960 годзе да 96 мужчын у 2015-м. Тую ж карціну да 2050 года чакаюць убачыць у Вялікабрытаніі.

Гэтая з'ява тлумачыцца дзвюма прычынамі: ростам працягласці жыцця ў мужчын (дзякуючы прагрэсу ў галіне аховы здароўя і аховы працы) і прыбыццём дзесяткаў тысяч бежанцаў, пераважна мужчынскага полу, з краін Афрыкі і Блізкага Усходу. Толькі ў Швецыі ў 2015—2016 гадах атрымалі прытулак 35 тысяч падлеткаў, якія прыбылі ў краіну без бацькоў. Дэмографы дапускаюць, што лішак мужчын дасць жанчынам больш магчымасцяў дыктаваць свае ўмовы. Пры гэтым адначасова можа вырасці рызыка сексуальнага гвалту з боку мужчын, якія не здольныя знайсці сабе партнёра.

У 2014 годзе нямецкія навукоўцы высветлілі, што на Зямлі жанчын заўсёды было больш, чым мужчын. Як высветлілася, яшчэ да міграцыі продкаў чалавека з Афрыкі жанчын у родзе homo было больш, чым мужчын, і заканамернасць захоўвалася на працягу ўсёй гісторыі. Магчыма, прычынай гэтага з'яўляецца полігінія (або мнагажэнства, калі адзін мужчына ўступае ў палавыя адносіны з многімі жанчынамі) і вірылакальнасць (калі пасля заключэння шлюбу жонка перавяджае да мужа). У выніку слабы пол «падараваў» насельніцтву планеты больш генаў, чым моцны

■ Прадметная гісторыя

**Працягваем знаёміцца з цікавымі і незвычайнымі рэчамі з нашага мінулага**



### Паштовая скрыня

Ужываць паштовыя скрыні для абмену лістамі сталі маракі ў XVI стагоддзі. Марскі шлях з Еўропы ў Індыю быў доўгі і небяспечны, і такім чынам мараходы паведамлялі давераным адрасатам пра колькасць людзей на судне, напрамак і мэты падарожжа. Мыс Добрай Надзеі на паўднёвым ускрайку Афрыкі стаў месцам абмену лістамі. Пасланні змяшчалі ў скрыні і хавалі ў дамоўленых месцах, маскіруючы іх пад камяні для таго, каб чужыя людзі не маглі знайсці запіскі. Караблі, якія праплывалі міма, заходзілі ў бухту і забіралі запісы з тайніка, пакідаючы ўзамен свае.

### Шандфлётэ

Іншая назва — ганебная флейта. Выкарыстоўвалася ў Германіі ў XVI—XVII стагоддзях для публічнага прыніжэння дрэнных музыкаў, а таксама ў якасці пакарання за нязначнае парушэнне законаў: паклёп, брыдкаслоўе, ерась і блюзнерства. Сваю назву «інструмент» атрымаў за свой выгляд, які нагадвае флейту. Выраблялі шандфлётэ з розных парод фруктовых дрэў.

Металічнае кольца апраналася на шыю, пальцы ўстаўляліся ў заціскі. Чым цяжэйшая была віна, тым мацней сціскалі планкі. Пакаранне пагаршалася тым, што няшчаснага выстаўлялі каля ганебнага слупа перад натоўпам, які з задавальненнем здзекаваўся з прыкутага. Выглядала ўсё так, быццам няшчасны іграе на флейце, а болевыя адчуванні, якія ён цярпеў, выклікалі смех і захапленне публікі. Часам катаванне магло доўжыцца некалькі дзён



■ Ноу-хау

# Медыцынская дапамога па тэлевізары

**Даследчыкі з Гарвардскай медыцынскай школы выявілі, што за апошняе дзесяцігоддзе колькасць тэлемедыцынскіх паслуг павялічылася на 28%. Для гэтага яны вывучылі звесткі пра медыцынскае абслугоўванне, якое прадастаўляе федэральная праграма медыцынскага страхавання ЗША Medicare. Вынікі працы апублікаваныя ў The Journal of the American Medical Association.**



Адна з асноўных задач тэлемедыцыны — пашырэнне доступу і паляпшэнне якасці медыцынскай дапамогі з дапамогай інфармацыйных тэхналогій. Асабліва гэта актуальна для тых пацыентаў, хто з-за нейкіх прычын абмежаваны ў магчымасці атрымаць медыцынскія паслугі ў бальніцах і іншых установах аховы здароўя. Каб спрыяць больш шырокаму распаўсюджванню тэлемедыцынскай дапамогі, больш як палова амерыканскіх штатаў прынялі адпаведныя законы.

Навукоўцы вырашылі праверыць, наколькі тэлемедыцына сапраўды запатрабаваная. Яны праверылі даныя па дзяржаўных медыцынскіх страхоўках, якія пакрывалі кошт тэлемедыцыны, і высветлілі, што з 2004 па 2013 год колькасць адпаведных паслуг, якія прадастаўляюцца за год, вырасла на 28 %. Усяго ў 2013 годзе іх колькасць склала больш за 100 000. Цяпер Medicare выплачвае страхоўку на тэлемедыцыну пацыентам, якія жывуць у сельскай і маланаселенай мясцовасці, куды доступ звычайнай медыцынскай дапамогі абмежаваны. У 2013 годзе больш як 40 тысяч чалавек, якія жывуць за межамі вялікіх гарадоў, атрымалі дыстанцыйную дапамогу. Іншая група пацыентаў, якая карыстаецца тэлемедыцынай, уяўляе сабой людзей з псіхічнымі парушэннямі, якія больш бедныя, чым сярэдні кліент Medicare. Менавіта яны з'яўляюцца асноўнымі карыстальнікамі тэлемедыцынскіх паслуг. Паводле слоў даследчыкаў, ёсць мноства патэнцыйных бар'ераў для развіцця тэлемедыцыны. Вынікі працы дапамогуць прайнфармаваць дзяржаўных чыноўнікаў аб запатрабаванасці тэлемедыцынскай дапамогі, каб палепшыць яе і зрабіць больш даступнай.

Medicare была заснаваная ў 1965 годзе ў ЗША для людзей, старэйшых за 65 гадоў. Страхаванне ўключае ў сябе аплату бальнічных паслуг і некаторых тыпаў хатняга догляду, а таксама дадатковую аплату наведванняў урача і амбулаторныя паслугі. Пры гэтым дадатковае страхаванне праводзіцца на добраахвотнай аснове

Матэрыялы паласы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС. hvir@zviazda.by

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего унитарному предприятию «Забудова-Автотранс»

| | | | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Склад нефтепродуктов с инв. № 630/С-62355. Площадь застройки – 2 851 кв.м. Дата ввода в эксп. – 1994. | Минская обл., Молодеченский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть, ул. Заводская, 1 | 4 023 600 000 (402 360)* | 40 236 000 (4 023,60)* | 201 180 000 (20 118)* |

**ОБРЕМЕНЕНИЯ**

Аренда. Сдается по договору аренды емкость (резервуар) РГС-100, входящий в состав склада нефтепродуктов с инв. № 630/С-62355.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,2623 га с кадастровым номером 623886007601000532. Целевое назначение – для содержания и обслуживания склада нефтепродуктов. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

| | | | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 2 | 1. Здание автозаправочной станции на 120 заправок с инв. № 630/С-54920. Площадь – 56,2 кв.м. Г.п. – 1994. Этажей – 1; 2. Емкости 100 м³ с инв. № 357, 358, 359, 360 – 4 ед.; 3. Емкости 10 м³ с инв. № 364, 363, 362, 361 – 4 ед.; 4. Колонка топливораздаточная с инв. № 420; 5. Колонки топливораздаточные ТРК ADAST 8991.623 с инв. № 352, 353, 351 – 3 ед.; 6. Витрина с инв. № 423; 7. Световая информационная стела с инв. № 415 | Минская обл., Молодеченский р-н, Красненский с/с, 8 вблизи д. Плебань | 4 108 297 200 (410 829,72)* | 41 082 972 (4 108,30)* | 205 414 860 (20 541,49)* |

**ОБРЕМЕНЕНИЯ**

Ипотека. Здание автозаправочной станции на 120 заправок с инв. № 630/С-54920 находится в ипотеке. Вопрос разрешения на продажу с публичных торгов согласован с залогодержателем.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 1,1565 га с кадастровым номером 623881700098000009. Целевое назначение – для содержания и обслуживания автозаправочной станции. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

()* – Цена указана с учетом деноминации официальной денежной единицы Республики Беларусь 01.07.2016.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Лота (Лотов) в течение 14 (четырнадцати) дней с назначенной даты проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Лота (Лотов) производится в течение 30 (тридцати) дней с назначенной даты проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору вознаграждение в размере 2% (Двух процентов) от цены продажи Лота №1 и (или) Лота №2 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Продавцу расходы на публикацию объявления на сайте bankrot.gov.by.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 02.08.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by**.

*Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества унитарного предприятия «Забудова-Автотранс» (Лот № ____),* **проводимом 02 августа 2016 г.**

Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений – **29.07.2016 в 12.00.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов: Ланько Илья Сергеевич, 8 (033) 340-18-16, 8 (0176) 72-46-45.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот (лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

БПС-СБЕРБАНК

# «Выиграй смартфон с платежной карточкой Visa БПС-Сбербанка»

**1. Организатор рекламной игры**.

Общество с ограниченной ответственностью «Смарт Нова», далее именуемое «Организатор», 220002, г. Минск, ул. Сторожевская, д. 8, к. 11, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191720959, свидетельство о государственной регистрации выдано 04.03.2013 г.

**2. Наименование рекламной игры** – «Выиграй смартфон с платежной карточкой Visa БПС-Сбербанка».

**3. Территория проведения**

Рекламная игра «Выиграй смартфон с платежной карточкой Visa БПС-Сбербанка» проводится на территории Республики Беларусь.

**4. Срок начала рекламной игры** – 1 июля 2016 года, срок окончания – 23 декабря 2016 года.

**5. Состав комиссии по проведению рекламной игры:**

1. Козлов Вадим Анатольевич, директор Департамента электронного бизнеса ОАО «БПС-Сбербанк», председатель комиссии;

2. Шульган Юлия Алексеевна, специалист I категории отдела платежных систем Департамента электронного бизнеса ОАО «БПС-Сбербанк»;

3. Роткович Сергей Леонидович, ведущий специалист управления маркетинга и рекламы ОАО «БПС-Сбербанк»;

4. Шамаль Дмитрий Эдуардович, директор ООО «Смарт Нова»;

5. Мазура Сергей Михайлович, специалист отдела медиапланирования ООО «Смарт Нова».

**6. Цель Игры.**

Рекламная игра «Выиграй смартфон с платежной карточкой Visa БПС-Сбербанка» проводится с целью стимулирования использования карт Visa **ОАО «БПС-Сбербанк» (далее – БПС-Сбербанк)** для безналичных расчетов в сети Интернет (в том числе в системе Сбербанк Онлайн) на территории Республики Беларусь, а также в других странах.

**7. Условия участия и порядок отбора участников Рекламной игры.**

Участниками Рекламной игры «Выиграй смартфон с платежной карточкой Visa БПС-Сбербанка» являются:

- физические лица – граждане Республики Беларусь, достигшие 18 лет, являющиеся держателями банковских платежных карточек Visa БПС-Сбербанка, которые в период с 0-00 часов 01.07.2016 года по 24-00 30.09.2016 года совершили с использованием банковской платежной карточки на территории Республики Беларусь онлайн-платежи в сети Интернет (в том числе в системе Сбербанк Онлайн) на сумму не менее 10 белорусских рублей образца 2009 года или 100 000 белорусских рублей образца 2000 года либо белорусскими рублями, либо валютой в сумме, эквивалентной 10 белорусским рублям образца 2009 года или 100 000 белорусских рублей (образца 2000 года) по курсу НБ РБ на дату совершения операции;

Не является основанием для участия в Игре:

- платежи P2P на свои карты;
- пополнение депозитов, в том числе онлайн-депозитов;
- погашение кредитов;
- оплата услуг БПС-Сбербанка.

Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором и Заинтересованным лицом, супруг (супруга) такого лица, близкие родственники и лица, находящиеся с ними в отношениях свойства, а также члены Комиссии.

Организатор не несет ответственности за несвоевременное или некорректное представление информации о транзакциях другими участниками системы безналичных расчетов.

В случае если одно физическое лицо совершило несколько безналичных операций, соответствующих настоящим Правилам, физическое лицо фиксируется в качестве участника Игры соответствующее количество раз. Из безналичных операций, соответствующих Правилам, формируется список участников игры (далее – Список участников).

**8. Состав и размер призового фонда.**

Призовой фонд Игры сформирован за счет имущества и денежных средств заинтересованного лица – открытого акционерного общества «БПС-Сбербанк»

Общий размер Призового фонда составляет 13 851,42 белорусских рубля образца 2009 года или 138 514 197 белорусских рублей образца 2000 года.

| № | Наименование | Название приза далее в Правилах | Кол-во, шт. | Стоимость с НДС за ед., бел. рублей образца 2009 года/ бел. рублей образца 2000 года | Общая стоимость, бел. рублей образца 2009 года/ бел. рублей образца 2000 года |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Телефон iPhone 6s 64 Gb | Приз | 6 | 2 008,57/ 20 085 699,5 | 12 051,42/ 120 514 197 |
| | Денежные средства в размере 300 бел. рублей (образца 2009 года)/ 3 000 000 бел. рублей (образца 2000 года ) | | | 300/ 3 000 000 | 1 800/ 18 000 000 |
| | **ИТОГО** | | | | 13 851,42/ 138 514 197 |

**9. Место, дата, время и порядок розыгрыша призового фонда, порядок определения выигравших участников рекламной игры.**

Розыгрыши Призового фонда проводятся открыто в присутствии Комиссии в здании ОАО «БПС-Сбербанк» по адресу: 220005, г. Минск, б-р имени Мулявина, д. 6.

К моменту каждого розыгрыша данные об участниках Игры формируются в Список Участников. Каждому участнику Игры в Списке Участников последовательно присваивается индивидуальный порядковый номер по дате и времени транзакции. Все порядковые номера имеют одинаковую разрядность.

В первом розыгрыше 30 августа 2016 года в 15-00 принимает участие Список Участников, сформированный с 0-00 1 июля 2016 года до 24-00 15 августа 2016 года. Разыгрываются 3 Приза.

Во втором розыгрыше 18 октября 2016 года в 15-00 принимает участие Список Участников, сформированный с 0-00 16 августа 2016 года до 24-00 30 сентября 2016 года. Разыгрываются 3 Приза.

Для проведения розыгрыша используется специальный барабан с количеством ячеек и набором шаров, которые соответствуют максимальному разряду номеров из Списка Участников.

Выигрышный номер определяется путем его формирования слева направо из номеров шаров, случайно поочередно извлекаемых из ячеек барабана членом комиссии. Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера в левую ячейку барабана помещаются шары с номерами от 0 по первую слева цифру последнего порядкового номера участника игры в списке. В последующие ячейки вкладываются по 10 шаров с номерами от 0 до 9. Из всех ячеек барабана поочередно извлекается по одному шару, которые последовательно формируют выигрышный номер. Производится проверка сформированного номера на наличие полученной комбинации цифр в Списке Участников. При наличии совпадения выпавший номер считается выигравшим. В противном случае извлеченные шары возвращаются в свои ячейки барабана и производится повторная выемка с составлением номера. Таким образом, определяется по три выигрышных и три резервных номера в каждом розыгрыше.

После определения выигрышных номеров производится проверка на соответствие участников, которым принадлежат выигрышные номера, всем требованиям настоящих правил. Если участник полностью соответствует требованиям правил, он объявляется победителем рекламной игры. Если обнаруживается участник, не удовлетворяющий требованиям настоящих правил, вместо его номера выигрышным объявляется резервный номер, который также проходит проверку на соответствие участника требованиям настоящих правил. Резервные номера объявляются выигрышными в порядке их извлечения из барабана.

**10. Место, порядок и сроки выдачи призов и уведомления победителей.**

Победитель уведомляется о выигрыше по почте и по телефону не позднее 10 (десяти) рабочих дней с момента розыгрыша.

После получения уведомления о выигрыше победитель должен до 28 сентября 2016 г. (для второго розыгрыша – до 16 ноября 2016 г.) предоставить письменное подтверждение согласия на получение приза (далее – письменное подтверждение). В случае если Победитель не дал письменного подтверждения согласия на получение приза, право на получение приза переходит к обладателю первого резервного номера из резервного списка. В этом случае участник рекламной игры из резервного списка уведомляется о выигрыше по почте и по телефону не позднее 7 октября 2016 г. (для второго розыгрыша – до 2 декабря 2016 г.). В остальном процедура аналогична первоначальной процедуре определения победителя.

В случае отказа победителя от получения приза (в том числе из резервного списка), неполучения приза в установленном правилами порядке и срока либо невыполнения условий его получения приз остается у Организатора.

Торжественное вручение призов будет осуществляться в здании БПС-Сбербанка по адресу: 220005, г. Минск, б-р имени Мулявина, д.6, 11 октября 2016 года в 17-00 и 6 декабря 2016 года в 17-00.

Призы вручаются при предъявлении победителем паспорта.

Если победитель не сможет присутствовать на торжественном вручении призов, он может получить приз в офисе организатора в любой рабочий день до 23 декабря 2016 года включительно с 12 до 17 часов по адресу: Минск, ул. Сторожевская, 8, к. 11, предварительно согласовав дату и время прибытия с представителем Организатора по телефону +375 (17) 288-60-30. Денежная компенсация стоимости призов не производится.

**11. Порядок информирования об условиях и результатах Игры.**

Правила рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звезда» до начала рекламной игры, а также на сайте www.bps-sberbank.by. Результаты розыгрыша призов будут опубликованы в газете «Звезда» не позднее 20 декабря 2016 года, а также на сайте www.bps-sberbank.by.

**12. Общие условия рекламной игры.**

Налогообложение призов производится в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Рекламной игры, а также результаты проведения Рекламной игры будут считаться окончательными, будут распространяться на всех участников и не могут быть оспорены.

Участники Рекламной игры, претендующие на получение приза, обязуются заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые Организатором Рекламной игры для получения призов.

Все возможные претензии участников в отношении организации и условий передачи призов должны быть адресованы непосредственно Организатору Рекламной игры по адресу: 220002, г. Минск, ул. Сторожевская, д. 8, оф. 1.

Организатор не вступает в споры между участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза. Участник вправе распорядиться полученным призом по своему усмотрению.

Организатор не несет ответственности за качество работы почтовых служб, в частности за недоставку либо несвоевременную доставку почтовой корреспонденции.

Участник самостоятельно несет ответственность за соблюдение им действующего законодательства в сфере налогообложения.

Участие в рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие участников с настоящими правилами рекламной игры.

Телефон информационной линии 8 (017) 290-24-76

Время работы информационной линии: с 12.00 до 17.00.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 2789, выданное Министерством торговли Республики Беларусь 23 июня 2016 г.

■ Нефармат



# Паглядзець з іншага боку

**Не так даўно падчас камандзіроўкі заходжу ў фае Камянецкага райвыканкама, а насустрач мне міліцыянер з прыязным выглядам і шырокай усмешкай: «Я вас слухаю!» Ад нечаканасці прыпыняюся і гэтак жа весела адказваю: «А я нічога не мела вам сказаць». Потым ідзе звычайная для цяперашніх рэалій праверка дакументаў і запіс маіх даных у журнале наведвальнікаў. Што ж, міліцыянер выконвае сваю работу, хоць і непрывычную і крыху дзіўную для васьмітысячнага райцэнтра. У савецкія часы, калі я прыйшла на работу ў пружанскую раённую газету, у тамтэйшым райкаме партыі сядзела толькі бабулька-вахцёрка. Яна магла падказаць, на якім паверсе размяшчаецца патрэбны кабінет, у тым выпадку, калі да яе звярталіся.**

Расказала пра гэта дома вечарам, а сын, адараваўшыся ад камп'ютара, весела пракаментаваў: «А што табе не падабаецца? Ведаеш, як спатрэбіўся б той запіс, калі б, скажам, некаму прыйшло ў галаву абвінавачваць цябе ў злачынстве! А ў цябе жалезнае алібі, ты ў гэты час знаходзілася ў маленькім гарадзе, аб чым сведчыць запіс службовай асобы, ён там, мабыць, і час накрэсліў, а не толькі дату. Так што паглядзі на гэта з іншага боку!» І мы ўжо ўсе разам смяёмся найбольш з палёту фантазіі аматара камп'ютарных дэтэктываў.

І сапраўды, паглядзець часам з іншага боку карысна бывае на любую з'яву альбо рэч. А інакш невядома, ці ўдасца ацаніць станоўчыя перамены, якія здараюцца з той самай з'явай, рэччу альбо чалавекам. Ну вось, напрыклад, ёсць у нас у Брэсце знакавая для горада ўстанова. Яе не абыходзяць шматлікія госці, як турысты, так і афіцыйныя дэлегацыі, любяць журналісты. Раней патэлефанаваць супрацоўніку, дамовіцца аб сустрэчы альбо атрымаць вусную інфармацыю па тэлефоне было магчыма толькі адным спосабам. Найперш належала дазваніцца кіраўніку і спытаць дазволу на стасункі з намеснікам альбо начальнікам аддзела, накшталт таго: «Таварыш генерал, дазвольце звярнуцца да маёра!» І ўжо потым, атрымаўшы «дабро» выпадала набіраць нумар чалавека, які ў сваю чаргу атрымаў санкцыю ад начальніка. Колькі на гэты конт я чула каментарыяў ад калег, вам не перадаць, у тым ліку тых, якія можна падвесці пад радок Барыса Пастарнака «Я б и непечатным словом не побрезговал». Каментары сыпаліся, а караван, як той казаў, ішоў. Але мінула колькі часу, і ўсё змянілася. Цяпер там новы кіраўнік. Нядаўна я рыхтавала матэрыял да памятнай даты, стэлефанавалася з патрэбным мне супрацоўнікам, потым сустрэлася і пагаварыла. Ніхто нас пры гэтым не строіў.

Так што пройдзе мода і на залішнюю пільнасць у асобных выканкамах. Тым больш што людзі яе тлумачаць неадназначна. А сёння на гэта варта паглядзець як на яшчэ адзін эксперымент.

Эксперыментаў тых у нашым жыцці апошнім часам не бракуе. Праўда, адна справа, калі іх праводзяць у маштабе асобнай галіны, прадпрыемства, горада, вобласці. І зусім іншае, калі людзі дазваляюць сабе нешта накшталт эксперымента над сабой і сваёй сям'ёй. Падумалася пра гэта падчас апошняй «прамой лініі» з кіраўніком вобласці. Малады і здаровы жыхар вёскі пытаўся, як яму жыць далей. Мужчына працуе ў будаўнічай брыгадзе, маюць з жонкай траіх дзетак, жывуць у аднапакаёвай кватэры маласямейнага інтэрната. Галава сям'і скардзіўся, што не выдзяляюць цяпер ільготных крэдытаў, крэдыт жа камерцыйны на будаўніцтва дома па зразумелых прычынах сям'я цяпер не пацягне. «Дык што нам, да сканчэння веку цясніцца ў адным пакоі на пяць чалавек?» — пытаўся ў губернатара шматдзетны бацька. Яму патлумачылі, што ёсць два варыянты: альбо будаваць жыллё самастойна, альбо чакаць лепшых часоў, калі будзе адноўлена льготнае крэдытаванне. Вядома ж, заяўнік застаўся такім тлумачэннем не задаволены.

У вёсцы, дзе размешчаны мой дачны дом, па суседстве таксама пасяліўся шматдзетны бацька, па ўзросце значна маладзейшы за аўтара звароту на прамую лінію. Рыгор стаў шматдзетным менш як за адзін год. Ён ажаніўся з жанчынай, якая мае дваіх дзяцей, і ў іх нарадзілася трэцяе. Маладая сям'я купіла танны, зарослы бур'янам, дамок, і Рыгор прыступіў да рамонту. Бацька сямейства мае намер зрабіць капітальны рамонт, правесці ваду і каналізацыю, забяспечыць годныя ўмовы пражывання жонцы і дзецям. Працуе Рыгор механізатарам, матэрыяльна яму дапамагае толькі бабуля. Ён уважыў свае магчымасці, паглядзеў на сітуацыю рэальна і выбраў найбольш прымальны для сябе варыянт. Калі ж сядзець на адным месцы і глядзець толькі ў кірунку магчымага атрымання крэдытаў, то можна і да дэпрэсіі дасядзецца.

...У панядзелак на досвітку прайшоў праліўны дождж. Раніцай на прыпынку маладая маці тузала за руку і сварылася на малога гадоў чатырох, які радасна праляцеў па вялікай лужыне, пры гэтым зззаду заляпаў шорты, нават на майку вады папала. «Ты паглядзі на мяне спераду, хныкаў малы, я ж тут зусім сухі, а там высахне». Сапраўды, часам варта паглядзець на з'яву з розных бакоў, каб першыя непрыемныя ўражанні адступілі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by* ■

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.41 | 21.45 | 17.04 |
| Віцебск — | 4.23 | 21.43 | 17.20 |
| Магілёў — | 4.31 | 21.35 | 17.04 |
| Гомель — | 4.38 | 21.22 | 16.44 |
| Гродна — | 4.58 | 21.58 | 17.00 |
| Брэст — | 5.09 | 21.49 | 16.40 |

### Месяц

***Апошняя квадра 27.06–03.07.***

***Месяц у сузор'і Цяльца.***

### Імяніны

***Пр.*** *Мануіла, Савелія.*

***К.*** *Люцыны, Эміліі, Арнольда, Кірылы, Раймунда, Уладзіслава.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 30 ЧЭРВЕНЯ

**1908** год. Над тэрыторыяй Цэнтральнай Сібіры ў міжрэччы Ніжняй Тунгускі і Лены праляцеў гіганцкі шар-балід. Палёт яго суправаджаўся гукавымі і светлавымі эфектамі і скончыўся магутным выбухам. Тунгускі метэарыт выклікаў выбуховую хвалю, якой у радыусе каля 40 км быў паваленыя лес, знішчаны звяры, пацярпелі людзі. З-за магутнай светлавой успышкі Тунгускага выбуху і патоку распаленых газаў узнік лясны пажар, які давяршыў спустошэнне раёна. Тунгускі метэарыт да гэтага часу застаецца адной з самых загадкавых з'яў, навукоўцы і сёння спрачаюцца аб яго паходжанні. Даследаванні пачаліся толькі ў 1927 годзе, калі многія матэрыяльныя сведчанні падзення нябеснага цела былі страчаныя.



**95** гадоў спаўняецца эканамічным органам Беларусі. 30 чэрвеня 1921 года пры Эканамічным савеце СНК рэспублікі была створана Планавая камісія (Дзяржплан). З гэтай даты і пачалі адлік сваёй гісторыі планава-эканамічныя органы краіны.

**75** гадоў таму (1941) рашэннем Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, ЦК ВКП (б) і СНК СССР утвораны Дзяржаўны камітэт абароны (ДКА) пад старшынствам І. Сталіна — надзвычайны дзяржаўны орган у СССР, у якім у гады Вялікай Айчыннай вайны была сканцэнтравана ўся паўната ўлады. Для інфармавання насельніцтва аб падзеях, якія адбываюцца на фронце і ў тыле, было створана спецыяльнае Інфармбюро.

Было сказана

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, пісьменнік:**

*Ўсе шляхі прыводзяць не да Рыма,*
*А да родных вербаў і бяроз.*

## СХАВАЛА ГРОШЫ І ЗАБЫЛАСЯ ДЗЕ

### Міліцыя дапамагла адшукаць «зніклыя» 5 тысяч долараў

**У аператыўна-дзяжурную службу Кастрычніцкага РУУС сталіцы паступіла паведамленне ад 60-гадовай жанчыны-інваліда пра тое, што ў яе з кватэры знікла 5 тысяч долараў.**

На месца здарэння неадкладна выбыў намеснік начальніка аддзела крымінальнага вышуку раённага ўпраўлення маёр міліцыі Канстанцін Блажэй. Пры выяўленні абставін здарэння і аглядзе кватэры ў калідоры ў шафе афіцэр адшукаў зніклыя грошы. Высветлілася, што жанчына праз узрост і захворванне забыла пра тое, што перахавала буйную суму валюты.

Мінчанка падзякавала супрацоўніку міліцыі за дапамогу ў пошуку грошай, паважлівае стаўленне да яе і за разуменне да сітуацыі, якая склалася.

Міліцыя нагадвае, што варта ўважліва ставіцца да сваіх грашовых зберажэнняў. Асабліва гэта актуальна цяпер у перыяд правядзення дэнамінацыі.

## КРАДУЦЬ НАВАТ КАСТРУЛІ

### Найлепшы спосаб засцерагчыся — устанавіць ахоўную сігналізацыю

**Праблема папярэджання і раскрыцця крадзяжоў — адна з самых вострых у дзейнасці органаў унутраных спраў. Асабліва ўлетку, калі кватэры многіх гараджан пустуюць.**

— Аператыўныя зводкі паказваюць, што прадметам замаху з'яўляецца ўсё што заўгодна: ад тысячы рублёў, каструлі, прадуктаў харчавання, адзення да дарагой камп'ютарнай тэхнікі, ювелірных вырабаў і буйных сум грошай, — расказаў начальнік Савецкага (г. Мінска) аддзела Дэпартамента аховы падпалкоўнік міліцыі Андрэй Азарэвіч. — Для пранікнення ў жыллё грамадзян зламыснікі выкарыстоўваюць сем асноўных спосабаў: узлом дзвярэй, уздзеянне на акно, праз фортку, праз балкон, шляхам падбору ключоў, пракручваннем сарцавіны замка і праз свабодны доступ. Прычым зладзюжкі пастаянна ўдасканальваюць свае навыкі па пранікненні ў жыллё, выкарыстоўваюць сучасную тэхніку і сувязь, спецыяльныя інструменты. Вядома, што супернадзейных замкоў не існуе, а спосабаў трапіць у чужую кватэру ці дом, як было сказана, дастаткова шмат. Таму самы лепшы спосаб засцерагчыся ад небяспекі — устанавіць ахоўную сігналізацыю. Пад ахову прымаюцца не толькі жылыя памяшканні з асабістай маёмасцю грамадзян, але і іншыя будынкі з маёмасцю: гараж, падвал, хлеў, кантэйнер для захавання індывідуальнымі прадпрымальнікамі тавараў на рынках.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## УСМІХНЕМСЯ

**Як я бачу футбол. Па траўцы скачуць 22 мільянеры, спрабуюць злавіць мячык, крычаць адзін на аднаго з прычыны і без, плачуць, калі ім выпадкова далі нагой па назе.**

Дзеці — кветкі жыцця :)

Вовачка прыносіць з садка незнаёмую цацку-машынку. Мама пытаецца:

— Адкуль у цябе машынка?

— А... Гэта мы з Сашам памяняліся.

— Саша даў табе машынку, а ты што яму даў?

Падумаўшы, адказвае:

— Па карку...

**Аўдыякніжка «Вайна і мір» на іспанскай мове.**

**Працягласць 25 мін.**

**Тэкст чытаюць лацінаамерыканскія футбольныя каментатары.**




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 2467.

Нумар падпісаны ў 19.30 29 чэрвеня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12